WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

27 СТУДЗЕНЯ 2011 г.
ЧАЦВЕР
№ 16
(26880)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

«Прамая лінія»

УСЁ ПРА ТРАДЫЦЫІ І АБРАДЫ, НАРОДНЫЯ ПРЫКМЕТЫ І ПАВЕР'І!

Калі можна хрысціць дзіця? Хто такія «пасаджаныя бацькі» і ў якім выпадку іх трэба запрашаць на вяселле? Каго неабходна, а каго непажадана саджаць за памінальны стол? Што рабіць з заручальным пярсцёнкам пасля таго, як шлюб распаўся? Чаму не адзначаецца 40-ы дзень нараджэння?

Гэтыя і іншыя пытанні вы можаце задаць нашым гасцям, аўтарам кнігі «Залатыя правілы народнай культуры», **кандыдату філалагічных навук, дактаранту Белдзяржуніверсітэта Івану Іванавічу (Янку) Круку і этнакультуролагу Аксане Веньямінаўне Катовіч** падчас «прамой лініі», якая адбудзецца **СЁННЯ, 27 студзеня, з 15.00 да 16.00 па нумарах: (8 017) 292 38 92 і 292 38 21.**

Тэлефануйце — і атрымаеце адказы на любыя пытанні, якія датычацца падрыхтоўкі і правядзення найважнейшых жыццёвых абрадаў: хрышчэння, вянчання, вяселля, уваходзін, пахавання і інш.

Пётр МІКЛАШЭВІЧ:

«ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ ПРАЙШЛІ Ў АДПАВЕДНАСЦІ З ПРЫНЦЫПАМІ І НОРМАМІ КАНСТЫТУЦЫІ»

У Еўрасаюза няма прававых падстаў для ўвядзення санкцый адносна Беларусі. Аб гэтым паведаміў старшыня Канстытуцыйнага суда Беларусі Пётр Міклашэвіч на прэс-канферэнцыі.

Старшыня Канстытуцыйнага суда нагадаў, што беларускі парламент напярэдадні прыняў заяву, якой даецца ацэнка рэзалюцыі Еўрапарламента адносна ўвядзення санкцый супраць Беларусі. У прыватнасці адзначаецца, што гэта рэзалюцыя была прынята без дастатковых падстаў.

«Як грамадзянін я спадзяюся, што разважлівасць возьме верх і ніякіх эканамічных санкцый адносна Беларусі не будзе прынята», — сказаў ён.

«Няма прававых падстаў для ўвядзення санкцый супраць Беларусі. Выбары былі праведзены ў адпаведнасці з Канстытуцыяй, нацыянальным заканадаўствам, і Прэзідэнт, выбраны на свабодных і дэмакратычных выбарах, з'яўляецца легітымным. А тым падзеям, якія адбыліся непасрэдна пасля выбараў, будзе давацца прававая ацэнка», — дадаў Пётр Міклашэвіч.

Як адзначыў старшыня КС, у Беларусі ў 2010 годзе ў адпаведнасці з Канстытуцыяй прайшоў шэраг дзяржаўна-палітычных мерапрыемстваў. Найбольш важныя з іх — выбары Прэзідэнта Беларусі, IV Усебеларускі народны сход, які з'яўляецца канстытуцыйнай формай непасрэднага ўдзелу грамадзян у кіраванні справамі грамадства і дзяржавы, выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў.

Дазвольны парадак правядзення мітынгаў і шэсцяў не супярэчыць Канстытуцыі Беларусі, паведаміў старшыня Канстытуцыйнага суда.

Пётр Міклашэвіч працытаваў некаторыя палажэнні Канстытуцыі Беларусі, дзе, у прыватнасці, гаворыцца, што кожны, хто знаходзіцца на тэрыторыі рэспублікі, абавязаны выконваць законы і паважаць нацыянальныя традыцыі, а таксама годнасць, правы і свабоды, законныя інтарэсы іншых асоб. Такім чынам, у Беларусі на канстытуцыйным узроўні прадастаўлена права грамадскім аб'яднанням і грамадзянам выказваць публічна сваё меркаванне. «Але што датычыцца масавых мерапрыемстваў — гэта звязана з бяспекай удзельнікаў гэтых масавых акцый і бяспекай іншых грамадзян. Таму ў абсалютнай большасці дзяржаў на заканадаўчым узроўні ўрэгуляваны парадак правядзення такіх масавых мерапрыемстваў. У Беларусі таксама ёсць спецыяльныя заканадаўчыя акты, якія рэгламентуюць арганізацыю і правядзенне такіх масавых мерапрыемстваў», — сказаў Пётр Міклашэвіч. Старшыня Канстытуцыйнага суда таксама нагадаў, што ў адпаведнасці з 23-м артыкулам Канстытуцыі Беларусі абмежаванні правоў і свабод асобы дапускаюцца толькі ў выпадках, прадугледжаных законам у інтарэсах нацыянальнай бяспекі, грамадскага парадку, абароны маральнасці, здароўя насельніцтва, правоў і свабод іншых асоб.

Канстытуцыйны суд Беларусі выступае за стварэнне ў рэспубліцы інстытута омбудсмена або Упаўнаважанага па правах чалавека.

«Я як кіраўнік Канстытуцыйнага суда і суддзі суда вывучаем вопыт работы такога інстытута. І мы за тое, каб у перспектыве такі інстытут быў уведзены ў рэспубліцы», — сказаў Пётр Міклашэвіч.

Старшыня КС растлумачыў, што інстытут омбудсмена з'яўляецца сродкам ускоснага доступу грамадзян да канстытуцыйнага правасуддзя. «У шэрагу краін праз упаўнаважанага па правах чалавека грамадзяне маюць доступ да канстытуцыйнага правасуддзя. Яны звяртаюцца да гэтай асобы, і затым калі ёсць падставы, яна ўносіць прапановы ў Канстытуцыйны суд», — адзначыў Пётр Міклашэвіч. Што датычыцца магчымых тэрмінаў стварэння такога інстытута ў Беларусі, ён растлумачыў, што павінен быць распрацаваны адпаведны законапраект, які ў далейшым павінен прыняць парламент.

Пётр Міклашэвіч нагадаў, што ў Беларусі не прадугледжана права грамадзян на індывідуальную канстытуцыйную скаргу, гэта значыць грамадзянін не можа непасрэдна звярнуцца ў Канстытуцыйны суд і ставіць пытанне аб праверцы канстытуцыйнасці таго ці іншага нарматыўна-прававога акта. Пры гэтым такі парадак характэрны не толькі для Беларусі, але і для многіх дзяржаў Еўропы, у тым ліку Францыі.

БЕЛТА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«ДОБРА БЯРЭЦЦА!»

Сям'я Яфімавых з пасёлка Азярэчча Ганцавіцкага раёна праводзіць свой выхадны дзень на вадасховішчы Лактышы. Зімовая падлёдная рыбалка падабаецца не толькі дзесяцігадоваму сыну Івану, але нават трохгадовай дачцэ Кацярыне.

Анатоль КУЛЯШОЎ:

«МЫ НЕ МАГЛІ ДАПУСЦІЦЬ, КАБ ПОЛЫМЯ, ЯКОЕ РАСПАЛІЛІ КАНДЫДАТЫ Ў ПРЭЗІДЭНТЫ, ПАРУШЫЛА СТАБІЛЬНАСЦЬ У БЕЛАРУСІ»

У Беларусі пасля выбуху ў маскоўскім аэрапорце «Дамадзедава» ўзмоцнена ахова грамадскага парадку ў месцах масавага збірання людзей. «Мы прымаем меры для таго, каб забяспечыць ахову з дапамогай розных тэхнічных сродкаў, навейшых распрацовак, якія раней не выкарыстоўваліся», — адзначыў падчас сустрэчы з журналістамі міністр унутраных спраў Рэспублікі Беларусь Анатоль КУЛЯШОЎ.

Падводзячы вынікі аператыўна-службовай дзейнасці органаў унутраных спраў у мінулым годзе, міністр таксама адзначыў, што ўзровень злачыннасці ў краіне знізіўся за апошнія пяць гадоў прыкладна на чвэрць. Зменшылася ў тым ліку і колькасць цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў — забойстваў, цяжкіх цялесных пашкоджанняў, згвалтаванняў, рабаўніцтваў, разбойных нападаў, хуліганстваў і нават такіх распаўсюджаных злачынстваў, як крадзяжы. Раскрываецца пры гэтым дзесьці 50 працэнтаў злачынстваў.

Разам з тым у два разы ў апошнія тры гады выраслa колькасць злачынстваў у галіне высокіх тэхналогій. Добра падрыхтаваныя ў пытаннях сучасных камп'ютарных тэхналогій нашы грамадзяне ўчыняюць вышэйназваныя злачынствы нават за межамі краіны.

Няпростай застаецца і сітуацыя ў галіне незаконнага абароту наркотыкаў. Органамі ўнутраных спраў выяўлена звыш 4,5 тыс нарказлачынстваў, 49 каналаў іх паставак з-за мяжы, а таксама транзітных перавозак, 4 лабараторыі па вырабе сінтэтычных наркасродкаў і псіхатропных рэчываў. Усяго міліцыя канфіскавала каля 400 кг наркасродкаў і псіхатропаў. Толькі летась па ініцыятыве МУС быў забаронены свабодны абарот 58 новых відаў наркотыкаў. Самая буйная партыя наркотыку — 27,7 кг гераіну была затрымана ў Дуброўенскім раёне Віцебскай вобласці, у двух жыхароў Гомеля.

У галіне процідзеяння гандлю людзьмі выяўлена 465 злачынстваў, перакрыта 59 каналаў вывазу людзей у такія краіны, як Расія, Украіна, Польшча, Грэцыя, Туніс, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, Турцыя, Егіпет.

СТАР. 2

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

СЯРЭДНЯЯ ЗАРПЛАТА Ў МІНСКУ Ў СНЕЖНІ ПЕРАСЯГНУЛА 2-МІЛЬЁННЫ РУБЕЖ

Як паведамілі БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце, намінальная налічаная сярэдняя зарплата работнікаў у сталіцы была Br2096,2 тыс.

У Мінскай вобласці гэты паказчык быў Br1520,7 тыс. — упершыню ў гэтым рэгіёне перавышаны паўтарамільённы ўзровень. Снежаньская сярэдняя зарплата ў Гомельскай вобласці склала Br1494,5 тыс., у Гродзенскай — Br1468,5 тыс., у Віцебскай — Br1458,9 тыс., у Магілёўскай — Br1448,9 тыс. На ніжняй пазіцыі зарплатнага рэгіянальнага рэйтынгу размяшчалася Брэсцкая вобласць (Br1411,7 тыс.).

Рэальная заработная плата за 2010 год узрасла ва ўсіх рэгіёнах Беларусі, а найбольш высокія тэмпы росту прадэманстравала Магілёўская вобласць (117,3 працэнта). Тэмп росту рэальнай зарплаты ў мінулым годзе да ўзроўню 2009-га ў Мінскай вобласці склаў 116,9 працэнта, у Брэсцкай — 116,1 працэнта. У Гомельскай вобласці гэты паказчык быў роўны 115,2 працэнта, у Віцебскай — 115 працэнтаў, у Гродзенскай вобласці — 114,6 працэнта, а ў Мінску — 112,4 працэнта.

КАМУ ІСЦІ Ў ПАДАТКОВУЮ?

Са студзеня ў краіне пачалася кампанія па дэклараванні даходаў, атрыманых фізічнымі асобамі за мінулы год.

Сёлета да першага дня вясны дэкларацыі ў падатковыя інспекцыі павінны прадаставіць тыя асобы, якія ў 2010 годзе атрымалі даход ад рэалізацыі больш чым аднаго аб'екта нерухомай маёмасці на працягу 5 гадоў, або больш за адзін аўтамабіль на працягу года. Запаўняць падатковую дэкларацыю неабходна і тым грамадзянам, якія атрымлівалі на працягу 2010 года такія даходы, утрыманне падаходнага падатку з якіх не ажыццяўляецца падатковымі агентамі. Галоўным чынам, гэта даходы, атрыманыя ад іншых фізічных асоб. Абавязкова дэкларацыю падаюць у інспекцыі тыя фізічныя асобы — рэзідэнты РБ, хто атрымаў даход за мяжой ці з-за мяжы нашай краіны.

Дэкларацыі падаюцца ў падатковы орган па месцы прапіскі (рэгістрацыі) не пазней чым 1 сакавіка. Работнікі, якія не маюць месца асноўнай працы, могуць падаць дэкларацыю ў інспекцыі для атрымання сацыяльных і маёмасных вылікаў па даходах за мінулы год. У гэтым выпадку падатковую дэкларацыю аб сукупным гадавым даходзе можна падаваць і пасля 1 сакавіка.

Сяргей КУРКАЧ.

МАЛАКО ПАДАРАЖЭЕ...

У студзені і лютым будуць павышаны гранічныя адпускныя цэны на гавядзіну патушную да 3 працэнтаў у месяц, свініну патушную, малако, кефір, смятану і тварог — да 2 працэнтаў у месяц.

Паводле звестак прэс-службы Мінэканомікі, адпаведная пастанова прынята міністэрствам паводле прапановы Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання. Як адзначаюць у Мінэканомікі, апошняе рашэнне прынята з мэтай паэтапнай кампенсацыі падаражання малочнай і мясной сыравіны ў сувязі з павышэннем закупачных цэн на малако, буйную рагатую жывёлу і свіней, а таксама збліжэння цэн на малочныя прадукты і мяса з цэнамі ў суседніх рэгіёнах.

Ігар ГРЫШЫН.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.01.2011 г. (для б/н разлікаў)			
▼ 1 долар ЗША	3 011,00	1 чэшская крона	170,25
▼ 1 еўра	4 121,16	1 польскі злоты	1 065,16
1 латвійскі лат	5 864,82	▲ 1 расійскі рубель	101,12
1 літоўскі літ	1 194,96	1 украінская грыўня	379,31

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрбанк РФ
USD 29,7768
10 UAH 37,5141
1000 BYR 9,8828
EUR 40,7198

КУПЛЯЙЦЕ БЕЛАРУСКАЕ

Скідзельскі цукровы камбінат — ПЕРШЫ НА ПРАЦЯГУ 60 ГАДОЎ!

Апаратчыкі варкі утфелю 1-га і 2-га прадукту Святлана РАМАНОВІЧ і Наталля ДАЛГОВА.

У 2010 годзе каля 23 тыс. тон сушаных жамерын было адпраўлена на экспарт.

Першы беларускі цукар з'явіўся недалёка ад Гародні, у невялічкім гарадку Скідаль, 60 гадоў таму. Менавіта тут 2 сакавіка 1951 года быў запушчаны Першы беларускі цукровы завод, а 15 сакавіка 1951 года Дзяржаўная камісія, пасля двухтыднёвай праверкі, прыняла яго ў эксплуатацыю. Сёння ж гэтае прадпрыемства называецца ААТ «Скідзельскі цукровы камбінат».

Час для будаўніцтва быў выбраны складаны, пасляваенны. Распараджэннем намесніка старшыні Савета Міністраў СССР А.І. Мікаяна № 1063 ад 10 лютага 1946 года для будаўніцтва цукровага завода ў Скідалі было вылучана абсталяванне асаблівых паставак. Аднак усё роўна не хапала матэрыялаў, кваліфікаваных спецыялістаў, транспарту, жылля. Для будаўніцтва некаторых аб'ектаў выкарыстоўвалі цэглу ад разбураных фашыстамі будынкаў Скідаля, пашкоджаныя бомбамі металаканструкцыі. Затое тэхналагічная, цеплавая і водныя схемы, уключаючы і ачыстку сцёкаў, кампаноўка тэхналагічнага і энергетычнага абсталявання былі запраектаваныя і выкананыя на ўзроўні перадавых дасягненняў навукі і тэхнікі таго часу.

Першая мільённая тона белага цукру на Скідзельскім цукровым камбінаце была атрымана ў 1983 годзе — на гэта спатрэбіўся 31 год. Для атрымання другой мільённай тоны спатрэбілася ўжо значна менш часу — толькі 18 гадоў, бо з'явілася яна ў 2000 годзе.

Усяго ж роўненька 60 гадоў прайшло з таго часу, калі першы цукар выйшаў са сцен Скідзельскага цукровага камбіната. За гэты час, вядома, завод зрабіў вялікія крокі наперад: павысіліся магутнасці, старыя тэхналогіі саступілі месца сучасным, ручная праца даўно заменена аўтаматыкай. Дык з чым жа падышоў завод да свайго юбілею?

Старшы сушыльшчык цукру Алена МАЛАШЭВІЧ.

Начальнік бюро стандартызацыі і якасці Святлана САНТ.

— Дзесяць гадоў таму мы перапрацоўвалі ў 2,5 раза меней буракоў, чым цяпер: калі раней максімальная магутнасць была 3 тысячы тон за суткі, то сёння — 7,5 тысячы тон па выніках сезона 2010 года. Да таго ж у нас пачаў працаваць цэх па перапрацоўцы сухіх грануляваных жамерын, магутнасць якога намінальна складае 300 тон за суткі, але мы пакуль яе паступова нарошчваем і сёлета мелі паказчык у 260 тон. Што тычыцца непасрэдна гатовага прадукту (цукру), то мы за апошні час таксама павысілі яго вытворчасць працэнтаў на 20-30: калісьці мы выраблялі да 100 тысяч тон за сезон, а цяпер — ад 110 да 120 тысяч тон цукру з буракоў за 4 месяцы, — расказвае Андрэй Аленскі.

Абсталяванне на Скідзельскім цукровым камбінаце замяняецца на новае і сучаснае паэтапна, а там, дзе трэба павялічыць магутнасць — мадэрнізуецца адзін з элементаў ці дадаецца некалькі складнікаў. За апошнія некалькі гадоў тут замянілі помпавы парк, трубаправоды, схему электразабеспячэння, усталявалі новы мыйны комплекс магутнасцю да 8 тысяч тон буракоў за суткі, мадэрнізавалі дыфузійнае аддзяленне (была раней адна лінія дыфузіі, а цяпер стала дзве). А гэта, дарэчы, адзін з асноўных этапаў у цукровай вытворчасці, дзе адбываецца непасрэдна працэс высалоджвання цукру з буракоў. Таксама ўсталявалі новыя прэсы глыбокага адціскання, рэканструявалі выпарную станцыю, якая сёння разлічана на прадукцыйнасць да 10 тысяч тон буракоў за суткі, замянілі апараты ўварвання утфіляў, працуюць новыя сучасныя цэнтрыфугі. Як адзначыў намеснік галоўнага інжынера Андрэй Аленскі, усё абсталяванне выраблена сусветнымі лідарамі-вытворцамі: італьянскімі, нямецкімі і іншымі еўрапейскімі фірмамі.

Дасягненне планкі ў 7 тысяч тон буракоў за суткі — не канчатковая мэта, а прамежкавы рубеж

— Рэнтабельнасць завода за апошні год склала 12,5 %. Гэта, улічваючы выручку ў 466 мільярдаў рублёў, даволі высокі працэнт, — дзеліцца эканамічнымі і фінансавымі паказчыкамі працы прадпрыемства **галоўны эканаміст ААТ «Скідзельскі цукровы камбінат» Віталь ІОСКЕВІЧ.** — За 2010 год мы вырабілі 167 тысяч тон цукру — 71,5 тысячы тон з цукру-сырцу, а астатняе з цукровых буракоў. Вядома, летняя спёка не дазволіла калгасам атрымаць запланаваны аб'ём буракоў, і цукрыстасць была меншая, таму мы меркавалі нарыхтаваць 850-900 тысяч тон цукровых буракоў, а атрымалася толькі 769 тысяч тон. Адпаведна, замест 110 тысяч тон цукру з цукровых буракоў мы вырабілі толькі 93 тысячы тон.

Віталь Леанідавіч адзначыў, што прыкладна ж на такія лічбы і паказчыкі Скідзельскі цукровы камбінат плануе выйсці і ў 2011 годзе, аднак пры гэтым магутнасць перапрацоўкі буракоў павінна прырасці:

— Сёння сярэднясутачная перапрацоўка на нашым камбінаце дасягнула 7 тысяч тон буракоў за суткі, да 2015 года ў нас запланаваны прырост магутнасцяў перапрацоўкі да 10 тысяч тон, а яшчэ далей — да 12 тысяч тон цукровых буракоў за суткі, — расказвае Віталь Іоскевіч. — Усё гэта робіцца для павелічэння экспартнага патэнцыялу рэспублікі, бо асноўным экспартным прадуктам з'яўляецца цукар, які вырабляецца з цукровых буракоў, а не з сырцу. Сёння нашая сярэднясутачная магутнасць меншая прыкладна на 1 тысячу тон, чым у нашых калег іншых беларускіх цукровых заводаў. Раней гэты разрыў складаў 3 тысячы тон, але, як бачыце, мы яго скарачаем, а з улікам пяцігадовай рэканструкцыі ён зусім знікне, і ўсе камбінаты будуць у роўных умовах.

Дарэчы, за 2010 год экспартныя пастаўкі Скідзельскага цукровага камбіната склалі 81 мільён долараў (гэта на 85% болей, чым па выніках 2009 года), за межы краіны было адгружана каля 104 тысяч тон цукру, каля 23 тысяч тон сушаных жамерын і каля 800 тон лімоннай кіслаты:

— Для дасягнення такіх вынікаў працы мы ўвозім дастатковы аб'ём цукру-сырцу, але стараемся захоўваць станоўчае сальда і нарошчваць яго з кожным годам. У прыватнасці, сальда па знешнеэканамічнай дзейнасці за 2010 год склала больш за 27 мільёнаў долараў з плюсам, а ў 2009 годзе было каля 24 мільёнаў таксама з плюсам. У перспектыве за кошт росту аб'ёмаў перапрацоўкі бураковага цукру наша станоўчае сальда будзе павялічвацца, — перакананы галоўны эканаміст камбіната.

Прыбытак ад рэалізацыі прадукцыі за год склаў, па словах Віталя Іоскевіча, 47 мільярдаў рублёў, а чысты прыбытак — 22 мільярды:

— Наш прыбытак ад рэалізацыі змяншаюць трохі іншыя ўмовы, чым у іншых прадпрыемстваў — наяўнасць вялікай сацыяльнай сферы, якую мы вымушаны ўтрымліваць за кошт прыбытку.

Што тычыцца інвестыцый на рэканструкцыю вытворчасці, то яны ў 2010 годзе склалі 51 мільярд рублёў. Як кажа Віталь Іоскевіч, у параўнанні з 2009 годам гэта — 200%. З іх 33 мільярды складаюць крэдытныя рэсурсы, а астатнія — свае ўласныя сродкі прадпрыемства:

— У наступнай пяцігодцы мы плануем прыцягнуць каля 290 мільярдаў інвестыцый толькі за кошт крэдытных рэсурсаў, плюс дадаткова будуць укладзены ўласныя сродкі. Гэта дазволіць нам збалансаваць нашу вытворчасць да ўзроўню іншых цукровых заводаў, дазволіць насыціць унутраны і знешні рынкі бураковым цукрам, ну і, вядома, дазволіць нам дасягнуць добрых фінансавых вынікаў, — лічыць Віталь Леанідавіч.

Дарэчы, сярэдняя зарплата па камбінаце за 2010 год склала 1,49 мільёна, што ў эквіваленце складае каля 480 долараў. Тэмпы росту зарплаты склалі 133,9% — у 2009 годзе сярэдняя зарплата была на ўзроўні 1,113 мільёна рублёў. Як адзначыў Віталь Іоскевіч, на працягу пяцігодкі на Скідзельскім цукровым камбінаце будуць выкананыя ўказанні кіраўніка дзяржавы па давядзенні сярэдняй зарплаты да тысячы долараў.

Рэканструкцыя на камбінаце: хутка з'явіцца новы комплекс бястарнага захоўвання цукру

За шасцідзесяцігадовую гісторыю свайго існавання на Скідзельскім цукровым камбінаце не раз праводзілася рэканструкцыя: і на пачатку 1990-х гадоў, і ў пачатку 2000-х. Дый і ў апошнія гады кіраўніцтва завода не спіць у шапку — пра тое, што зроблена за апошнія гады на цукровым камбінаце, расказаў **намеснік галоўнага інжынера Андрэй АЛЕНСКІ:**

(Працяг на стар. 4–5.)

ISSN 1990 - 763X

Парламенцкі дзённік

ДА ЧУЖЫХ — ЯК ДА СВАІХ

Рыба шукае, дзе глыбей, а чалавек, натуральна, — дзе лепш. З распаўсюджаннем касмапалітызму і пашырэннем міграцыі нацыянальная самабытнасць становіцца ці не экзотыкай. Аднак далёка не ўсе перасяленцы сталі шукаць лепшага жыцця па сваёй волі. Сярод іх ёсць і тыя, каму заставацца на радзіме было небяспечна, — бежанцы. Многія з іх знайшлі прытулак тут. У краіне, вобраз якой ужо звыкла асацыюецца з талерантнасцю, мяккасцю і памяркоўнасцю. Каб пацярпелыя чужаземцы не адчувалі сябе ў Беларусі чужымі, тут насамрэч робіцца шмат. І як правіла, з лёгкай рукі Прадстаўніцтва Управлення Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў. Так, праекты ажыццяўляюцца, аднак не без бюракратычных перашкод.

— З Упраўленнем Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў у Беларусі дагэтуль няма прамога ўзаемадзеяння, — адзначае **Ганна ЛЯВІЦКАЯ, дэпутат пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах і сувязях з СНД.** — Усе кантакты здзяйсняюцца ў рамках Пераходнага аддзялення, што, натуральна, ускладняе ўзгадненні, павялічвае выдаткі бакоў і тэрміны рэалізацыі праектаў.

Пазбавіцца ад залішніх перашкод дазволіць заключанае Беларуссю і УВКБ пагадненне (аб супрацоўніцтве і прававым статусе прадстаўніцтва гэтай арганізацыі ў нашай краіне). Парламентарыі міжнароднай камісіі якраз рыхтуюць дакумент да ратыфікацыі ўвесну. Якога практычнага плёну чакаць?

— Па-першае, павысіцца самастойнасць Прадстаўніцтва УВКБ ААН у Беларусі — яно будзе ўзаемадзейнічаць з Упраўленнем Вярхоўнага камісара напрамую, без пераходнага аддзялення. Працаваць стане прасцей, — мяркуе народная выбранніца. — Па-другое, павысіцца эфектыўнасць. Штогод Беларусь атрымлівае з фонду УВКБ ААН каля 1,7 млн доларaў на здзяйсненне неабходных мерапрыемстваў па падтрымцы бежанцаў. Яны звычайна ідуць на матэрыяльнае забеспячэнне іх пражывання, будаўніча-рамонтныя работы ў тых інтэрнатах, якія даюць ім прытулак, стварэнне пунктаў размяшчэння такіх асоб на прымежных тэрыторыях, арганізацыю вольнага часу іх дзяцей. Аднак з-за наяўнасці прамежкавых звёнаў у ланцугу ўзаемадзеяння, фінансаванне не заўсёды было такім эфектыўным, як магло б — здараліся перавыдаткі. Ратыфікацыя пагаднення дазволіць упарадкаваць гэтыя працэсы.

Парламентарый гаворыць пра бежанцаў са спачуваннем («гэта ж людзі, якія апынуліся ў цяжкім становішчы»), аднак не без абачлівасці:

— Рэгуляваць заканадаўства ў гэтай галіне трэба вельмі асцярожна. Беларусь сёння прывабная для многіх замежнікаў сваёй цішынёй і спакоем, адсутнасцю варожасці. Аднак, на жаль, не ўсе яны маюць добрыя намеры. Таму трэба быць больш пільнымі, даючы поўны пакет сацыяльных гарантый тым, хто прыбывае ў нашу краіну. Нельга абагрэць усіх, на мой погляд. Я б увогуле давала замежнікам нешта накшталт выпрабавальнага тэрміну, каб прыгледзецца і зразумець, чаму ён абраў менавіта Беларусь. Калі ў яго тут блізкія, знаёмыя — гэта адна справа, а калі нейкія іншыя матывы — другая. Не варта скідаць з рахунку і магчымасці рэінтэграцыі — іх вяртання на радзіму.

Перш правер, а потым вер? Што ж, абачлівасць і асцярожнасць — гэта па-беларуску. Аднак мне падаецца, ёсць у жыцці такія людзі і сітуацыі, з якімі лепш няхай нават і ашукацца, але паверыць, чым правяраць і крыўдзіць...

ДОМА — ДОБРА, А Ў ГАСЦЯХ... ГЭТАКСАМА

У БЕЛАРУСКІХ СЭЗ РАСІЯНЕ І КАЗАХІ БУДУЦЬ ПРАЦАВАЦЬ, ЯК У СЯБЕ

Што б там ні казалі, а Мытны саюз тройкі пакрысе будуецца. Прынамсі, нарматыўны падмурак закладваецца спраўна. Зацвярджаныя заканадаўцамі пагадненні аднолькавым чынам рэгулююць тую ці іншую сферу ва ўсіх трох краінах. Чарговы дакумент, які рыхтуецца ў Беларусі да разгляду на вясновай сесіі, тычыцца свабодных эканамічных зон.

— Ратыфікацыя пагаднення ўсімі трыма парламентамі нівеліруе наяўныя разыходжанні: на сёння ў расіян свой парадак, у казахаў — свой. А тут ужо будуць адзіныя правілы і працэдуры для ўсіх, — тлумачыць **Віталь БУСЬКО, дэпутат Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах і сувязях з СНД.** — Гэта значыць, у расійскай СЭЗ беларусы і казахі будуць працаваць, як у сябе дома.

Дакумент рэгламентуе парадак стварэння, функцыянавання і спынення работы адмысловых зон. Вызначае віды дзейнасці, якія могуць там ажыццяўляцца, прапісвае таксама парадак рэгістрацыі рэзідэнтаў. Гэта ключавыя моманты, на якія звяртае ўвагу парламентарый.

— Далей чыста працэдурныя, рабочыя нюансы: парадак і ўмовы функцыянавання СЭЗ, удасканаленне мытных аперацый. Адна справа, калі тавар увезены на тэрыторыю СЭЗ, іншая — калі ён проста паехаў па Беларусі. Яму ў тым ці іншым выпадку надаюцца розныя якасці: ён будзе па-рознаму абкладацца падаткам, вывозіцца і гэтак далей. Асабліва, калі да гэтага тавару прымяняецца працэдура свабоднай мытнай зоны: гэта абсалютна іншыя падаткі, умовы. Але як бы мы (заканадаўцы. — **Аўт.**) прыгожа ўсё ні напісалі, спрэчкі ўсё адно ўзнікнуць. І тут прапісана, як яны будуць вырашацца ў працэсе функцыянавання СЭЗ.

Але пакуль рынцыповы кансенсус удзельніцамі саюза дасягнуты. Значыць, да нейкай роўнасці ўсё ж прыйсці ўдалося.

— Узятае тое найлепшае, што было ў той ці іншай дзяржавы. У нас гэта мытныя працэдуры — тут мы самыя прасунутыя, — акцэнтуе народны выбраннік. — Расійскі вопыт, напрыклад, узяты за арыенцір для рэгламентацыі функцыянавання гэтых зон.

Пагадненне само па сабе не проста спрыяе далейшай інтэграцыі трох краін, якія вырашылі збліжацца эканамічна, але і падахвочвае да супрацоўніцтва астатніх:

— Сёння інвестар, ідучы ў СЭЗ Беларусі, міжволі трымае ў свядомасці, што там ёсць і нейкія перспектыўныя расійскія фірмы, і казахстанскія. А калі я, напрыклад, інвестар з Польшчы, мне ж, вядома, лепш у Беларусь падацца. 100 км, а фірмы тыя ж, што працуюць у Расіі ці Казахстане. А гэта ўжо робіць прапанову больш прывабнай.

МІЖ СЦЫЛАЙ І ХАРЫБДАЙ — ТЭЛЕРЭКЛАМА

У нясцерпным становішчы, літаральна між Сцылай і Харыбдай, апынулася на чарговай парламенцкай дыскусіі айчынная рэклама. Абмежаваць — настойваюць дэпутаты, спасылаючыся на скаргі выбаршчыкаў. Разняволіць — пастанаўляе чацвёртая дырэктыва аб далейшай лібералізацыі эканомікі, пра якую нагадвае заканадаўцам Мінгандаль. І размова тут не толькі пра саміх вытворцаў, якія даюць рэкламу, але і пра тых, хто яе распаўсюджвае. Рэклама — галоўны «хлеб» многіх СМІ, якія працуюць, не будзем забывацца, для людзей. Дык ці не ў нашых з вамі інтарэсах, каб рэклама ўсё ж квітнела і развівалася, а не абмяжоўвалася і знікала?!

Настолькі эмацыйных і зацятых спрэчак у сценах парламента, прызнаюся, даўно не чула. Некаторыя дэпутаты праяўлялі такую заўзятасць... калі б не ведала, што яны за інтарэсы выбаршчыкаў змагаюцца, падумала б: рэклама пакрыўдзіла іх асабіста. І хоць прынятыя ў першым чытанні папраўкі ў закон рэгулююць і вонкавае паблісіці, і аб'явы ў паштовых скрынях, найбольш зачапіла заканадаўцаў тэлерэклама.

Асноўныя прэтэнзіі — да яе гуку і аб'ёмаў. Ёсць нараканні і па змесце. Асобныя дэпутаты прыводзяць канкрэтныя прыклады рэкламы, сэнс якой ім незразумелы ці падаецца занадта дзёрзкім. Але ж прабачце, каму патрэбная сціплая добрапрыстойная рэклама, калі на яе ніхто не звяртае ўвагі?! Наспелі ў парламентарыяў папракі і наконт некаторых «таварных» пазіцый — казіно, латарэй, піва і слабаалкагольных напояў.

Міністэрства гандлю заняло мудрую пазіцыю, якую некаторыя парламентарыі расцанілі выключна як абарону рэкламадаўцаў, і дарэмна:

— Мы разглядаем законапраект (папраўкі ў закон аб рэкламе. — **Аўт.**) у асаблівы час — перыяд апрабацыі канцэптуальна новага падыходу да дыялогу ўлады і бізнэсу, — нагадвае **намеснік міністра гандлю Ірына НАРКЕВІЧ.** — Рэклама — маладая галіна эканомікі, якая мае права на развіццё. Апасродкавана яна звязаная з ростам як унутранага, так і знешняга тавараабароту краіны.

Чыноўнік звярнула ўвагу і на тое, што галоўны лозунг Дырэктывы № 4: «Канкурэнцыя — усюды, дзе магчыма (з пункту гледжання закона, натуральна), а дзяржаўнае рэгуляванне — там, дзе неабходна». Яго, як бачым, цяжка ўвязаць з захадамі, якія ініцыююць некаторыя дэпутаты...

— Сёння трэба даць магчымасць таваравытворцам паказаць свой твар, — пераконвае народных выбраннікаў намеснік міністра і заклікае заканадаўцаў прыняць узважанае рашэнне.

Дарэчы, твар гэты нарэшце стаў беларускім. У нас хапае прыгожых дзяўчат. Хто як не яны павінны красавацца ў паліто «Элемы» ці ў блізне «Мілавіцы»?!

Магчымасці скарачэння аб'ёмаў тэлерэкламы, паводле слоў спадарыні Наркевіч, доўга абмяркоўваліся з зацікаўленымі бакамі. Неабходна было знайсці кампраміс.

— Мы разумеем, што сёння кампраміс — не ісці на змяншэнне эфірнага часу тэлерэкламы, — заяўляе намеснік міністра гандлю.

Нагадаем, у прайм-тайм рэкламу круцяць на ТБ па 18 хвілін у гадзіну, парламентарыі ж прапануюць скарациць яе ўдвая. Здавалася б, добрая ідэя — не так раздражняць будзе. Але намеснік міністра вызначае напарад магчымыя наступствы такога скарачэння. 30-секундны ролік у эфіры беларускага тэлеканала цяпер каштуе ў сярэднім 300 доларaў (для параўнання: расійскі «тарыф» у пяць разоў большы). А калі аб'ёмы рэкламных паказаў зменшацца, кошт, безумоўна, падскочыць. Ці будзе ён пад сілу айчынным прадпрыемствам? Рэкламуюцца ж найбольш яны. Паводле інфармацыі спадарыні Наркевіч, 60 адсоткаў рэкламы на тэлебачанні сёння папулярызуе якраз айчынныя тавары ды паслугі. Ці лёгка ім будзе спаборнічаць на рынку, калі іх пазбавяць ці не галоўнай зброі ў канкурэнтнай барацьбе?

Свой інтарэс пільнуюць і тэлекампаніі. Маўляў, і пры сённяшніх аб'ёмах рэкламы становішча вымушае чакаць лепшага. А калі скарациць яе ўдвая...

— Дзякуючы паступленням ад рэкламы прасуюецца развіццё нацыянальнага тэлепрадукту, — пераконвае дэпутатаў **намеснік міністра інфармацыі Аляксандр СЛАБАДЧУК.** — Рэклама — асноўная крыніца прыбыткаў для тэлеканалаў.

І вытворцы, і тэлекампаніі, вядома ж, працуюць не з дабрачынасці. Аднак я не схільная супрацьпастаўляць іх інтарэсы патрэбам спажыўцоў. Хіба мы не зацікаўлены ў тым, каб вытворцы канкурыравалі між сабой у спробе завяваць нашу прыхільнасць, павышалі якасць свайго тавару, зніжалі кошт? Хіба не хочам глядзець новыя якасныя беларускія рэаліці-шоу, а не набытыя каналам фільмы 10-гадовай даўніны? І тым, і другім для гэтага патрэбная рэклама. Няўжо гэта сёння яшчэ для кагосьці адкрыццё? Хоць ты з лекцыямі пра карысць рэкламы выступай. Дарэчы, падобныя прапановы агучвалі і самі парламентарыі.

Дэпутат Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па жыллёвай палітыцы, будаўніцтве, гандлі і прыватызацыі Таццяна ФІЛІМОНЧЫК, у прыватнасці, выказвалася аб неабходнасці правадзіць сярод насельніцтва тлумачальную работу, расказваць, за кошт чаго жывуць тэлеканалы. І тым самым зняць скаргі на дакучлівую рэкламу, якія паступаюць ад насельніцтва. Аднак калі меркаваць па тых жорсткіх абмежаваннях, якія прапануюць некаторыя народныя выбраннікі (не толькі часавых, але і зместавых), пэўны лікбез патрэбны і ім самім...

Не рэкамендуюць цырымоніцца многія дэпутаты і з рэкламай піва. Найперш за здароўе падлеткаў турбуюцца. Адны прапануюць забараніць рэкламу пеннага напою наогул, іншыя — не дазваляць яе ў прайм-тайм, перанесці на больш позні час. І зноў паміж двух агнёў атрымліваецца. З аднаго боку — клопат пра падлеткаў. З другога — «ёсць буйная праграма па развіцці піўной галіны ў Беларусі», нагадвае намеснік міністра гандлю. І відавочна, што абмежаванні па рэкламе ячнага напою пойдуць з ёю ў разрэз. Да таго ж, як даводзіць спадарыня Наркевіч, нават у сумежных дзяржавах адсутнічаюць абмежаванні па рэкламе піва. А калі згадаць яшчэ і коштавую палітыку тых жа ўкраінскіх піваварaў... Беларускіх толькі падтрымліваць трэба, а не абмяжоўваць.

— У гэты час трэба пакінуць такую пазіцыю, як ёсць — з улікам таго, што ў нас і так больш жорсткія забароны ў дачыненні да рэкламы піва, — рэзюмуе Ірына Наркевіч.

Не думае, што абмежаванні па рэкламе піва стануць панацэяй, і намеснік міністра інфармацыі Аляксандр Слабадчук:

— Наколькі ад гэтага выйграюць у параўнанні з іншымі нашы піваварныя заводы ў сябе на тэрыторыі? Хіба ад гэтага зменшыцца алкагольная залежнасць? Адной рэкламай праблемы не вырашыш, павінен быць комплекс захадаў. Да таго ж, любая забарона выклікае іншыя праблемы...

Ды і хіба піва п'юць алкаголікі? Яны абіраюць напоі куды больш моцныя і танныя. Паводле інфармацыі, прыведзенай **намеснікам гендырэктара «Аліварыі» па маркетынгу Надзеяй ДЗЕШКАВЕЦ,** 77 адсоткаў у структуры спажывання прыходзіцца на моцны алкаголь і «чарніла». У такой сітуацыі, наадварот, варта рэкламаваць піва больш актыўна. Спадарыня Дзешкавец прывяла адпаведны паспяховы вопыт у заходнееўрапейскіх краінах, дзе ўдалося істотна змяніць структуру спажывання — так бы мовіць, перарыентаваць насельніцтва з моцнага алкаголю.

Турбуе парламентарыяў і казіно, ва ўсякім разе яго рэклама на тэлебачанні. **Дэпутат Ларыса ВЕРШАЛОВІЧ** апасаецца за здароўе наведвальнікаў ігральных устаноў:

— З алкагольнай і наркатычнай залежнасцю цяпер змагаюцца, а вось гульнявая лячэнню не паддаецца, гэта я вам як доктар кажу.

Так, гэта нагода для роздуму. Аднак на карысць рэкламы казіно ёсць адзін важкі аргумент, які і прыводзіць намеснік міністра гандлю: «Дзейнасць казіно дазволена заканадаўствам». І проста так узяць ды адмяніць... На якой падставе?

Скардзіліся дэпутаты і на дакучлівую рэкламу латарэй. Аднак, як прызнаюцца на тэлебачанні, самі розыгрышы — адны з найбольш рэйтынгавых у сетцы вяшчання. Значыць, рэклама дзейнічае, не толькі дакучае? Дык, можа, усе гэтыя забараняльныя ініцыятывы, якія вылучаюцца дзеля насельніцтва, з клопату пра яго, — яму ж мядзведжая паслуга?..

Ала МАЧАЛАВА.

«МЫ НЕ МАГЛІ ДАПУСЦІЦЬ, КАБ ПОЛЫМЯ, ЯКОЕ РАСПАЛІЛІ КАНДЫДАТЫ Ў ПРЭЗІДЭНТЫ, ПАРУШЫЛА СТАБІЛЬНАСЦЬ У БЕЛАРУСІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Як паведаміў Анатоль Куляшоў, летась не без дапамогі грамадзян было канфіскавана і знішчана 1,4 млн літраў самагону, звыш 300 тыс літраў фальсіфікаваных спіртных напояў. Праз суды ў лячэбна-прафілактарыі ізалявана звыш 6 тысяч чалавек, у тым ліку 1325 жанчын. За распіццё спіртных напояў або з'яўленне ў грамадскім месцы ў п'яным выглядзе затрымана каля 270 тыс асоб, у тым ліку звыш 8,5 тыс — за знаходжанне на працоўным месцы ў працоўны час у стане алкагольнага ап'янення.

Мяркуецца, што сёлета дапушчальны ўзровень утрымання алкаголю ў крыві будзе зніжаны з 0,5 да 0,3 праміле. Дакумент, які прадугледжвае такія змены, знаходзіцца зараз у Савеце Міністраў. МУС падтрымлівае і забарону продажу спіртнога асобам ва ўзросце да 21 года. Праект гэтай нормы таксама знаходзіцца зараз у Савеце Міністраў. Паводле слоў міністра, гэтая норма павінна ўступіць у сілу ўжо ў гэтым годзе.

У мінулым годзе міліцыі ўдалося ўладкаваць на працу 98 працэнтаў асоб, якія ўхіляюцца ад выхавання дзяцей. Матэрыяльныя страты, якія панесла па гэтай прычыне дзяржава, склалі 234 млрд рублёў, з якіх удалося вярнуць 136 млрд, або 58 працэнтаў ад агульнай сумы. 8 тыс крымінальных спраў заведзена ў дачыненні да асоб, якія ўхіляюцца ад выплаты грошай, затрачаных на выхаванне дзяцей у дзяржаўных установах.

Паводле звестак міністра, летась у дачыненні да супрацоўнікаў міліцыі было заведзена 140 крымінальных спраў, у той час як быў выяўлены 191 факт парушэння закона супрацоўнікамі міліцыі. Большасць такіх спраў заводзіцца па ініцыятыве самога МУС, паколькі выяўляюцца службай уласнай бяспекі.

Адносна падзей 19 снежня Анатоль Куляшоў паведаміў, што ў дачыненні да ўдзельнікаў несанкцыянаванай акцыі міліцыя паводзіла сябе максімальна карэктна. Міністр адзначыў з гэтай нагоды: «Аб'ектыўных звестак аб тым, што спадара Някляева ўдарыў прадстаўнік міліцыі, у мяне няма... Усё рабілася для таго, каб органы правапарадку не абвінавацілі ў тым, што яны перашкаджаюць волевыяўленню грамадзян, парушаюць правы, свабоды і дэмакратыю ў краіне. Міліцыя не адрэагавала нават тады, калі прагучаў заклік пайсці з Кастрычніцкай плошчы ў бок рэзідэнцыі Прэзідэнта. Аднак затым быў другі заклік — аб захопе будынку ЦВК і Дома ўрада. Мы бачылі агрэсіўнасць натоўпу і не сталі прадпрымаць ніякіх актыўных дзеянняў, каб не справакаваць натоўп на актыўнае процістаянне сілам правапарадку». Актыўныя меры былі прыняты пасля таго, як прагучалі заклікі да ўзбройвання камянямі і захопу Дома ўрада. «Мы не маглі дапусціць, каб полымя, якое распалілі кандыдаты ў прэзідэнты, так званыя рэвалюцыянеры, парушыла парадак і стабільнасць у Беларусі», — сказаў міністр і падкрэсліў, што ў шэрагу іншых краін у дачыненні да ўдзельнікаў падобных мітынгаў выкарыстоўваюцца і слёзатачывы газ, і гумавыя кулі, і вадамёты. «Прадстаўнікі розных дзяржаў сёння кажуць аб тым, што праваахоўныя органы дзейнічалі адэкватна, без прымянення звышсілы», — дадаў Анатоль Куляшоў.

На сёння затрыманы 50 актыўных удзельнікаў масавых беспарадкаў 19 снежня. Прычым 16 з гэтых 50-і прыцягваліся раней да крымінальнай адказнасці за розныя віды злачынстваў. 33 чалавекі знаходзяцца ў следчых ізалятарах, 4 — пад падпіскай аб нявыездзе. Міністр заўважыў, што ўжо ў першых чыслах лютага ў дачыненні да некаторых асоб справы будуць перададзены ў суд.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Валерый ІВАНОЎ:

«Прыпісак у сельскай гаспадарцы быць не павінна»

Аб гэтым заявіў учора на пасяджэнні калегіі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Валерый Іваноў, перадае БЕЛТА.

«Прыпіскі ўсюды, скрываюцца недапушчальныя факты. Па 300-500 тон мяса прыпісваюць», — абурыўся віцэ-прэм'ер. На яго думку, кіраўнікі сельгасарганізацый спрабуюць лічбамі кампенсаваць сваю бяздзейнасць. «Лепш атрымаць за тое, што недапрацавалі, чым сфальсіфікаваць і атрымаць фальшывы дабрабыт», — лічыць ён.

Валерый Іваноў заклікаў кіраўнікоў сельгасарганізацый навесці на месцах парадак. «Неабходна дабіцца рэальнай ацэнкі стану спраў», — падкрэсліў ён. Калі для лепшага вядзення спраў у сельгасарганізацыях патрэбна змяненне структуры кіравання, то яно будзе, дадаў віцэ-прэм'ер. Ён таксама лічыць, што трэба больш дэталёва прааналізаваць прычыны недабору збожжа ў мінулым годзе.

Паводле яго слоў, сродкі, што ўкладваюцца ў развіццё сельскай гаспадаркі, недастаткова акупляюць сябе. Хоць для гэтага ёсць аб'ектыўныя прычыны, у прыватнасці рост цэн на энерганосьбіты, аднак шмат і суб'ектыўных фактараў. Размова ідзе, напрыклад, аб сур'ёзных парушэннях тэхналагічнай дысцыпліны ў сельгасарганізацыях. Гаспадаркі нясуць вельмі вялікія затраты на тое, «каб перазімавалі азімыя». Акрамя таго, не відаць адпаведнага выніку ад укладання грошай у закупку сродкаў для аховы раслін і барацьбы з пустаземам. Прадаўжае зніжацца ўрадлівасць глеб. «Разлічваць на тое, што ў гэтым годзе прыйдуць нейкія шалёныя грошы, я вам не раю», — сказаў Валерый Іваноў, звяртаючыся да кіраўнікоў арганізацый сельскагаспадарчага сектара.

Мінск выдатна справіцца з правядзеннем чэмпіянату свету па хакеі 2014 года

Урачыстая цырымонія падпісання дагавора аб супрацоўніцтве паміж Дырэкцыяй па правядзенні чэмпіянату свету - 2014 у Мінску і камерцыйным партнёрам Міжнароднай федэрацыі хакея (ІІХФ) кампаніяй «Інфронт» прайшла ўчора ў Мінскай гарадской ратушы, перадае БЕЛТА.

Подпісы пад дакументам паставілі старшыня асацыяцыі «Федэрацыя хакея Рэспублікі Беларусь» Яўген Ворсін, які таксама ўзначальвае Дырэкцыю па правядзенні суветнага першынства, і дырэктар кампаніі «Інфронт» па зімовых відах спорту Бруна Марці.

«Інфронт» на працягу многіх гадоў з'яўляецца камерцыйным партнёрам ІІХФ і мае багаты вопыт супрацоўніцтва з аргкамітэтамі чэмпіянатаў свету (2005, 2009, 2010), адыгрывае вялікую ролю ў арганізацыі маючых адбыцца сусветных пяршынстваў — 2011, 2012 і 2013 гадоў. На думку Бруна Марці, беларускі бок правёў ужо вялікую работу па арганізацыі сусветнага першынства. Бруна Марці падкрэсліў, што няма ніякіх сумненняў, што Мінск выдатна падрыхтуецца да сусветнага хакейнага форуму і правядзе яго на самым высокім узроўні, а кампанія «Інфронт» акажа ўсялякую падтрымку беларусам.

Яўген Ворсін адзначыў, што будаўніцтва «Чыжоўкі-Арэны» будзе завершана ў 2013 годзе, і перад стартам сусветнага чэмпіянату - 2014 яна пройдзе абкатку, каб у поўным узбраенні падысці да галоўнага спаборніцтва. Акрамя таго, вядзецца будаўніцтва гасцініц, транспартных развязак, а таксама праводзіцца іншая арганізатарская работа.

Гаворачы аб чутках, што чэмпіянат свету - 2014 можа быць перанесены з Мінска ў сувязі з палітычнымі падзеямі, Бруна Марці падкрэсліў, што ён не займаецца палітыкай: «Мы цвёрда ведаем, што Міжнародная федэрацыя хакея прадаставіла Мінску права на яго правядзенне і няма ніякіх падстаў для змянення гэтага рашэння. Беларусь з'яўляецца выдатным месцам для чэмпіянату свету». Яўген Ворсін лічыць, што пустыя домыслы не павінны ўплываць на ход падрыхтоўкі да хакейнага свята, якое чакаюць беларускія аматары спорту. Чэмпіянат свету па хакеі ў Мінску пройдзе 9—25 мая 2014 года.

ПАЙШОЎ З ЖЫЦЦЯ РЭЖЫСЁР ЮРЫЙ ЦВЯТКОЎ

Пазаўчора ўвечары а 23.20 пасля цяжкага захворвання пайшоў з жыцця вядомы савецкі і беларускі кінарэжысёр, аператар і сцэнарыст Юрый Мікалаевіч Цвяткоў. 14 лютага яму споўнілася б 70 гадоў.

Фота з архіва БЕЛТА.

Шырокі глядач ведае Юрыя Цвяткова па дзіцячых і дарослых фільмах: «Пасля кірмашу» (1972), «Гэта вясёлая планета» (1973), якую паказвалі па тэлебачанні кожны раз перад Новым годам, пакуль не з'явілася «Іронія лёсу», «Марынка, Янка і таямніцы каралеўскага замка» (1976-1977), «Мінулагодняя кадрыля» (1978) і інш. Адзін з самых вядомых фільмаў рэжысёра — «Ясь і Яніна» (1974) — з удзелам славутых «Песняроў». Апошнія некалькі гадоў Юрый Мікалаевіч працаваў над нізкай фільмаў пра вядомых у свеце ўраджэнцаў Беларусі, якія зрабілі вялікі ўнёсак у сусветную гісторыю і культуру: «Шклоўскі афорт» пра Сямёна Зорыча і Марыінскі балет у Беларусі, «Робін Гуды з беларускімі імёнамі» аб прататыпах «Дуброўскага» А. Пушкіна і «Сашкі Жыгулёва» Л. Андрэева, якія былі рэальнымі людзьмі і жылі ў свой час у Беларусі. Нядаўна Юрый Мікалаевіч скончыў сцэнарый дакументальнага фільма пра Тадэвуша Касцюшку, які плануе рэалізаваць «Белвідэацэнтр».

Усё жыццё Юрый Цвяткоў быў цесна звязаны з кінематографам не толькі як творца, але займаў і афіцыйныя пасады, на якіх плённа працаваў. Узначальваў Саюз кінематаграфістаў Беларусі, з 1993 па 1996 гг. быў генеральным дырэктарам Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм». Пры ім на кінастудыі былі створаны такія знакамітыя кінакарціны, як «Сын за бацьку» (1995) з удзелам Мікалая Яроменкі і Мікалая Яроменкі—мал., «Акафіст Уладзіміру» пра Уладзіміра Караткевіча па сцэнарыі Рыгора Барадуліна, «На чорных лядах» паводле твораў Васіля Быкава. Такая выдатная падборка фільмаў паказвае Юрыя Цвяткова яшчэ як выдатнага кіраўніка з высокім мастацкім густам.

Смуткуем, спачуваем сям'і, сябрам, усім, хто ведаў і любіў творчасць Юрыя Мікалаевіча.

Звяздоўцы.

Абзац

Кніжная выстава да 90-годдзя з дня нараджэння беларускага пісьменніка, вядомага грамадскага дзеяча і навукоўца, Героя Сацыялістычнай Працы Івана Шамякіна адкрылася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

П'яны мужчына «замініраваў» чыгуначны вакзал у Гродне. Падчас ажыццяўлення мерапрыемстваў па праверцы выбуховага прыстасавання спецыялісты не знайшлі. Праваахоўнікі выявілі адрас таго, хто званіў, праз 10 хвілін. Міліцыя затрымала двух моцна п'яных братоў. «Мінёрам» аказаўся 25-гадовы гродзенец, які нідзе не працуе, раней прыцягваўся да суда. Матывы ўчынку высвятляюцца.

На адной з фермаў у паўднёвай Японіі з-за ўспышкі птушынага грыпу — чацвёртай за гэтую зіму — знішчана больш за 8,6 тыс. курэй. Як мяркуецца, крыніцай заражэння маглі стаць пералётныя птушкі.

Поўны абзац

Мэру Кішынёва Дорыну Кіртаакэ выпісалі штраф за ваджэнне без правоў. На днях ён праехаўся на снегаўборачнай машыне перад журналістамі падчас паказу спецтэхнікі. У муніцыпальнай паліцыі заўважылі гэта, да ўсяго ведалі, што ў мэра няма правоў той катэгорыі, неабходнай для кіравання цяжкай тэхнікай Ужо на наступны дзень парушальніку прыслалі паведамленне пра штраф. Як удакладнілі ў паліцыі, мэр аштрафаваны на 1000 лей (каля 83 доларaў). Ён прызнаў сваё парушэнне і згадзіўся аплаціць штраф.

У ЗША падчас правядзення конкурсу сярод чэрававаяшчальнікаў з даволі вялікім прызавым фондам журы выкрыла хлопца, які праглынуў рацыю і разам з таварышамі спрабаваў здзівіць прысутных сваім талентам. Члены журы, якія і самі маюць багаты вопыт такога занятку, адразу заўважылі, што гукі ад чэрававаяшчальніка ідуць зусім не такія, як звычайна бывае. А канчаткова пацвердзілі іх падазрэнні перашкоды, якія рацыя стварала на мікрафон. Медыцынскія абследаванні і рэнтген далі вынік: у страўніку хлопца знаходзіцца маленькая рацыя. Нягледзячы на грамадскае асуджэнне, а таксама тое, што маладога чалавека выключылі з ліку ўдзельнікаў, журы ўсё ж выдала жулікам дыплом «за арыгінальны падыход».

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ВЯРТАННЕ З ЗАХАВАННЕМ

УПАЎНАВАЖАНЫ ПА СПРАВАХ РЭЛІГІЙ І НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЯЎ ЗАКЛІКАЎ БОЛЬШ УВАЖЛІВА СТАВІЦЦА ДА ПЕРАДАЧЫ ПОМНІКАЎ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ РЭЛІГІЙНЫМ АРГАНІЗАЦЫЯМ

Учора на выніковай калегіі апарата Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь не толькі падводзіліся вынікі працы за мінулы год, але і абмяркоўвалася выкананне мерапрыемстваў Праграмы развіцця канфесійнай сферы, нацыянальных адносін і супрацоўніцтва з суайчыннікамі за мяжой на 2006—2010 гады, а таксама ставіліся задачы на наступныя 5 гадоў. Сярод праблемных пытанняў Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Леанід ГУЛЯКА назваў захаванне гісторыка-культурнай спадчыны з боку рэлігійных арганізацый.

— Нягледзячы на падтрымку дзяржавы і рэальную дапамогу на рэспубліканскім і мясцовым ўзроўнях, рэлігійнымі арганізацыямі ў недастатковай ступені забяспечваюцца ахоўныя абавязацельствы, — паведаміў Упаўнаважаны. — У шэрагу выпадкаў рэлігійныя арганізацыі не прымаюць мер па захаванні помнікаў, спасылаючыся на недахоп фінансавых сродкаў. Таму трэба больш уважліва адносіцца да пытанняў перадачы рэлігійным арганізацыям аб'ектаў, якія з'яўляюцца перш за ўсё помнікамі гісторыі і культуры.

Акрамя таго, заўважыў Леанід Гуляка, рэлігійныя арганізацыі не заўсёды афармляюць праектна-каштарысную дакументацыю на правядзенне рамонтна-рэстаўрацыйных работ, што выклікае справядлівыя нараканні з боку Міністэрства культуры і органаў пракуратуры. У сувязі з гэтым Упаўнаважаны параіў мясцовым органам улады больш увагі надаваць тлумачальнай рабоце з кіраўніцтвам рэлігійных арганізацый.

Сярод аб'ектаў, якія маюць вялікае значэнне для гісторыі і культуры Беларусі, развіцця рэлігійнага турызму і якім будзе нададзена ўвага з боку дзяржавы ў наступныя пяць гадоў, на калегіі былі названы Жыровіцкі Свята-Успенскі манастырскі комплекс і Спаса-Ефрасіннеўскі жаночы манастыр у Полацку. Адносна Жыровіцкага манастырскага комплексу ўжо распрацаваны праект адпаведнай праграмы на 2011—2015 гады, які знаходзіцца зараз на ўзгадненні ва ўрадзе краіны. Папярэдні падлік выдаткаў на гэты праект складае каля 50 млрд рублёў.

За апошнія два гады на рэстаўрацыйныя работы Жыровіцкага Свята-Успенскага манастырскага комплексу і Мінскай духоўнай акадэміі і семінарыі было выдаткавана дзяржавай больш за 15 млрд рублёў. Са сродкаў рэспубліканскага бюджэту летась значна дапаможа і рэстаўрацыі таксама Свята-Уваскрэсенскага сабора ў Барысаве, Успенскага манастыра ў Пустынках Мсціслаўскага раёна, былога калегіума езуітаў у вёсцы Юровічы Калінкавіцкага раёна (цяпер праваслаўны манастыр), касцёла Божага Цела ў Нясвіжы.

Летась у нашай краіне было зарэгістравана 56 новых рэлігійных абшчын (з іх 36 праваслаўных і 5 рымска-каталіцкіх). Прычым традыцыйна ў заходніх абласцях захоўваецца больш высокая рэлігійнасць.

На пачатак гэтага года ў нашай краіне было зарэгістравана ўсяго 3162 рэлігійныя абшчыны. Гэтая лічба адлюстроўвае колькасць абшчын усіх, зарэгістраваных у Беларусі, 25 рэлігійных канфесій і напрамкаў. Амаль палова з іх, больш за паўтары тысячы, належыць Беларускай праваслаўнай царкве. За апошнія 15 гадоў колькасць праваслаўных прыходаў павялічылася амаль у чатыры разы. Акрамя таго, у нашай краіне дзейнічаюць 32 манастыры (летась быў зарэгістраваны адзін новы — Усяміласцівага Спаса жаночы манастыр у Кобрыне) і 5 духоўных навучальных устаноў Беларускай праваслаўнай царквы.

Адным з праблемных пытанняў у адносінах дзяржавы з праваслаўнымі арганізацыямі з'яўляецца будаўніцтва новых храмаў. Больш дакладна — з'яўленне даўгабудаў. Леанід Гуляка звярнуў увагу мясцовых органаў улады на тое, каб дазволы на будаўніцтва новых цэркваў не выдаваліся ў тых мясцовасцях, дзе ёсць недабудаваныя храмы — такіх па Беларусі 150.

Забяспечанасць праваслаўных прыходаў культавымі будынкамі складае 85 працэнтаў. За 20 апошніх гадоў Праваслаўнай Царкве было перададзена 840 былых культавых і іншых будынкаў. На сёння дзейнічае 1334 праваслаўныя храмы.

Другой па колькасці вернікаў з'яўляецца Р

СІСТЭМА «СМЕРЧ»: ДАКЛАДНЫЯ ЎДАРЫ НА 70 КІЛАМЕТРАЎ

Доследныя тактычныя вучэнні з рэактыўным артылерыйскім дывізіёнам 336-й рэактыўнай артылерыйскай брыгады з баявымі пускамі рэактыўнымі сістэмамі залпавага агню «Смерч» прайшлі на 174-м вучэбным палігоне Ваенна-паветраных сіл і войск супрацьпаветранай абароны «Даманава» Івацэвіцкага раёна. Удзельнікі вучэнняў адпрацоўвалі пытанні падрыхтоўкі і кіравання дзеяннямі разведвучэбнага ўдарнага комплексу ракетных войск, павышэння практычных навыкаў камандзіра і штаба дывізіёна ў кіраванні падраздзяленнямі.

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.
в. Галенчыцы, Івацэвіцкі раён.

Да 90-годдзя з дня нараджэння Івана Шамякіна

БЕЗ ГУЛЬНІ Ў ПАДДАЎКІ



Багатую спадчыну пакінуў нам народны пісьменнік Беларусі Іван Пятровіч Шамякін. На яго творах выраслa не адно пакаленне беларусаў. Ён, пагадзіцеся, у свой час быў самым чытаным аўтарам. «Глыбокая плынь», «У добры час», «Крыніцы», «Сэрца на далоні», «Снежныя зімы», «Атланты і карыятыды», «Вазьму твой боль», «Петраград — Брэст», «Зеніт» — хто не памятае гэтыя раманы? А пенталогія «Трывожнае шчасце»? На яго творчым рахунку былі кнігі аповесцяў і апавяданняў, п'есы. Той, хто сачыў за літаратурным працэсам гадоў пятнаццаць-дваццаць назад, не мог не звярнуць увагі, што Іван Шамякін па-ранейшаму, не зважаючы на ўзрост, быў у выдатнай творчай форме — у друку з'яўляліся адна за адной яго новыя аповесці «Вернісаж», «Сатанінскі тур», «Падзенне», «Адна на падмостках», «Бумеранг», «Без пакаяння», раманы «Вялікая княгіня» і «Губернатар» і іншыя значныя творы. Верным заставаўся ён і жанру ўспамінаў, якія сёння, калі пісьменніка ўжо амаль сем гадоў няма з намі, набываюць неацэнную каштоўнасць. І не толькі для шчырых прыхільнікаў ягонай творчасці — для ўсіх! Цікава, як тыя ці іншыя гістарычныя падзеі, не кажучы ўжо пра асабістыя жыццёвыя калізіі, прапускаў І. Шамякін праз сваё сэрца, праз свой тонкі пісьменніцкі розум і густ.

Піша, а дакладней сказаць, размаўляе І. Шамякін, вядзе нязмушаны дыялог з чытачом без гульні ў паддаўкі. Не слівае, як той акын, пра ўсё, што бачыць, і толькі ў рыфмаванай форме. Ён дае прынцыповую ацэнку падзеям, з'явам, часцей за ўсё — і людзям, няхай гэта першы сакратар ЦК КПБ, народны пісьменнік або яшчэ хто. Называе рэчы, адным словам, сваімі імёнамі. Сыпаліся, яшчэ і як, калі памятаеце, на некаторыя ранейшыя публікацыі з цыкла «Пра час і пра сябе» І. Шамякіна папракі за «скажэнне» тых ці іншых фактаў, выцягвалі пісьменніка нярэдка і на дуэль. Прымаў ён тыя папрокі блізка да сэрца або не, ці пагаджаўся, перакрэсліваў адным махам напісанае — сказаць цяжка: ён адмоўчваўся, не ўлазіў у перапалкі, рабіў гэта толькі выключна ў самых неабходных момантах...

Пра ўсё гэта мне думалася, калі перачытваў успаміны «Роздум на апошнім перагоне». Пашыраныя дзённікавыя запісы. Яны вяртаюць нас на дваццаць гадоў назад. Афіцыйна. Калі меркаваць па даце, што стаіць пад імі. Але ж вяртаюць назад і на трыццаць, сорак гадоў, бывае, роўна як і вымушаюць зазірнуць у будучыню. Што паробіш — за Шамякіным ходзіш надзвычай лёгка, ахвотна туды, куды ён вядзе цябе. Умее! І словам прывабіць, і думкай, і неабходным цікавым аповедам.

«Захаваўся пачатак дзённіка за 1953 год — за 4 і 5 сакавіка — дні хваробы і смерці Сталіна,— прыгадвае І. Шамякін. — Дзённік я пачынаў і раней, ёсць, напрыклад, сшытак за 1952 год, першы запіс — радасць з нагоды таго, што скончыў «У добры час», што на стале не засталося ніводнай папкі з рукапісамі — аднёс у рэдакцыі, паслаў перакладчыку. Але дзённікі тых часоў кароткія: пачынаў новы раман, аповесць — і яшчэ ўласны спыняўся. Аднак гэты запіс — «сталінскі» — самы кароткі, усяго за два дні. Усяго! І пра адно і тое ж — як мы плакалі «па вялікім і мудрым». Чаму такі кароткі запіс? Чаму я не працягваў свае перажыванні? Не было іх, перажыванняў? За два дні высахлі слёзы? Ці вельмі ж быў заняты ў пачатку «новай эры»? Не помню, каб былі нейкія асаблівыя падзеі, якія займалі б час і ўвагу сакратара партбюро. Звычайнае: жалобны мітынг, мітынг у партрымку новага кіраўніцтва, які моцна абурыў Машу (яна гэта і зараз успамінае) — абурыў тым, што, не паспеўшы пахаваць Сталіна, пачалі славіць Малянкова. Асабліва вызначыўся Павел Кавалёў. Ды і Броўка. Во закамплексаванасць была! І памыліліся. Мікіта перайграў Малянкова. На шчасце. Цяпер я ўпэўнены, што захоп улады Малянковым ці Берыя прадоўжыў бы сталінскі дэспатызм. Хоць першыя паслясталінскія рэформы (асабліва на вёсцы) народ доўга звязваў з Малянковым — пасля таго, калі «кукурузная палітыка» Хрушчова правалілася. Хадзіла пагаворка: «Быў Малянкоў — паелі і блінкоў».

Безумоўна, тады я не так думаў — да 1957 года, калі Хрушчоў разграміў «антыпартыйную групу». Але ўнутрана, інтуітыўна я адчуваў, што далей так жыць нельга, што жыццё са смерцю Сталіна не спынілася. Наадварот, набыло іншы сэнс. Дапамагаў Андрэй, найбольш Андрэй (Макаёнак — **В.Т.**), хоць хутка цверазелі і іншыя мае калегі.

Запомніліся эпізоды ў дзень смерці Сталіна. Маша разбудзіла мяне ў шэсць гадзін раніцы з рыданнямі.

«Памёр...»

Я таксама заплакаў. Сапраўды, здалося, што свет перавярнуўся, парушаны ўсе ўстоі, жыццё бурыцца, і мы ляцім у тартарары. Праз гадзіну мне пазванілі з рэдакцыі «Звязды» не з просьбай, з прапановай напісаць пра свае пачуцці ў гэты трагічны час усенароднага гора. Я ў тыя гады лёгка пісаў барабанную публіцыстыку. Былі гатовыя штампы. У такой сітуацыі штампы не падыходзілі. Жалоба патрабавала іншага стылю, іншых слоў, а іх не было: мы многа пісалі пра вайну і не навучыліся пісаць пра смерць, сацрэалізм смерць узвышаў і паэтызаваў: загінуў за Радзіму, за Сталіна!

Мы жылі на першым паверсе, і прахожыя заглядвалі ў вокны майго кабінета. Жыў тады ў Мінску рускі паэт Дзмітрый Кавалёў, ветэран Вялікай Айчыннай, мы з ім сябравалі з даваеннага часу — былі актыўнымі членамі літаб'яднання пры «Гомельскай праўдзе»: ён, Кастусь Кірэенка, Леанід Гаўрылаў былі нашымі кумірамі — іх ужо друкавалі не толькі ў Гомелі, але і ў Мінску. Пасля вайны мы зблізіліся яшчэ больш — землякі, і ваявалі ў адным месцы — Кавалёў быў мараком Паўночнага флоту. (Я напішу, як два сябры мае пасля аддалілі ад мяне гэтага чалавека).

Дзіма ў роспачы і горы ішоў да мяне ў такую рань паплакаць разам. Угледзеў праз акно, што я сяджу за сталом, пішу, і страшэнна абурыўся. Ускочыў у кватэру і ледзьве не кінуўся на мяне з кулакамі.

«Ты можаш пісаць у такі дзень! Ты знаеш, хто памёр!»

Цікава, што пасля XX з'езда Кавалёў стаў самым ваяўнічым антысталіністам, мала хто з паэтаў так скланяў «бацьку роднага», нават Еўтушэнка так не ўмеў, як імпульсіўны, гарачы марак Дзмітрый Кавалёў».

Карысна сёння, несумненна, ведаць кожнаму беларусу сваю гісторыю. Без гісторыі няма будучыні. І пра шмат каго з тых, хто быў на алімпе, хто верхаводзіў і як рабіў гэта, знаходжу цікавыя, на мой погляд, мясціны ў «Роздуме на апошнім перагоне». Што, напрыклад, уяўляў сабой першы сакратар ЦК Мікалай Сямёнавіч Патолічаў? Рускі, па агульным прызнанні — сумленны чалавек, ад сталінскай лініі ён не адступаў, але што тычыла ўнутрырэспубліканскіх гаспадарчых спраў, то вёў ён, прызнаваліся ўсе, даволі незалежную палітыку. Ведаў прамысловасць, і яна расла небывалымі тэмпамі. З сельскай гаспадаркай не атрымлівалася. У культуру не лез: разбіхайцеся, беларусы, самі. Але русафікацыяй не ціснуў, такіх акцый, як пазней зрабіў яго пераемнік К.Т. Мазураў, не рабіў: школы на рускую мову не пераводзіў.

Іван Шамякін дзеліцца сваімі ўспамінамі і ўражаннямі ад сустрэч з многімі цікавымі людзьмі, ён ствараe іх, так бы мовіць, штрыхі-вобразы, але яны запамінаюцца, вымушаюць паглядзець на таго ці іншага чалавека пад іншым вуглом зроку. Беларус, былы сакратар ЦК КПСС і рэдактар газеты «Праўда» М. Зімянін, сакратар ЦК КПБ А.Кузьмін, камандзір партызанскага атрада Лемяшонак, апаратчыкі Абросімаў, Кляшчоў, Гарбуноў, пісьменнікі з Украіны Алесь Ганчар, Васіль Казачэнка, Мікола Нагнібіда, з Расіі Аляксандр Пракоф'еў, малдаванін Іван Чабану, латыш Гунар Цыруліс, нашы класікі Янка Брыль, Іван Мележ, Аркадзь Куляшоў, Пятро Глебка і іншыя шырока вядомыя людзі насяляюць успаміны І. Шамякіна. І, вядома ж, даволі значнае месца ў нататках адводзіць пісьменнік легендарнай асобе — Пятру Міронавічу Машэраву, шкадуе, што ў свой час не напісаў пра яго дакументальную аповесць, хоць і збіраўся, але не паспеў — апярэдзілі больш спрытныя і ўвішныя, хоць усю праўду пра Пятра Міронавіча ім сказаць не ўдалося.

Цікавасць выклікаюць і тыя старонкі «Роздуму на апошнім перагоне», дзе Іван Пятровіч разважае пра сваё месца ў літаратуры, пра нялёгкі шлях да прызнання, пра тыя шпількі, падножкі, што ставіліся — так-так, і яму таксама — дзяльцамі ад літаратуры. Здзіўляецеся? Не трэба! Таленавітым людзям заўсёды было цяжка, няпроста. Шамякін не быў выключэннем.

Васіль ТКАЧОЎ.

У кантрольнай дзейнасці павінна быць больш аналітыкі і прафілактыкі

У гэтым перакананы старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Аляксандр ЯКАБСОН, які правёў у Гродне нараду з удзелам старшыні Гродзенскага аблвыканкама Сямёна ШАПІРЫ, кіраўнікоў кантралюючых і праваахоўных службаў, структур абласнога выканаўчага камітэта і шэрагу прадпрыемстваў.

Аляксандр Якабсон зазначыў, што «галаўным болем дзяржавы» з'яўляецца адмоўнае сальда гандлёвага тавараабароту і ставіцца задача ўжо да канца 2013 года выйсці на станоўчае сальда. Усе кантрольныя мерапрыемствы павінны абавязкова ўлічваць гэты фактар. Другая праблема — вялікая рэсурсаёмістасць прадукцыі, затраты энергіі, матэрыялаў. І трэцяя — дэбюракратызацыя ўсяго нашага жыцця, што, на думку Аляксандра Якабсона, «з'яўляецца сур'ёзным каменем спатыкнення па многіх кірунках нашай дзейнасці».

Якія патрабаванні да работнікаў Камітэта дзяржкантролю? Аляксандр Якабсон вызначыў чатыры якасці, без якіх немагчыма павысіць аўтарытэт гэтага органа. Прафесіяналізм. Прынцыповасць. Аб'ектыўнасць. А таксама — «не працаваць пад канкрэтнае прозвішча, асобу, а па факце парушэння». Пры гэтым Камітэт дзяржкантролю, лічыць Аляксандр Якабсон, пры ўсёй строгасці да парушэнняў заканадаўства павінен быць органам, які не толькі і не столькі карае, колькі папярэджвае; патрабуецца больш аналітыкі, прафілактыкі. Гэта асабліва важна ў сувязі з Дырэктывай № 4. Негатыў, які выяўлены ў аднаго суб'екта гаспадарання, трэба даводзіць да іншых, каб гэтага не паўтаралася.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

МЯСА І МАЛАКО З ПРЫВАТНЫХ ПАДВОРКАЎ

Некаторыя плюсуюць, але, у асноўным, — менш

Нарыхтоўчыя арганізацыі Гродзенскай вобласці летась прынялі ў фізічных асоб 17 тысяч галоў буйной рагатай жывёлы, што на 3,6 тысячы галоў (на 17,5%) менш, чым у 2009 годзе.

Паводле інфармацыі Галоўнага статыстычнага ўпраўлення Гродзенскай вобласці, аб'ёмы закупак буйной рагатай жывёлы ў параўнанні з 2009 годам павялічыліся ў Ваўкавыскім (на 29,9%), Іўеўскім (на 18,9%), Лідскім (на 3,9%) і Мастоўскім (на 3,3%) раёнах. Значна скараціліся закупкі ў Дзятлаўскім (у 2,3 раза), Слонімскім (на 39,9%), Свіслацкім (на 38,4%) раёнах. Насельніцтву фактычна выплачана за прынятую буйную рагатую жывёлу 13,9 мільярда рублёў, альбо 99,6% ад налічанай сумы.

Закупкі малака ў гаспадарках Прынямоння летась склалі 63,2 тысячы тон і ў параўнанні з 2009 годам зменшыліся на 15,4%. Прычына — скарачэнне колькасці кароў у асабістых падсобных гаспадарках. Зменшылі закупку малака ў параўнанні з папярэднім годам усе раёны вобласці. За малако выплачана 50,4 мільярда рублёў, альбо 98,6% да налічанай сумы. Сярэдні кошт аднаго кілаграма малака, закупленага ад насельніцтва, склаў 809 рублёў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Крымінал

ГАРЭЛКА-НЕЛЕГАЛКА

Брэсцкі бізнэсмен пастаўляў незаконна з Украіны папулярны ў спажыўцоў алкаголь і прадаваў яго па больш нізкіх цэнах

Мабыць, дзякуючы апошняму, кліентаў у прадпрымальнай асобы было шмат: сетка пакупнікоў увесь час пашыралася за кошт так званага «сарафаннага радыё». Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» начальнік аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама Аляксандр Ластоўскі, свой «бізнэс» 25-гадовы падазроны наладзіў дастаткова даўно: першыя нелегальныя пастаўкі ён зрабіў яшчэ ў маі 2008 года. А вось аператыўная інфармацыя наконт таго, што ён на адным са сталічных рынкаў оптам рэалізуе безакцызную алкагольную прадукцыю, паступіла да супрацоўнікаў падраздзялення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі каля двух месяцаў таму. З таго часу падпольны гандляр і трапіў «пад каўпак», а пасля, калі была праведзена дэталёвая праверка, і затрыманы. У гаражы ў Брэсце, які належыць сваяку падазронага, аператыўнікі знайшлі 80 бутэлек імпартнага спіртнога і яшчэ больш, калі былі спыненыя каналы рэалізацыі тавару ў Мінску. Увогуле праваахоўнікамі канфіскавана 414 бутэлек папулярных гатункаў украінскай гарэлкі, а таксама алкагольнай прадукцыі, што рэалізуецца праз гандлёвую сетку «Д'юці-Фры», коштам на суму больш як 27 мільёнаў рублёў.

Ігар ГРЫШЫН.

ЗЯЦЬ СУСТРЭЎ ВЕТЛІВА...

У в. Рэпічы (Баранавіцкі раён) 63-гадовы мужчына зайшоў да свайго зяця, які ветліва сустрэў цесця. А далей — як заўсёды.

Пасля застолля зяць, які ўжо быў раней асуджаны, пачаў збіваць пенсіянера, які і памёр ад цяжкіх траўмаў тут жа ў хаце. Забойцу затрымалі.

ЗДАЎ У НАЁМ...

Жыхар Баранавічаў заявіў у міліцыю, што злодзей падабраў да замка ключ і ўкраў з арандаванага гаража «Опель».

Пазней супрацоўнікі ДАІ знайшлі пашкоджаную аўтамашыну на адной з вуліц горада. Следства ўстанавіла, што злодзею не трэба было падбіраць ключ. «Опель» скраў гаспадар гаража.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Марыя ЖУКАВА:

27 студзеня — Дзень памяці ахвяр Халакосту

«МЯНЕ АБЗЫВАЛІ, а я ўсё жыццё даказвала, што я — беларуска...»

...Аб тым, што яна яўрэйка, Марыя Іосіфаўна Жукава даведалася толькі ў пачатку 1990-х. На той час жанчына пражыла ўжо 50 вёснаў.

— У дзіцячым доме мне казалі, што я была ў Трасцянцы, што і бацькі ў мяне загінулі там. А пасля высветлілася, што не ў Трасцянцы, а ў гета. Я была падкінутая ў дзетдом, калі мне было тры гады, я нічога пра сябе не ведала. Прозвішча мне далі там жа, імя па бацьку — таксама: усе мы былі Іосіфаўны, Іосіфавічы (як тады казалі, наш бацька — Сталін). А з Мусі я стала Марыяй. Хоць у душы я адчувала, што нешта не так, бо яшчэ ў дзетдоме мяне абзывалі... Як зараз памятаю: плачу, нясу пасведчанне аб нараджэнні і паказваю: я — беларуска!.. Тата па дакументах — Іосіф Мікалаевіч, мама — Вольга Мікіцічна... І ўсё жыццё я даказвала, што беларуска.

А ў пачатку 90-х мне пазванілі з дзетдома і адкрылі праўду: знайшліся дакументы, дзе пацвярджалася маё паходжанне. З таго часу я пачала «заяваць» за сваю нацыянальнасць. І толькі ў 2000 годзе мне выдалі новае пасведчанне аб нараджэнні: Марыя Жукава, нацыянальнасць — яўрэйка.

«Аблавы заўсёды адбываліся ўначы: прыязджалі немцы і, шукаючы яўрэйскіх дзяцей, крычалі: «Юда, юда...»

— Нарадзілася я ў 1939 годзе ў Мінску, дзень нараджэння не ведаю, мне яго ўвогуле пазначылі толькі ў 16 гадоў, калі выдавалі пашпарт... Як высветліў суд, бацькі мае загінулі ў гета. Мая мама ведала, што будзе пагром. Яна і перадала мяне праз калючы дрот камусьці, хто падкінуў мяне ў дзіцячы дом. У мяне ніхто не выжыў. Я адна на ўсім белым свеце...

— Якія ўспаміны звязаныя з дзіцячым домам?

— Вельмі цяжка было. У нас у дзетдоме звыш 50 працэнтаў дзяцей-яўрэяў было, паводле нашых падлікаў — і ўвогуле ўсе 80. Кантынгент — ад грудных дзяцей да 12-13—гадовых. Усяго чалавек дзвесце, па іншых звестках — нас налічвалася да пяцісот. Дырэктар дзетдома пабралася шлюбам з немцам, начальнікам гарадской управы, званіла туды: прыйдзіце, у нас ёсць яўрэйскія дзеці. І ў нас адбываліся аблавы. У дзве-тры гадзіны ночы. Дзяцей лавілі, грузілі ў машыны і вывозілі ў невядомым кірунку. Каго — у гета, каго — адразу на знішчэнне. Сярод дзяцей траплялася і ўкраінцы, і беларусы... Бо няважна хто, калі ты чорненькі, кучаравенькі — значыць, яўрэй. Прама з ложкаў забіралі — у машыну і вывозілі невядома куды. Мы хаваліся. Дзякуючы гэтаму многія ўратаваліся. У мяне блакітныя вочы — пры першым паглядзе адразу і не вызначыш, тым больш што я была дзіцем...

Супрацоўнікі дзетдома нас ратавалі, хавалі пры аблавах. А аблавы былі вельмі часта. Некалькі машын з дзецьмі звезлі ў Германію... Гэта заўсёды адбывалася ўначы: прыязджалі немцы і шукаючы яўрэйскіх дзяцей, крычалі: «Юда, юда...»

Была ў нас такая Вялічка Ганна Мікалаеўна, у яе было двое дзяцей, яна працавала нянечкай. Яна нас то пад ложкам дзе-небудзь схавае, то за дзвярыма, то да сябе дадому вадзіла, хаваліся мы і ў бульбоўніку.

«Даведаўшыся пра брата, сёстры плакалі, крычалі і рвалі валасы на сабе — яму было толькі тры годзікі...»

— У нашым доме працавала цёця Дуся, я не памятаю дакладна, кім яна працавала: хтосьці кажа — выхавальнікам, хтосьці — нянечкай. Пры ёй быў маленькі хлопчык — яе дзіцятка. Не было з кім пакінуць — дык яна з ім прыходзіла на працу. Яна таксама хавала дзяцей пры аблавах. Фашысты забілі яе прама на нашых вачах. Побач было яе дзіця, спужаны паўтарагадовы хлопчык яшчэ доўга нічога не разумеў. «Мама, мама!» — плакаў ён.

Памятаю хлопчыка Лаўранкова, тры годзікі яму было. Дзве яго сястры светленькія, а ён чорненькім удаўся... Сёстры даведаліся пра яго лёс толькі ў 1992 годзе, калі на трактарным заводзе праходзіў злёт былых выхаванцаў дзіцячых дамоў усіх пакаленняў; і толькі там яны даведаліся пра брата. Што там адбывалася! Яны плакалі, крычалі і валасы на сабе рвалі...

«А можа, вы дачка ворага народа? Хіба можна такое гаварыць дзіцяці, якое ў тры годзікі засталося круглай сіратой!?!»

У дзіцячым доме Марыя Жукава прабыла да 1948 года. Дзецям не дазвалялася свабодна выходзіць на вуліцу, таму дзень Перамогі жанчына не памятае. У дзевяць гадоў яе паравялі ў дзіцячы дом № 12. А калі дом расфарміравалі, 15-гадовую Марыю разам з іншымі дзяўчатамі накіравалі на працу ў горад Азбест Свярдлоўскай вобласці.

— У мяне былі хворыя ногі, я не прайшла камісію і мяне вярнулі. Спрабавала ўладкавацца на працу — ніхто не браў, 15 гадоў — нават пашпарта не было... Пазней вучылася на краўца ў Ждановічах, дзе і працавала — шыла целагрэйкі, рукавіцы... Але пачала слепнуць, і мне забаранілі працаваць. Вярнулася ў Мінск.

Чаго я не наслухалася тады: а можа, вы дачка ворага народа, а можа, паліцая. А я ў тры годзікі засталася круглай сіратой! Неяк уладкавалася на працу ў ваенкамат машыністкай. Далі месца ў інтэрнаце. Пасля, дзесьці ў 1964-м, мне ваенкамат дапамог з кватэрай — выдзелілі асобную аднапакаёвую. Але дзе той розум: я пайшла, расплакалася — што дзетдомаўка, што прывыкла ў калектыве, што не магу адна...

Яны ўзрадаваліся і далі мне пакой з агульнай кухняй з хранічным алкаголікам. Калі я апамяталася, было ўжо позна. Вось тады я нацярпелася! У выніку дзіцячыя дамы мяне адстаялі, і толькі ў 1980-м я атрымала новую — сваю — кватэру. Я ўжо і замужам была, і дачушцы маёй 10-ы годзік пайшоў...

* * *

...Я чула пра тыя сутычкі ў Расіі. Нацыяналісты. Колер скуры, колер валасоў не той ці нос не такі — такіх людзей яны ненавідзяць. Нянавісць — вось што перашкаджае чалавеку любіць іншага чалавека. Не варта дзяліць людзей — трэба паважаць адно аднаго. І, вядома ж, не трэба дапусціць, каб тое, што адбылося тады, калі-небудзь паўтарылася.

Пасля размовы Марыя Іосіфаўна папрасіла прабачэння за сваю памяць:

— Магчыма я нязвязна нешта расказвала. Вы ж мне даруйце. Мяне ў дзетдоме аднойчы моцна збілі. Мне тады было чатыры, і я несла нейкую пахлёбку перад сабою. Спатыкнулася і незнарок перакуліла тую пахлёбку. Білі мяне і розгамі, і рукамі па галаве, па нагах, па целе... З таго часу ў мяне пачалі з'яўляцца правалы ў памяці. Я заўсёды баялася выступаць, бо з мяне смяяліся.

Сёння Марыя Іосіфаўна жыве разам з мужам, абое на пенсіі, іх дачка — прафесійная мадэль, жыве ў ЗША.



Сёння ў Гістарычнай майстэрні ў Мінску пройдзе прэзентацыя кнігі Марыі Жукавай «Вайна прычыняе мне боль». Кніга распавядае пра ўмовы ўтрымання дзіцячых дамоў у пасляваенным Мінску, змяшчае фотаілюстрацыі, спісы былых дзетдомаўцаў.

Ілья ЛАПАТО.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ і з архіва М. ЖУКАВАЙ.

ХАДАВЫЯ КВАТЭРЫ Ў ВЯЛІКІМ ДЭФІЦЫЦЕ

Арэнда жылля

Стандартныя па якасці і не вельмі дарагія кватэры Мінска здаюцца ў арэнду на працягу некалькіх гадзін

На сталічным рынку арэнды жылля ўжо амаль на працягу двух месяцаў назіраецца сур'ёзны недахват практычна ўсіх відаў кватэр. Падобная сітуацыя складвалася традыцыйна ў апошнія 2—3 тыдні года, а потым у студзені на рынак «выкідвалася» вялікая колькасць розных аб'ектаў жылля: нерухомасці па лініі доўгатэрміновай арэнды. Сёлета гэтая тэндэнцыя ўжо не працуе, бо ліквідных кватэр на рынку ўвогуле амаль няма.

Прапанова не задавальняе попыт

Сёння самае таннае арэнднае жыллё магчыма адшукаць толькі за 200 долараў у Заводскім раёне ў старым пяціпавярховым доме. Гэта будзе маленькая аднапакаёвая кватэра ўвогуле без мэблі, або з мэбляй савецкіх часоў. Звычайныя стандартныя кватэры ў спальных раёнах ці не вельмі далёка ад метро, коштам 230—250 долараў «знаходзяць» сабе новых гаспадароў праз агенцтвы ўсяго за некалькі гадзін.

Паводле інфармацыі **агента па аперацыях з жыллёвай нерухомасцю агенцтва нерухомасці «Дзінас» Іны КУЛЬШЫ**, цяпер на сталічным рынку арэнды назіраецца самая мінімальная прапанова за апошнія 5—7 гадоў. У гэтым агенцтве па стане на апошні аўторак студзеня было 22 кватэры, але гэта, галоўным чынам, дарагія кватэры ў цэнтры за 400—550 долараў.

Так, сярэдні кошт арэнды **аднапакаёвых** кватэр складае 250 долараў, аднак... Сёння вельмі кемлівыя гаспадары кватэр хутка зразумелі, што арэнднага жылля ў Мінску не хапае, таму побач з метро цэннік аднапакаёвак усё часцей дасягае 260—300 долараў. Па такім кошце кватэры здымаюцца толькі ў тым выпадку, калі ў ёй ёсць сучасная мэбля, а таксама адносна новыя пральная машына, тэлевізар і халадзільнік. Аднак кватэр з такім «наборам камфорту» сёння амаль няма.

Мінімальны кошт **двухпакаёвых** кватэр без мэблі ў старых дамах складае 250 долараў. Сярэдні цэннік двухпакаёвак складае 300, а побач з метро 350 долараў. Якасных хадавых кватэр па такім цэнніку засталося няшмат. А вось у цэнтральных раёнах Мінска якасныя двухпакаёвыя кватэры каштуюць ужо 600—700 долараў.

Самыя танныя **трохпакаёвыя** кватэры магчыма адшукаць у новабудоўлях за 300 долараў або ў старых дамах, але ўжо без мэблі. Звычайна стандартныя трохпакаёвыя кватэры здаюцца па кошце двухпакаёвак. Аднак якасныя трохпакаёўкі з сучаснай бытавой тэхнікай недалёка ад лініі метро прапануюцца за 400—500 долараў. Сярэднія па якасці трохпакаёвыя кватэры ў цэнтры Мінска каштуюць да 700—750 долараў, а шматпакаёвыя кватэры эліт-класа — да 1300—1500 долараў. Самыя дарагія шматпакаёвыя кватэры Мінска прапануюць за 2—2,5 тысячы долараў. Адразу заўважу, што дарагія кватэры шукаюць сабе гаспадароў даволі доўга.

У лютым прапанова павялічыцца?

Спецыялісты сталічнага рынку арэнды спадзяюцца, што ўжо праз два—тры тыдні колькасць стандартных кватэр у арэнду павялічыцца. Справа ў тым, што на навагоднія святы шмат кватэр здаваліся па добрым кошце менавіта на кароткі тэрмін. Цяпер гэтае жыллё павінна зноў трапіць на рынак. Сёння ў агенцтваў шмат заказаў, калі патэнцыйныя кватаранты гатовыя плаціць за аднапакаёўку 250 долараў, за двухпакаёўку — 300, а трохпакаёўку — да 350 долараў. Новыя спецыялісты і маладыя сем'і здымаць даражэйшыя кватэры проста не змогуць.

Калі гаспадары будуць павялічваць кошт сваіх паслуг, тады кватаранты пачнуць шукаць таннейшае жыллё ў невялікіх гарадках побач з Мінскам. Так, сёння добрая трохпакаёвая кватэра ў Астрашыцкім Гарадку каштуе 200 долараў. Вельмі якасная трохпакаёўка з сучаснай бытавой тэхнікай у Навінках прапануецца за 300 долараў. Крыху таннейшыя чым у сталіцы кватэры існуюць і ў Бараўлянах. Спадарыня Кульша ўпэўненая, што бліжэй да вясны на сталічным рынку з'явяцца і сезонныя кватэры, кошт арэнды на якія будзе крыху ніжэйшы за рыначны.

Не трэба купляць ката ў мяшку

Апошнім часам на інтэрнэт-рэсурсах пачалі з'яўляцца рэкламныя паведамленні не зусім добрасумленных агенцтваў, якія прапануюць кліентам неіснуючыя цэннікі даволі ліквідных кватэр. Напрыклад, сёння кватэр уздоўж лініі метро за 200 долараў няма. А вось па рэкламе такое жыллё ёсць. Праўда, падобныя агенцтвы прапануюць сваім кліентам за 175 тысяч толькі прадастаўленне інфармацыі, якая не заўсёды бывае свежай. Лепш звяртацца ў салідныя агенцтвы нерухомасці. Яны за 350 тысяч заключаюць дагаворы, па якіх плаціць трэба толькі па факце засялення.

Сяргей КУРКАЧ.

У «ЖДАНОВІЧАХ» ЎЗАРВАЎСЯ БАЛОН

Выбух прагрымеў у гандлёвым павільёне індывідуальнага прадпрымальніка

Здарэнне, паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, зафіксавана на пачатку адзінацатай раніцы ў аўторак: на тэрыторыі радыёрынка ТАА «Гандлёвы дом «Ждановічы» у адным з драўляных павільёнаў, які абшыты металапрофілем, пачаўся пажар. Паводле папярэдніх звестак, прычынай загарання стала парушэнне правілаў эксплуатацыі газавых прыстасаванняў і агрэгатаў (5-літровы газавы балон і газавы абагравальнік). Калі агонь у павільёне дабраўся да балона з газам, апошні ўзарваўся. На шчасце, у выніку выбуху ніхто не пацярпеў.

НОЎТБУК СА «ЗНІЖКАЙ»

Зламыснікам удалося выкрасці з магазіна новы ноўтбук, які яны «скінулі» на рынку па сімвалічнай цане

Так, паводле звестак прэс-афіцэра Маскоўскага РУУС Таццяны Грыб, пры кошце ноўтбука каля 4 мільёнаў рублёў, зладзеі прадалі яго ўсяго за 300 долараў ЗША. «Вызначыліся» ж жыхар Баранавічаў і мінчанін, якія, знаходзячыся ў гандлёвай зале аднаго са сталічных магазінаў бытавой тэхнікі, заўважылі, што адзін з ноўтбукаў не прымацаваны да прылаўка. Спакусіўшыся на лёгкую здабычу, яны пачалі дзейнічаць: пакуль адзін з «дуэта» адцягваў увагу прадаўца, другі схаваў ноўтбук пад куртку і пайшоў да выхаду. І хоць зладзеям удалося знікнуць з месца здарэння, праваахоўнікі ўсё адно іх адшукалі і затрымалі. Вернуты ў магазін і тавар, які яны «спіхнулі» на адным з рынкаў. Між іншым, адзін з падазроных, 32-гадовы жыхар Баранавічаў, раней ужо быў судзімы — за крадзеж і захоўванне наркотыкаў.

Ігар ГРЫШЫН.

ЗВЯЗДА 27 студзеня 2011 г.

Скідзельскі цукровы камбінат — ПЕРШЫ НА ПРАЦЯГУ 60 ГАДОЎ!

У гэтым складскім памяшканні захоўваецца да пятнаццаці тысяч тон цукру.

(Працяг. Пачатак на стар. 1.)

— Натуральна, што ўсе працэсы на нашай вытворчасці цалкам аўтаматызаваныя, камп'ютарызаваныя, і кантраляваць вытворчасць у рэжыме рэальнага часу можа не толькі аператар асобнага апарата, але і галоўны тэхнолаг, начальнік змены, галоўны інжынер, а таксама генеральны дырэктар, — сказаў Андрэй Адамавіч.

Ён жа расказаў і пра планы па рэканструкцыі і мадэрнізацыі на 2011 год, а таксама на бліжэйшую пяцігодку:

— Сёлета мы паставім новую цукрасушку, абсталяванне для гэтага ўжо закуплена. Акрамя цукрасушыльнага комплексу мы збіраемся пачаць будаўніцтва склада бястарнага захоўвання цукру. У нас зараз ёсць сілас на 15 тысяч тон, пабудаваны ў 1998 годзе, а мы побач паставім яшчэ адзін такі, але ўжо на 60 тысяч тон. Гэта нам дазволіць пазбегнуць выдаткаў пры захаванні цукру ў выпадку нейкіх форс-мажорных праблем з адгрузкай. Акрамя таго, мы зможам падзяляць асобна цукар з буракоў і з цукру-сырцу, каб не было потым праблем у нас і ў нашых кліентаў. Дарэчы, хоць наш стары сілас і разлічаны на 15 тысяч тон цукру, гэта не значыць, што ён цалкам запоўнены: сёння цукар запатрабаваны, і ён стаіць пусты, але наяўнасць такіх збудаванняў бястарнага захоўвання дазваляе камбінату пры адсутнасці вагонаў ці падчас калядных вакацый працаваць, не зніжаючы прадукцыйнасці пэўны час, бо цукар можна загружаць у сіласы.

Намеснік генеральнага дырэктара па маркетынгу Дзмітрый КАНЕВІЧ.

Разам з новым сілосам будзе пабудаваная і новая фабрыка фасоўкі:

— У нас і цяпер вельмі разнастайная ўпакоўка і варыянты фасоўкі, але новая фабрыка дазволіць нам прывесці саму лагістыку фасоўкі да добрага еўрапейскага ўзроўню, зрабіць для людзей сучасныя раздзвальні, душавыя, пакоі для адпачынку і прыёму ежы, бо персанал там працуе па зменах круглыя суткі. Нашы існуючыя фасовачныя лініі досыць новыя, італьянскія, таму мы іх проста пераставім у новую фабрыку фасоўкі. Такім чынам, хутка ў нас з'явіцца рэзерв на выпадак таго, калі мы раптам захочам павялічыць асартымент ці колькасць прадукцыі, — лічыць Андрэй Адамавіч.

Скідзельскі цукровы камбінат мае даволі амбіцыйныя планы па нарошчванні вытворчасці — ці не сціскае новае абсталяванне гэтых планаў? Як адназначна заявіў Андрэй Аленскі, кіраўніцтва завода прадбачыла і далейшае развіццё прадпрыемства і зрабіла адпаведныя захады:

— Наша кіраўніцтва прыняло такое рашэнне: усё абсталяванне набываецца з запасам — каб не проста яго потым выкідваць і замяняць на новае, а каб нешта дадаць у паралельны ці паслядоўны ланцужок і такім чынам павялічыць вытворчасць. Так што, тут мы праблемы ніякай не бачым — дасягненне планкі ў 10 тысяч тон перапрацоўкі цукровых буракоў за суткі запатрабуе вялікай працы, але гэта цалкам выканальна, і мы гэта зробім. Запас для развіцця па мыйным аддзяленні ў нас ёсць, паставіць яшчэ некалькі рэзак буракоў магчымасць ёсць, транспартная сістэма дазваляе падаваць і болей, дыфузійнае аддзяленне таксама маем магчымасць рэканструяваць да патрэбнай магутнасці, — лічыць Андрэй Адамавіч. — У прынцыпе, канцэпцыя ўнутранага развіцця ў нас на камбінаце распрацаваная, мы яшчэ раз усё пралічым, прадумаем і дзе-небудзь у ліпені аддадзім абгрунтаваную канцэпцыю развіцця на ўзгадненне ў наш канцэрн Белдзяржхарчпрам. Што тычыцца канцэпцыі развіцця да 2015 года, то тут, калі казаць у двух словах, пажаданні ўрада і думкі кіраўніцтва камбіната супадаюць. Бо сёння сітуацыя складваецца такая, што калі мы не паспеем за бліжэйшыя некалькі гадоў правесці рэканструкцыю, нарасціць магутнасці, то мы можам згубіць канкурэнтаздольнасць. Бо цэны на энергарэсурсы растуць, і нам трэба нарошчваць вытворчасць, каб выдаткі на адзінку прадукцыі былі меншыя.

Вытворчасць лімоннай кіслаты — адзіная ў Беларусі

Сваёй рэканструкцыі чакае і цэх па вытворчасці лімоннай кіслаты. Ён быў запушчаны ў 1961 годзе. Сёння лімонную кіслату ў Беларусі вырабляюць толькі на Скідзельскім цукровым камбінаце. Дый, дарэчы, на прасторах СНД канкурэнтаў «лімонкі» няшмат: яшчэ адна вытворчасць ёсць у расійскім Белгарадзе.

— Цяпер настаў час правесці рэканструкцыю цэха па вытворчасці лімоннай кіслаты, і гэтым пытаннем мы ўшчыльную займаліся ў 2010 годзе: акрамя сваіх спецыялістаў, прыцягнулі на тэндарнай аснове і замежныя кампаніі з Расіі, Украіны, а таксама еўрапейскага лідара — аўстрыйскую кампанію Фагельбуш. Аўстрыйцы як добрыя спецыялісты прапанавалі не тое каб рэвалюцыйную, але цалкам зразумелую з тэхнічнага і тэхналагічнага пункту гледжання канцэпцыю развіцця вытворчасці: пры мінімальных сродках і пры максімальным выкарыстанні ўжо існуючага абсталявання павялічыць вытворчасць лімоннай кіслаты з 1,6 да 2,5 тысячы тон за год. Аднак пры перапрацоўцы меласы (патакі) трэба было б ужываць шмат спецыфічных рэчываў, якія б далі нашай вытворчасці дадатковыя выкіды і пахі. Таму, хутчэй за ўсё, мы спачатку ў наступным годзе закупім абсталяванне, усталюем новую выпарную станцыю, сістэму фільтрацыі, камунікацыі, наладзім неперарыўны працэс вытворчасці, а толькі потым будзем думаць далей — ці не выкарыстоўваць для вытворчасці крухмал, бо меласа запатрабаваная і для рэалізацыі на экспарт. А асноўнае, што дасць нам рэканструкцыя цэха па вытворчасці лімоннай кіслаты, — гэта зніжэнне сабекошту прадукцыі прыкладна на 30%, — патлумачыў намеснік галоўнага інжынера.

На складзе цукру-сырцу.

Намеснік генеральнага дырэктара па сыравіне Сяргей КУЛІКОЎСКІ.

Энергія і экалогія: эканоміць тут пры рэканструкцыі нельга

Вельмі важнай задачай для працы цукровага камбіната ва ўмовах пастаяннага росту цэн на энергарэсурсы з'яўляецца рэканструкцыя цеплаэлектрацэнтралі, тым больш што спажыўцамі энергіі і цяпла з'яўляецца не толькі сам камбінат, але яшчэ і суседнія прадпрыемствы, а таксама пасёлак:

— Нам зараз трэба рэканструяваць сваю ЦЭЦ. Але, на жаль, ні Беларусь, ні Расія не маюць адпаведных тэхналогій заходнееўрапейскага стандарту, таму нам, відаць, давядзецца карыстацца паслугамі заходніх фірмаў: набываць фінскія або нямецкія катлы, а турбіны і генератары ўжо ставіць расійскія. Абсталяванне гэтае ўсё нятаннае, праектныя работы таксама, але рабіць гэта трэба, — тлумачыць Андрэй Аленскі. — Таму мы яшчэ раз усё пралічым, і з пачаткам наступнага года пачнём рэалізоўваць гэты праект — на працягу некалькі гадоў пабудуем новую ЦЭЦ, а старую закрыем.

Шмат увагі на Скідзельскім цукровым камбінаце надаюць пытанням экалогіі. У прыватнасці, зараз аб'яўлены тэндар на будаўніцтва станцыі ачысткі сцёкавых водаў коштам у 12 мільярдаў рублёў. Чым выкліканая такая неабходнасць, тлумачыць намеснік галоўнага інжынера Андрэй Аленскі:

— На жаль, усе госці Скідаля мяркуюць, што толькі наш цукровы камбінат з'яўляецца шкоднікам экалогіі. А насамрэч у нас няма нейкіх шкодных выкідаў: мы нічога цішком не хаваем і не знішчаем. Так, у нас адпрацаваная транспарцёрна-мыйная вада скідваецца на палі фільтрацыі, але потым мы частку яе вяртаем назад у вытворчасць. А астатняя вада мо на працягу года адстойваецца, праходзіць праз сістэму адстойнікаў, і калі паказчыкі вады становяцца нармальнымі, скідваецца ў раку. Ну а сёлета мы ўжо на 100% распрацавалі праект станцыі ачысткі сцёкавых водаў — сёлета выдаткоўваецца 5 мільярдаў на пачатак будаўніцтва такой станцыі: зрабіць пляцоўку, замяніць камунікацыі, трубаправоды, зрабіць схему электразабеспячэння і гэтак далей. Ну а ўжо ў 2012 годзе мы пачнём будаваць саму станцыю ачысткі з атрыманнем біягазу — і такім чынам вырашым праблемы ачысткі. Новая станцыя будзе працаваць 4 месяцы з намінальнай вытворчасцю, а ў міжсезонне будзе працаваць, выкарыстоўваючы назапашаную за некалькі дзесяцігоддзяў ваду: на працягу прыкладна 5 гадоў мы перапрацуем увесь той бруд, што назапасіўся за 60 гадоў — і накапляльныя сажалкі стануць дастаткова чыстыя. Затым станцыя будзе працаваць толькі падчас сезона па перапрацоўцы цукровых буракоў — 4 месяцы за год.

У інжынера-тэхнолага Святланы ПАЗНЯКОВАЙ адказная пасада: яна працуе на галоўным шчыце кіравання вытворчасцю.

Складанасць пры правядзенні рэканструкцыі — гэта абмежаванасць тэрыторыі, дзе можна было б развярнуцца:

— Мы не можам выйсці за межы існуючай тэрыторыі камбіната, і тут маем пэўныя праблемы. Зразумела, калі б будаваць новы завод на пустой пляцоўцы, то можна было б усё скампанаваць і зрабіць неяк па-іншаму, але мы стараемся выходзіць са становішча. Напрыклад, на той пустцы, дзе мы збіраемся будаваць новы сілас, праходзіць шмат камунікацый, якім па 50-60 гадоў: каналізацыя, водазабеспячэнне, кабельныя сеткі. Так што давядзецца выкручвацца, пераносіць іх, рабіць абходныя маршруты, — дзеліцца варыянтам вырашэння праблемы намеснік галоўнага інжынера.

Сёння, як запэўніў Андрэй Адамавіч, на Скідзельскім цукровым камбінаце састарэлых тэхналогій няма — завод адпавядае па ўсіх станцыях заходнееўрапейскаму ўзроўню. Што, дарэчы, пацвярджаюць і замежныя дэлегацыі, якія час ад часу прыязджаюць на камбінат:

— За апошні год, скажу па шчырасці, у нас было процьма дэлегацый. Наша кіраўніцтва нават арганізавала для спецыялістаў завода курсы англійскай мовы, каб мы маглі больш-менш весці гутаркі з замежнымі гасцямі. Безумоўна, для таго, каб параўнаць нашу вытворчасць і іх заводы, то трэба было б з'ездзіць да іх у госці. Але ў любым выпадку яны прызнаюць, што за апошні час усе беларускія цукровыя заводы зрабілі крок наперад. І сёння мы нават у чымсьці маем лепшую вытворчасць, чым тыя ж палякі ці чэхі, — расказвае Андрэй Аленскі.

Напрыканцы нашай гутаркі Андрэй Адамавіч сказаў, што журналісты «Звязды» прысутнічаюць, калі можна так сказаць, у гістарычны момант: сёлета апошні год, калі можна ў адкрытую сфатаграфаваць гатовы цукар, які ідзе па стужцы транспарцёра: пасля рэканструкцыі гэтага ўчастка вытворчасці ўсе транспарцёры будуць закрытыя, каб выключыць усе магчымыя кантакты гатовага прадукту з навакольным асяроддзем. Хоць і сёння скідзельскі цукар адпавядае ўсім патрабаванням якасці, але што зробіш — такія тэндэнцыі на рынку, і каб не згубіць пакупнікоў і канкурэнтаздольнасць, трэба быць у першых шэрагах.

«Першы беларускі цукровы завод» — наш слоган

З пытанняў рэканструкцыі мы пачалі гутарку і з **намеснікам генеральнага дырэктара па маркетынгу Дзмітрыем КАНЕВІЧАМ:** што дасць будаўніцтва новага сілосу, фабрыкі фасоўкі і рэканструкцыя вытворчасці лімоннай кіслаты?

— Пасля будаўніцтва будзем павялічваць аб'ём фасаванага цукру, паставім дадатковую лінію па фасоўцы, бо па расфасаваным у папяровыя пакеты па 1 кілаграме ў Беларусі ёсць сур'ёзныя перспектывы для росту. Сёння мы маем пэўныя праблемы са складскімі памяшканнямі, бо месца нам хапае толькі размясціць 2-сутачную магутнасць фасоўкі. Мяркуем, што з будаўніцтвам фабрыкі фасоўкі такая праблема вырашыцца: месца будзе болей, і мы зможам размясціць хаця б 5-дзённы запас. Што тычыцца лімоннай кіслаты, то з павелічэннем амаль у два разы яе аб'ёму вытворчасці плануем зніжэнне яе сабекошту, каб «лімонка» стала рэнтабельнай і магла супернічаць з таннай кітайскай. У любым выпадку лімонная кіслата — прадукт запатрабаваны, бо галіна яе прымянення — вялізная: гэта харчовая прамысловасць, кансерваванне, вытворчасць цукерак, а таксама хімічная прамысловасць, — лічыць Дзмітрый Каневіч.

Сёння ў Скідзельскага цукровага камбіната самы шырокі спектр выпускаемай прадукцыі па відах упакоўкі: цукар фасуецца і ў мяхі па 50 кілаграмаў, і ў ламінаваныя пакеты па 5 і па 3 кілаграмы, і ў папяровыя пакеты па 1 кілаграме, і па 5 грамаў у так званыя сцікі, і прэсаваны цукар па 1 кілаграме. Як расказаў Дзмітры Каневіч, у перспектыве яны плануюць яшчэ наладзіць фасоўку па 25 кілаграмаў — такі фармат будзе вельмі зручны для пакупнікоў у перыяд масавых нарыхтовак, калі пяцідзесяцікілаграмовага меха зашмат, а пяцікілаграмовага мала. Акрамя непасрэдна цукру, як было ўжо напісана раней, на камбінаце вырабляюць лімонную кіслату, а таксама жамерыны сухія бураковыя грануляваныя, меласу і дэфекат.

Дарэчы, з усяго вырабленага на камбінаце цукру толькі прыкладна 15 % фасуецца ў дробную тару, а асноўная частка прадаецца ў мяхах на 50 кілаграмаў. Што тычыцца экспарту, то недзе палова цукру пастаўляецца за межы Беларусі: напрыклад, у 2010 годзе 37,5 тысячы тон было адпраўлена ў Расію, больш за 10 тысяч тон у Кыргызстан, амаль 10 тысяч тон у Казахстан, столькі ж ва Узбекістан, 1 тысяча тон у Літву, 26 тысяч тон ва Украіну і 2 вагоны (128 тон) у Манголію.

— Што тычыцца аб'ёму продажаў у Расію, то там мы дзейнічаем згодна з дамоўленасцю: на 2010 год нам выдалі квоту ў 150 тысяч тон на 4 беларускія заводы (па 37,5 тысячы тон),



Расфасоўку цукру праводзяць з улікам жаданняў пакупніка. Камусьці спатрэбіцца цукар у мяхах, хтосьці набудзе маленькія пакецікі, разлічаныя на шклянку гарбаты ці кавы.

Намеснік галоўнага інжынера Андрэй АЛЕНСКІ.

На станцыі фільтрацыі бураковага соку.

Аператар Аляксандр МАЗАЛЕЎСКІ сочыць за дзейнасцю аўтамата для ўпакоўкі цукру.

Старшы лабарант Людміла ШЭЛЕПАВА — адна з тых, каму даручаны кантроль за якасцю прадукцыі.

1961-2011 цэх лімоннай кіслаты

Гэтыя фотаздымкі зроблены ў цэху па вытворчасці лімоннай кіслаты. З абсталяваннем і прадукцыяй нас пазнаёмілі апаратчык Жанна ХАРЫТОНАВА і начальнік цэха Аляксандр ПЕТУШОК.

а на 2011 год — ужо 200 тысяч тон (па 50 тысяч тон на кожны беларускі цукровы завод). У іншых жа краінах продажы рэгулююцца, зыходзячы з попыту і прапаноў. Наша задача на 2011 год — захаваць рынкі збыту і нарасціць продажы ў Казахстане, бо якраз сёлета мы разам з іншымі беларускімі цукровымі заводамі плануем адкрыць там гандлёвае прадстаўніцтва. Аналагічная праца вядзецца і наконт Грузіі, а на сёння прадстаўніцтвы беларускіх цукарнікаў дзейнічаюць у Расіі, Кіргізіі і ва Украіне, — расказвае Дзмітрый Каневіч.

— Ці збіраемся прабівацца на рынкі ЕС і ЗША? Па-першае, пастаўляць цукар далёка ад месца вытворчасці немэтазгодна з-за вялікіх транспартных выдаткаў. А па-другое, што тычыцца Еўрасаюза, то яны закрытыя ў сувязі з кваціраваннем, нас туды не пусцяць.

Дарэчы, цукар, які пастаўляецца на экспарт, трохі абязлічаны — туды ён пастаўляецца як беларускі, а толькі тут, у Беларусі, калі мы прыходзім у краму і выбіраем цукар, мы можам бачыць, на якім заводзе яго зрабілі:

— Паколькі наш камбінат на Беларусі ў пасляваенны час быў самы першы, то мы паўсюды выкарыстоўваем слоган «Першы беларускі цукровы завод». А сіня-белае афармленне ўпакоўкі шмат гадоў назад распрацавалі дызайнеры, кліент да такой каляровай гамы ўжо прызвычаіўся і ўпакоўку мы не мяняем — мы лічым, што яна найбольш прывабная і добра запамінаецца, — лічыць Дзмітрый Іванавіч.

Шмат скідзельскага цукру спажываюць і беларускія прадпрыемствы: асноўнымі партнёрамі Скідзельскага цукровага камбіната з'яўляюцца «Чырвоны харчавік», «Камунарка», «Чырвоны Мазыранін», а таксама гандлёвыя арганізацыі — «Белбакалея», «Мінбакалеягандаль», гомельскі «Цукаргандаль», гродзенская і віцебская «Бакалеі» і іншыя.

Скідзельскі цукар — якасны цукар

Як адзначыў намеснік генеральнага дырэктара па маркетынгу Дзмітрый Каневіч, якасць скідзельскага цукру — на высокім узроўні:

— Беларускі цукар мае вельмі высокую якасць — гэта і па ацэнках спажыўцоў, і па ацэнках спецыялістаў. Напрыклад, вельмі высокія патрабаванні да якасці існуюць у буйных міжнародных кампаній — скажам, у «Кока-Колы» і «Хайнц» (вырабляе кетчупы, маянэзы, соусы). Мы рэгулярна праходзім іх атэстацыю і пастаўляем туды свой цукар. Так што гэта сведчыць пра тое, што цукар у нас сапраўды высокай якасці, — сказаў Дзмітрый Каневіч.

Больш падрабязна пра якасць скідзельскага цукру нам расказала **Святлана ШУРПА, в. а. галоўнага тэхнолага:**

Аператару Рыгору КАЛМЫКОВУ даручаны магутныя цэнтрыфугі для фугоўкі цукру.

— Цукар мы выпускаем у адпаведнасці з ДАСТ 21-94: прадукцыя ў нас высокай якасці, прэтэнзій і рэкламацый з боку спажыўцоў у нас не зарэгістравана. Каб атрымаць цукар, які адпавядае ДАСТу, мы павінны на працягу ўсяго вытворчага ланцужка кантраляваць прадукты і паўпрадукты. Для гэтага існуе тэхналагічны рэжым, распрацаваны галоўным тэхнолагам, і гэтага рэжыму мы павінны прытрымлівацца, інакш добрага цукру не атрымаем, — тлумачыць Святлана Герасімаўна. — Што тычыцца асобных параметраў, то, напрыклад, па ДАСТу дапускаецца вільготнасць не вышэй за 0,14%, каляровасць — не вышэй за 104 ICUMSA. У нас жа вільготнасць цукру з буракоў у сярэднім складае 0,05% (што амаль у тры разы лепш, чым дапускаецца ДАСТам), а каляровасць — 68-75 ICUMSA. Але, напрыклад, у кастрычніку ў нас цукар ідзе яшчэ бялейшы — з паказчыкам каляровасці ў 35-40 ICUMSA. Ну а што тычыцца салодкасці, то ўсё ў адпаведнасці з ДАСТам выпускаем — 99,75-99,80%, прычым салодкасць аднолькавая, што ў цукру з буракоў, што з сырцу.

Дарэчы, Святлана Шурпа працуе на Скідзельскім цукровым камбінаце даўно — ажно з 1973 года. І за гэты час, як яна прызналася, ні разу не пашкадавала, што лёс яе звёў з цукрам, з гэтым камбінатам і з гэтым калектывам. І пацвярджэннем таго, што яе словы сапраўды шчырыя і праўдзівыя, служыць калекцыя розных упаковак цукру з усяго свету, якую Святлана Герасімаўна збірае ў сваім кабінеце прыкладна з 1994-1995 гадоў.

— Цукар у пакеціках і каробках ёсць з усяго свету. Як толькі хто паедзе ў камандзіроўку, то пры вяртанні абавязкова мне нясе нейкі новы экспанат у калекцыю, — паказвае нам сваю экспазіцыю Святлана Шурпа.

А самы каштоўны экспанат у яе калекцыі — гэта не які-небудзь кубінскі цукар, а просты... зайчык. Так, невялічкі заяц-бяляк, выразаны з кавалка цукру таленавітымі працаўнікамі Скідзельскага цукровага камбіната. Прычым заяц гэты не малады — яму, па ўспамінах Святланы Герасімаўны, каля трох дзясяткаў гадоў:

— Раней у нас людзі з кускоў цукру выпілоўвалі такія розныя фігуркі: зайчыкаў, вавёрак, грыбкі. Звычайна гэта рабілі да нейкіх святаў, напрыклад, пад ёлачку на Новы год паставіць. Бо ў нас жа людзі працуюць па зменах круглыя суткі, таму некаму прыходзіцца быць на камбінаце і на Новы год: і каб стварыць сабе святочную атмасферу, яны ставілі ёлачку ў цэху, а пад яе клалі такія цацкі з цукру, — узгадвае Святлана Шурпа былыя часы. — Сёння такіх зайцаў цукровых ніхто не робіць, бо абсталяванне, дзе мы непасрэдна атрымліваем цукар, стала іншае, аўтаматызаванае. А раней яно было ручное, і можна было ўзяць глыбу цукру і з яе выпілаваць такую прыгожую цацку...

Скідзельскаму цукроваму камбінату сёлета будзе шэсцьдзесят. Але завод як быццам не старэе — абсталяванне самае сучаснае, а калектыў малады і з амбіцыйнымі планамі на будучыню. Але самае галоўнае, каб на прадпрыемстве не забываліся пра багаты вопыт і традыцыі, назапашаныя за гэтыя шэсць дзясяткаў гадоў. І на Скідзельскім цукровым камбінаце пра гэта памятаюць — пра гэта сведчыць той жа самы цукровы зайчык, які ашчадна захоўваецца ў кабінеце Святланы Шурпы.

Павел БЕРАСНЕЎ, Віктар ПАЗНЯКОЎ. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА і з архіва прадпрыемства.

УНП 500053876.

Галоўны эканаміст Віталь ІОСКЕВІЧ (першы справа), вядучы эканаміст Алена ДАНІЛЬЧЫК, эканаміст Кірыл ЖВІРБЛЯ, вядучы эканаміст Андрэй КАЗЛОЎ.

Намеснік генеральнага дырэктара па капбудаўніцтве Мікалай СЯРОЎ.



Аддзяленне ўварвання утфелю аснашчана сучасным высокапрадукцыйным абсталяваннем.

Сяргей КУЛІКОЎСКІ, намеснік генеральнага дырэктара па сыравіне (15 гадоў на камбінаце):

«Нашая сыравінная зона — самая лепшая ў краіне»

— У нашу сыравінную зону ўваходзяць 6 раёнаў Гродзенскай вобласці, буракі паступаюць ад 17 фермерскіх гаспадарак і СВК. У прынцыпе, наша сыравінная зона лічыцца лепшай у рэспубліцы, бо сярэдняя ўраджайнасць ніжэй за 500 цэнтнераў з гектара ніколі не бывае. Засяваем каля 17,5 тысячы гектараў цукровых буракоў, сёлета быў валавы збор у памеры 860 тысяч тон буракоў. Аднак у 2011 годзе плануем нарыхтаваць на 50% болей — 1,3 мільёна тон. Гэта адбудзецца і за кошт пашырэння плошчаў (плануем далучыць гаспадаркі Ваўкавыскага раёна), і за кошт пашырэння пасяўных плошчаў у існуючых шасці раёнах нашай сыравіннай зоны.

Шмат працуем над паляпшэннем тэхналогіі вырошчвання буракоў — гэта цэлы комплекс: і ўкараненне новых гібрыдаў, і праца з мікраўгнаеннямі, мікраэлементамі, дабаўкамі. Бо традыцыйна мы ведаем толькі азот, фосфар, калій, аднак менавіта ўжыванне мікраэлементаў значна павышае ўраджай. І тут мы шчыльна супрацоўнічаем з навукай — у прыватнасці, з Гродзенскім дзяржаўным аграрным універсітэтам.

Што тычыцца ўраджаю 2010 года, то з-за анамальнай спёкі мы недаатрымалі каля 44 тысяч тон буракоў. Дэгесція (доля цукру ў бураках) у сярэднім склала 14,88%, што на 1,8% меней, чым летась. Што тычыцца прагнозу на 2011 год, то, безумоўна, спадзяёмся на добры ўраджай — галоўнае, каб не паўтарылася спёка 2010 года.

З усімі гаспадаркамі мы маем добрыя адносіны — як з СВК, так і з фермерамі. Цукровыя буракі сёння — адна з самых выгадных культур для гаспадарак, таму праблем з заахвочваннем у нас няма. Да таго ж мы самі закупляем насенне, сродкі аховы, мікраўгнаенні, а разлічваюцца гаспадаркі за гэта толькі ў ліставадзе — атрымліваецца своеасаблівы таварны крэдыт.

Перапрацоўку буракоў, як заведзена, пачалі ў 2010 годзе з 1 верасня. Хто здаваў нам буракі да 20 верасня — атрымліваў надбаўку ў памеры 30%, такім чынам кампенсуем гаспадаркам недаспеласць буракоў. Ну а хто пасля 20 лістапада — таксама атрымлівалі надбаўку ў 20%. За тое, што гаспадаркі самі закладвалі буракі на захаванне. А 25 снежня ўжо ўсе цукровыя буракі мы перапрацавалі.

Мікалай СЯРОЎ, намеснік генеральнага дырэктара па капітальным будаўніцтве (30 гадоў на камбінаце):

«Наш камбінат не здарма з'яўляецца Першым беларускім цукровым заводам!»

— Скідзельскі цукровы камбінат сваю карэнную рэканструкцыю пачаў дастаткова даўно, у 2002 годзе, калі было прынятае прынцыповае рашэнне пра нарошчванне вытворчай магутнасці і быў распрацаваны перспектыўны план развіцця нашага прадпрыемства. Потым мы ўдзельнічалі ў выкананні дзяржаўных праграм па развіцці перапрацоўчай галіны і ў праграме развіцця цукровай прамысловасці з 2005 па 2010 год. Апошняй праграмай было прадугледжана павелічэнне вытворчай магутнасці з 3 тысяч тон перапрацоўкі буракоў да 7 тысяч тон, з чым мы паспяхова справіліся.

Партрэт Ігнація Віктаравіча СІВУКА можна ўбачыць на заводскай Дошцы славы ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Ветэран часта бывае ў калектыве цукраварaў, дзе ён працаваў шмат гадоў і адкуль пайшоў на заслужаны адпачынак.

За гэты перыяд быў праведзены вельмі вялікі комплекс арганізацыйных і тэхнічных мерапрыемстваў, будаўніцтва і рэканструкцыі — усяго мы асвоілі капітальных укладанняў з 2003 па 2010 год на суму 216 мільярдаў рублёў, з якіх большая частка — гэта крэдыты нашага банка-партнёра АСБ «Беларусбанк» (127 мільярдаў рублёў), а таксама ўласныя сродкі (55 мільярдаў рублёў), дапамога дзяржавы ў выглядзе частковай кампенсацыі працэнтаў (26 мільярдаў рублёў) і сродкі з інавацыйнага фонду нашага канцэрна.

Што тычыцца 2010 года, то мы на працягу яго правялі вельмі вялікі комплекс работ, і пры даведзеным плане ў 32 мільярды мы змаглі прыцягнуць 51,5 мільярда інвестыцый у асноўны капітал, у тым ліку і з уласных сродкаў амаль 25 мільярдаў. Год гэты для нас быў вельмі плённы, і мы змаглі выканаць у поўным аб'ёме дзяржпраграму «Цукар», маем добрыя вытворчыя магутнасці і тэхніка-эканамічныя паказчыкі, а год закончылі з прыбыткам.

Зараз мы знаходзімся на старце чарговага пляцоўцы ў 7 тысяч тон перапрацоўкі буракоў за суткі, а дзяржавай пастаўлена новая вельмі вялікая задача — да 2015 года мы павінны выйсці на магутнасць 10 тысяч тон перапрацоўкі буракоў за суткі з далейшай перспектывай нарошчвання магутнасцяў прадпрыемства. І нам за пяцігодку трэба будзе правесці вельмі буйныя работы, асвоіць каля 291 мільярда руб., з якіх у 2011 годзе — 75 мільярдаў.

Таксама мы яшчэ хочам больш грунтоўна падыйсці да добраўпарадкавання тэрыторыі, зрабіць гэта комплексна, каб наша прадпрыемства стала яшчэ больш сучасным. Хоць, на думку экспертаў, нашы беларускія цукровыя заводы маюць сёння добры сярэднееўрапейскі ўзровень.

А што тычыцца юбілею нашага камбіната, то я лічу, што наша прадпрыемства нездарма з'яўляецца Першым беларускім цукровым заводам: мы цалкам адпавядаем гэтаму статусу і робім усё, каб выйсці на лідарскія пазіцыі ў галіне.

Святлана ПАЗНЯКОВА, інжынер-тэхнолаг (1,5 года на камбінаце):

«Я не шкадую, што прыехала сюды па размеркаванні!»

— Сюды я прыехала з Магілёва, па размеркаванні пасля Магілёўскага дзяржаўнага інстытута харчавання. Працаваць тут мне вельмі падабаецца, бо вялікая вытворчасць заўсёды з'яўляецца цікавай — амаль кожны дзень адкрываю для сябе нешта новае, тым больш у нас на камбінаце пастаянна праводзяцца рэканструкцыі.

Тут працуюць вельмі добрыя людзі — у калектыў мяне прынялі, з самага пачатку дапамаглі асвоіцца, ды і зараз падказваюць, калі што. Наогул, я заўважыла вялікую розніцу паміж людзьмі з вялікага і малога горада — у Скідалі людзі больш ветлівыя і добрыя.

Жыву ў інтэрнаце камбіната, там таксама суседзі падабраліся добрыя — заўсёды падтрымаюць, дапамогуць, я вельмі задаволена, што ёсць інтэрнат, бо мне было б складана пражыць тут недзе адной.

З зарплатай таксама не крыўдзяць, таму я не шкадую, што прыехала сюды па размеркаванні. У мяне быў варыянт ехаць на іншы цукровы завод, але я памянялася з дзяўчынай, бо па Скідзельскім цукровым камбінаце я пісала дыплом, была тут і трохі ведала гэтае прадпрыемства. І, калі дазволяць сямейныя абставіны, з задавальненнем застануся тут працаваць і пасля адпрацоўкі двух гадоў па размеркаванні — наўрад ці я знайду такую добрую працу ў Магілёве.

Сяргей ГРУШЭЎСКІ, начальнік змены (14 гадоў на камбінаце):

«Людзі па ўласным жаданні з камбіната не звальняюцца!»

— Я скончыў тэхнікум у Слуцку і ў 1997 годзе прыйшоў сюды на камбінат. Пачынаў тут працаваць простым грузчыкам. А потым убачыў аб'яву, што набіраюць цукарнікаў — і пайшоў вучыцца ад завода. Ну а цяпер, як бачыце, працую начальнікам змены. Я вам скажу, што з дысцыплінай у нас вельмі строга. Але людзі па ўласным жаданні з камбіната не звальняюцца.

Святлана САНТ, начальнік бюро стандартызацыі і якасці:

«Якасць нашага цукру — добрая, але мы гэта будзем пацвярджаць дакументальна»

— Яшчэ 20 снежня 2005 года мы атрымалі пасведчанне аб паспяховым укараненні стандарту СТБ ISO 9001. І кожны год мы паспяхова праводзім інспекцыйны кантроль, а таксама нават пашырылі дзеянне стандарту — акрамя цукру і лімоннай кіслаты яшчэ і на жамерыны сухія грануляваныя. Летась мы атрымалі сертыфікат па сістэме GNP (галандская версія) на вытворчасць жамерын сухіх гранулаваных, які сведчыць пра бяспеку прадукту.

Таксама зараз вядзём працу па ўвядзенні на ўсю гатовую прадукцыю сертыфіката HACCP. Для гэтага распрацавалі план мерапрыемстваў і будзем яго выконваць, бо HACCP — гэта вельмі жорсткія патрабаванні. Мы ўжо ўкаранілі стандарт СТБ 18000 на кіраванне аховай працы, у перспектыве плануем атрымаць і экалагічны сертыфікат ISO 14000 на кіраванне аховай прыроды.

У прынцыпе, якасць цукру ў нас і так добрая, але нам гэта трэба засведчыць дакументальна, з дапамогай сертыфікатаў, — таму мы і надалей будзем ўкараняць розныя стандарты на прадпрыемстве.

Аляксандр ПЕРАВОЗ, інструктар па фізічнай культуры і спорце:

«Па спорце мы займаем лідарскія пазіцыі сярод прадпрыемстваў канцэрна!»

— Мы праводзім увесь год спартакіяду сярод 17 цэхаў: гуляем у валейбол, футбол, настольны тэніс, шашкі, шахматы, а таксама ў гарадкі і ў карты. Таксама ўдзельнічаем у розных спаборніцтвах у раёне, вобласці, рэспубліцы: напрыклад, два разы мы займалі першае месца ў спартакіядзе нашага канцэрна Белдзяржхарчпрам — у 2005 і 2009 гадах. У 2008 годзе падняліся на другую прыступку п'едэстала, а ў 2010 нам трохі не пашанцавала — былі чацвёртымі. Але ўсё роўна можна сказаць, што мы па спорце займаем лідарскія пазіцыі сярод прадпрыемстваў канцэрна. Добрыя поспехі маем і ў футболе, удзельнічаем у міжнародным турніры па валейболе ў Лідзе, дзе таксама гуляем на належным узроўні.

Ігнацій СІВУК, былы галоўны механік (39 гадоў на камбінаце):

«Спачатку я гэты завод будаваў, а потым сам на ім і працаваў!»

— Я толькі год быў на фронце ў часы Вялікай Айчыннай вайны. Пад Берлінам быў паранены ў нагу, але нямоцна — косць засталася цэлай. Пасля вайны працягваў служыць у войску, а сюды прыехаў, калі тут завод ужо будаваўся: сцены амаль поўнасцю стаялі, але даху яшчэ не было. Здаецца, гэта было ў 1950 годзе. Спачатку працаваў слесарам-мантажнікам, а пасля таго, як завод дабудавалі, тут і застаўся — пайшоў слесарам, а потым выпаршчыкам. Так што, атрымліваецца, што я спачатку завод будаваў, а потым сам на ім і працаваў! Ну а ў 1989 годзе пайшоў на пенсію з пасады галоўнага механіка, дзе прапрацаваў апошнія гадоў 15.

Памочнік генеральнага дырэктара Канстанцін ШУРПА і інструктар па спорце, кандыдат у майстры спорту па марафоне Аляксандр ПЕРАВОЗ.

Галоўны бухгалтар Алена ЗІМАКОВА (трэцяя справа), бухгалтары Алена ГЛОД, Аксана ЖУК, Таццяна СІДАРОВІЧ, Ніна САПОЦЬКА, Наталля СЕВЯРУХІНА, Ала МАЗАЛЕЎСКАЯ, Ніна ЛІПІНСКАЯ, Святлана КАВАЛЬЧУК, Аксана БАКУН.

СКАНВОРД + СУДОКУ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.

СУДОКУ. У квадраце 9×9 клетак размясціце лічбы ад 1 да 9 уключна такім чынам, каб у кожным радку, кожным слупку, у блоках 3×3 клеткі, абмежаваных тлустай лініяй, кожная лічба сустракалася толькі адзін раз, без паўтораў.

8		9		7	5			
			1				5	
	7	5			4		3	
	8		7			5	2	
	6				1			
			4	9		6		7
					9			5
		3	8		7	4		
1			5					

АДКАЗЫ НА СКАНВОРД + СУДОКУ

Па гарызанталі: Ватрон. Рэзьбіца. Мазі. Арал. Кюі. Брас. Сноп. Алтын. Гарнізон. Ілі. Цэрам. Нёман. Рок. Моц. Фрэнк. Маш. Шаку́. Гуда. Омск. Лаг. Плацына. Плаў. Ромул. Маіс. Ананкон. Пацюк. Мастак. Анагр. Арфенціна. Онікс. Німфа. Патон. **Па вертыкалі:** Грыма. Пацюк. Ніжак. Акадэа. Жакабрыўм. Шаг. Сундук. Эрата. «Нос». Плаці. Ер. Ромул. адказы гл. у тэлепрагр.

8	1	9	3	7	5	2	4	6
3	4	6	1	8	2	7	5	9
2	7	5	9	6	4	1	3	8
9	8	1	7	3	6	5	2	4
7	6	4	2	5	1	9	8	3
5	3	2	4	9	8	6	1	7
4	2	8	6	1	9	3	7	5
6	5	3	8	2	7	4	9	1
1	9	7	5	4	3	8	6	2

Скраў 790 кіло ячменю

З адміністрацыі сельскагаспадарчага прадпрыемства «Ульскі» Шумілінскага раёна паведамілі ў раённы аддзел унутраных спраў пра крадзеж са склада 790 кілаграмаў ячменю.

У міліцыі ўстанавілі, што ноччу ячмень скраў 19-гадовы мясцовы жыхар, беспрацоўны. Ноччу ён адагнуў створку варотаў і трапіў у складское памяшканне. Заведзена крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Транспартная філасофія

«ДАРОЖНАЕ» ЧЫТВО, ці Што чытаюць беларусы?

РАСІЯНЕ доўгі час лічыліся самай чытаючай нацыяй у свеце. У савецкія часы так і было. Беларусы як частка тады савецкага народу таксама прымервалі статус самых чытаючых. Даставалі забароненыя кніжкі, ашчадна перадавалі іх з рук у рукі. Некаторыя кніжкі можна было набыць не толькі за грошы, а яшчэ і за дадаткова здадзеную макулатуру. Збіралі-здавалі-набывалі. Чытаць і быць інтэлігентам тады было модна.
Калі афіцыйна пачалі выдаваць раней забароненыя кнігі, інтарэс да літаратуры паступова пачаў зніжацца. На рынак выйшлі пустыя жаночыя раманы і лёгкія дэтэктывы. Яны і набылі папулярнасць. А ў 2008 годзе расіяне былі толькі на сёмай пазіцыі сярод самых чытаючых краін свету, саступіўшы чэхам, егіпцянам, філіпінцам, кітайцам, тайцам і, урэшце, лідарам — індусам. Верыцца з цяжкасцю. Але з лічбамі не паспрачаешся.
Што і як чытаюць сёння беларусы, я назірала ў транспарце.

АД КАНТА ДА АНЕКДОТАЎ

«Дарожнае» чытво папулярнае ў Мінску па-ранейшаму: часу на дорогу сталічныя жыхары траціць шмат, хочацца яго правесці карысна. Вось і чытаюць. Я асцярожна зазіраю праз плячо свайго суседа ў метро. У руках малады хлопец трымае тоўсты томік. Насупіўшы лоб, старанна ўчытваецца. «Самаўдасканальванне» — бачу назву кніжкі ў пачатку кожнай старонкі. Так жа днямі мяне здзівіў малады мужчына неахайнай знешнасці, які ў час пік, стоячы ў метро, не мог адарваць вачэй ад кніжкі. Аказалася, Канта чытае. Прыемна, што ў людзей ёсць жаданне працаваць над сабой.

Пад гул цягніка я чытаю лёгкі жаночы сучасны бестсэлер Ганны Гавальды «Проста разам». Побач з экраннай версіяй першакрыніца заўсёды выглядае выйгрышна. На мой погляд, увогуле можна экранізаваць толькі невялікія аповесці і апавяданні. Бо з рамана ў фільме застаецца толькі маленькая частка, контур. У дзве гадзіны відэа немагчыма змясціць усе важныя дэталі, і ад гэтага, здаецца, губляецца сэнс, карціна ўспрымаецца ўрыўкамі і не прыносіць такога задавальнення, як кніга. Але гэта толькі мой погляд, ІМХО, як цяпер кажуць інтэрнэт-карыстальнікі.

Памятаю, мая ўніверсітэцкая аднагрупніца так ахарактарызавала самы вядомы твор Патрыка Зюскінда: «Парфюмера» ў метро не пачытаеш». На гэта ёй запярэчыла наша выкладчыца па замежнай літаратуры: «А я якраз у метро яго і чытала».

У метро, безумоўна, чытаць зручней за ўсё. Асабліва калі ты едзеш ад першай да канцавой станцыі адной лініі. Сеў і не заўважыў, як праляцела васямнаццаць хвілін (менавіта за такі прамежак часу цягнік пераадольвае адлегласць ад першага да апошняга прыпынку). Але чытаюць і ў іншым транспарце. У аўтобусе не так зручна, не так цёпла, часта даводзіцца стаяць, адцягвацца на размову з кандуктарам, прапускаць тых, хто выходзіць, але і тут чытаюць. У сваім аўтобусе я налічыла пяць пасажыраў з кніжкай у руках. Часта сустракаюцца студэнты з канспектамі і падручнікамі — я сама часцяком рыхтавалася да семінару па дарозе ва ўніверсітэт.

Пасажыры чытаюць дэтэктывы, жаночыя раманы, «страшылкі». Шмат хто чытае дробным шрыфтам запампаваныя ў мабільнік творы. Адзін мой знаёмы расказваў, як не мог прымусіць сына чытаць праграмную літаратуру ў школе. Як толькі яму набылі мабільны тэлефон, хлопец стаў чытаць не толькі праграмныя творы, але і пазакласнае чытанне. Трэба толькі зацікавіць і знайсці падыход. Часцей стала сустракаць чытачоў з электроннымі кнігамі. Вельмі зручная штука — запампуеш туды з інтэрнэту што душы заўгодна. Фармат кніжны, а не тэлефонны, шрыфт выбіраеш зручны для сябе, батарэі хапае надоўга, і самае важнае — «старонкі» гэтай кнігі нагадваюць не камп'ютарны экран, а сапраўдныя лісты паперы (завецца «электронная папера»), ад іх не так стамляюцца вочы і чытаць прыемней. Чаго толькі не прыдумаюць, каб людзі больш чыталі.

А вось творы беларускіх аўтараў, на жаль, бачу толькі ў руках школьнікаў. Падрастаючае пакаленне ўвогуле не радуе сваім выбарам: ён альбо вымушаны — Шамякін, альбо ніякі — зборнік анекдотаў.

ЭРУДЫТЫ І ВЕРНІКІ

— Жаночы шалік з пер'яў, тры літары, — звяртаецца да мяне мужчына ў метро.

— Баа, — адказваю я і з задавальненнем далучаюся да працэса разгадвання крыжаванкі.

Газеты і часопісы таксама часта чытаюць у транспарце. Гэта лічыцца паказчыкам начытанасці? Думаю, можна залічыць. Усё ж эрудыт, які разгадвае крыжаванкі, лепшы за робата, што гуляецца на мабільным тэлефоне.

Жанчына, што сядзіць у тралейбусе насупраць мяне, дастала кішэнны малітваслоў. Яна траціць дарожны час на зварот да Бога. Ціхенька шэпча словы малітвы, заплюшчвае вочы, паўтарае пра сябе і чытае далей. Я таксама чытала ранішнія малітвы па дарозе на работу, калі ездзіла ў метро ад пачатку да канца. Васемнаццаці хвілін хапала, каб перачытаць і асэнсаваць святыя звароты. Сяброўка неяк казала, што яна б не змагла маліцца ў транспарце, калі вакол шмат людзей, перашкаджаюць іншыя гукі і размовы. А я тады прывыкла і не зважала ні на што. Нядаўна побач са мной у аўтобусе маладзенькая дзяўчынка чытала з паперкі малітву, прыкрываючыся сшыткам — відаць, прасіла дапамогі на экзамене, на які едзе. Ведаеце, калі я перастала чытаць малітваслоў у метро, я перастала чытаць яго і дома, спасылаючыся то на стомленасць, то на недахоп часу. Тралейбус ці вагон метро не самае прыдатнае месца для зварота да Бога, але лепш так, чым ніяк. Зноў жа — ІМХО.

НАЧЫТАНЫ КІРОЎЦА

Дык што ж з беларусамі, ці чытаючая мы нацыя? Жаночыя раманы, дэтэктывы, крыжаванкі і малітваслоў — гэтага недастаткова, скажаце вы. І будзеце мець рацыю. Адна мая знаёмая нядаўна заявіла:

— Я зараз чытаю чатыры кнігі, збіраюся пачаць пятую.

Гэта, безумоўна, выключэнне, а не правіла. Большасць «чытачоў» абмяжоўваецца праглядам інтэрнэт-парталаў. Самыя заўзятымі, бадай, можна назваць блогераў: livejournal чытае больш за 270 тысяч беларусаў. Працэс чытання перайшоў у працэс «забівання часу» — у дарозе ці дома ля камп'ютара. І я ўжо змірылася б з такой высновай, каб не адно назіранне. Як звычайна, у аўтобусе.

Ехала я пару прыпынкаў, таму далёка ў салон не праходзіла, а стаяла побач з кабінай кіроўцы. У цішыні паўпустога аўтобуса да мяне даносіліся гукі з вадзіцельскага магнітафона. Ён слухаў аўдыёкнігу. А што нас з вамі здзіўляе? Чалавек цэлы дзень уважліва сочыць за дарогай і не мае магчымасці чытаць нават пасля работы, бо стамляюцца вочы. Ён можа слухаць шансон з касеты, можа настроіцца на FM-станцыю з папсой. Нас здзіўляе, што кіроўца зрабіў іншы выбар. Складана паверыць, як і ў тое, што індусы чытаюць больш за расіян. А вы прывыкайце. І чытайце, спадарства, чытайце.

Таццяна САЛДАЦЕНКА.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.05	16.40	8.35
Віцебск —	8.00	16.24	8.24
Магілёў —	7.55	16.30	8.35
Гомель —	7.46	16.32	8.46
Гродна —	8.19	16.56	8.37
Брэст —	8.14	17.03	8.49

Месяц

Апошняя квадра 26 студзеня. Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Ніны, Адама, Аўсея, Веньяміна, Івана, Ільі, Іосіфа, Ісака, Паўла, Сяргея, Сцяпана.*

К. *Ангелікі, Анелі, Ілоны, Пшэмыслава, Юрыя, Яна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



Паважаную **Ганну Дзмітрыеўну ЦАРАНОК** з днём нараджэння! Жадаем здароўя і дабрабыту.

Марына і Саша, *г. Жлобін.*

Любую мамачку і бабулю **Ганну Дзмітрыеўну ЦАРАНОК** сардэчна віншуем з 85-годдзем! Зычым доўгага веку, шчасця, здароўя, аптымізму!

Дочкі, зяці, унукі.

ПЛОТ

Плот — часцей за ўсё драўляная агароджа («перашкода») двара (тын, паркан, штыкетнік). Ён стаў сімвалічнай лініяй, рысай, якая падзяляла «сваю» і «чужую» прастору.

● Плотам агароджвалі не толькі сядзібу, загон для жывёлы, але і могілкі. У далёкія часы плотам з дранкавага бярвення або цэглы — сцяной — агароджвалі ўсю вёску, паселішча, горад, што нярэдка служыла адзінай абаронай ад нападу ворагаў. У традыцыйнай культуры ўсходніх славян плот набыў статус небяспечнага, «нячыстага», але ў той жа час і сакральнага месца.

● Плот надзяляліся статусам цэласнасці і недатыкальнасці. Таму выхад за плот не праз вароты ці браму, разбурэнне агароджы параўноўвалі з незаконным нараджэннем дзіцяці, стратай нявіннасці і пазашлюбнымі адносінамі: «Хата без плота, што баба без мужыка», «Вяселле пад плотам, а шлюб потым», «Хадзіць з дзіркай у плоце» — значыць, страціць цнатлівасць па-за шлюбам.

● Цяжарнай жанчыне забаранялася пераплазіць цераз плот, каб «не выкінуць», не страціць дзіця. У той жа час, калі роды былі цяжкімі, мужу раілі разламаць частку плота. Лічылася, што такія магічныя дзеянні паспрыяюць хутчэйшаму нараджэнню дзіцяці.

● Нярэдка травой, сабранай пад плотам (а значыць, той, да якой ніхто не датыкаўся), народныя лекары лячылі людзей і свойскую жывёлу.

● Каля плота абмывалі людзей, якія пакутавалі на падучую хваробу. Пад плот закопвалі рытуальныя прадметы, на якія «адсылалі» хваробы і няшчасці. Каб вылечыць дзіця ад псоты ці сурокаў, пад плотам рабілі падкоп і прымушалі хворае дзіця тры разы праплезці гэтым лазам.

● Існаваў звычай: жанчыны, якія адпраўляюцца на зажынкі, пралазілі пад плотам. Гэта рабілі з адной мэтай: каб не балела спіна падчас доўгай, знясільваючай працы.

● На плот вывешвалі рытуальныя прадметы, якія павінны былі служыць абярэгам для ўсёй гаспадаркі: старыя паношаныя лапці, бітыя гліняныя чыгуны, траецкую і купальскую траву. У старажытнасці на калы вывешвалі чэрапы кароў ці быкоў.

● Самым небяспечным месцам лічылі стыкі ці куты плота. У народзе верылі, што там пасяляюцца нячысцікі. Нездарма ва Украіне імкнуліся рабіць агароджу вакол двара закругленай, без кутоў.

● Плот стаў асноўным месцам Калядных варожбаў. Дзяўчына перакідвала цераз плот чаравік і спрабавала даведацца: у якім баку жыве суджаны. Абхапіўшы штыкетнік, варажыла: ці выйдзе яна сёлета замуж. Цотная колькасць абхопленых калоў абяцала «пару», няцотная — адзіноту.

● На плот падчас калядавання аднавяскоўцы маглі надзець пудзіла, якое сімвалізавала сквапнасць, нядбайнасць ці злосць гаспадароў хаты.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Крынічка
«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.
Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 4 (383)

Сезон пачынаецца ў студзені

Усе агароднікі дзеляцца на дзве катэгорыі: на тых, хто з ранняй вясны пачынае вырошчваць расаду розных культур дома, і тых, хто карыстаецца гатовай, купленай не толькі на рынку ў бабулек, але і ў сур'ёзных гаспадароў-фермераў. Гэты матэрыял для тых, хто вырошчвае расаду сам.

Спачатку трэба паклапаціцца пра тры рэчы: пра насенне, зямляную сумесь і ёмістасці, дзе будзе вырошчвацца расада.

У крамах ёсць розныя субстраты, для рознай расады, але тут можа падпільноўваць такая нечаканасць: замест разрэкламаванай сумесі ў пакеце мы знаходзім толькі торф з рэшткамі драўніны. Так што зямля, нарыхтаваная ўвосень сваімі рукамі, будзе вельмі дарэчы. Толькі не карыстайцеся звычайнай зямлёй з градкі — у ёй многа ўзбуджальнікаў небяспечных хвароб. У прынцыпе, патрэбны два варыянты субстрату. Для сеянцаў на першым этапе ідэальнай будзе глеба, якая бесперашкодна прапускае ваду, але ў той жа час вільгацяёмістая, якая не вельмі хутка прасыхае ў пакоі з сухім паветрам. Элементаў сілкавання ў такой зямлі павінна быць не вельмі шмат, таму што высокія канцэнтрацыі пажыўных рэчываў, як сцвярджаюць спецыялісты, толькі затрымліваюць прарастанне насення. А вось расаду давядзецца пікіраваць ужо ў грунт больш урадлівы, які таксама трэба мець пад рукой. Калі вы з восені не падрыхтавалі зямлю для расады, давядзецца карыстацца той, што прадаецца ў магазінах і спецыялізаваных кіёсках, але будзьце ўважлівыя і правярайце тое, што купляеце.

Няцяжка падабраць ёмістасці для расады на любы густ, выкарыстоўваючы абрэзаныя пластмасавыя бутэлькі, каробачкі і кубачкі з-пад малочных прадуктаў. Не забудзьце прасвідраваць у іх дрэнажныя адтуліны.

Галоўная праблема для расады — святло. З-за яго дэфіцыту расада ў многіх гаспадароў выглядае бледнай, нежыццяздольнай, моцна выцягваецца. Менавіта дэфіцыт асвятлення ў зімова-веснавыя месяцы непазбежна прыводзіць да таго, што расліны не толькі пастаянна пакутуюць, але ў пахмурныя дні і пяражываюць стан стрэсу. Справа ў тым, што святло — адна з галоўных умоў жыцця. Пры нізкай асветленасці развіццё раслін затарможваецца. Некаторыя агароднікі спрабуюць кампенсаваць развіццё раслін тым, што таматы і сельдэрэй высяваюць ужо ў студзені, але ў выніку выйгрышу не атрымліваюць, бо гэта самыя кароткія светлавыя дні. Даўно падлічана, што ў пахмурныя дні інтэнсіўнасць асвятлення на падаконніках у дзясяткі разоў меншая, чым патрабуецца раслінам. Даўжыня дня ў сакавіку складае менш чым 12 гадзін, у той час як усходы маюць патрэбу як мінімум у 15-16-гадзінным асвятленні. Вось таму і трэба аб гэтым паклапаціцца. Непасрэдна над ёмістасцямі з расадай (літаральна за 10—15 см) манціруюць дзве люмінесцэнтныя лямпы (тыпу ДЛС, ЛБ, ЛТБ, па 40—65 Вт). Цяпер прадаюцца спецыяльныя свяцільнікі для раслін — фіталямпы. Яны даволі эфектыўныя, толькі вось фіялетавае святло, на жаль, раздражняе вочы. Аптымальны эфект дае натрыевая лямпа «Рэфлакс», якая мае перавагі перад астатнімі.

Каб менш карыстацца асвятляльнымі прыборамі, агароднікі высяваюць насенне на расаду ў канцы лютага, а то і ўвесь наступны месяц, гэта значыць, у сакавіку. **Як падрыхтаваць насенне да сяўбы, мы паразважаем з вамі ў наступным выпуску.**

Колеус на акне і ў садзе

Гэта шматгадовая дэкаратыўна-лісцёвая расліна сям'і губакветных называюць яшчэ крапіўкай. Многія любяць яе не за кветкі, а ў асноўным за рознакаляровасць лісцікаў. Апошнім часам усё часцей можна ўбачыць колеус у адкрытым грунце — на клумбах у бардзюрах. Існуе мноства гатункаў з разнастайнай афарбоўкай лістоў — ад бела-салатных да цёмна-бардовых і карычнева-фіялетавых.

Колеус упрыгожыць таксама клумбу на садовым участку, але майце на ўвазе: замаразкаў расліна не пераносіць і ў адкрытым грунце не зімуе.

Крапіўка лёгка размнажаецца чаранкамі. Каб парасткі пусцілі карэньчыкі, іх трэба паставіць у ваду ў непразрысты посуд. Светлы посуд не садзейнічае ўтварэнню каранёў.

Калі вы хочаце, каб расліна атрымалася магутнай і пышнай, садзіце па адным чаранку ў гаршчок.

Першыя вітаміны з градкі

Каб атрымаць ураджай **морквы** ў чэрвені, скараспелыя гатункі з кароткімі караняплодамі (Карацель, Нанцкая 4 і 14, Ленінградская, Шантанэ) сеюць пад плёнку або ў цяпліцу, якая не ацяпляецца, ужо ў красавіку, для атрымання ўраджаю ў ліпені такія ж гатункі сеюць на абароненае ад ветру месца ў канцы красавіка — пачатку мая.

Памятайце, што морква не любіць прысутнасці ў глебе гною, нават калі яго ўносілі пад папярэднюю культуру. За 1—2 тыдні да сяўбы граблямі запраўце ў глебу комплекснае мінеральнае ўгнаенне.

Мангольд, або лісцевыя буракі, — двухгадовая агароднінная культура. У першы год мангольд утварае разетку з буйнымі лістамі, часта хваліс тымі, пузырчатымі або кучаравымі.

Афарбоўка іх у залежнасці ад гатунку — зялёная, жоўта-зялёная, часта лісты маюць ярка выражаны чырвоны колер. Чаранкі ліста шырокія, ад 5 да 7 см. На другі год у мангольда вырастае кветкавае сцябло, на якім развіваюцца дробныя зеленаватыя кветкі і насенне.

Мангольд вырошчваецца як зяленіва, караняплода не ўтварае. Лісты і чаранкі мангольда багатыя на вітаміны, бялкі і мінеральныя солі, асабліва шмат у іх кальцыю, фосфару і жалеза.

Сяўбу праводзяць у пачатку мая. Насенне перад сяўбой рэкамендуецца замочваць на двое-трое сутак. Для мангольда пажадана выбраць участак, які добра асвятляецца. Гэта культура, якая любіць вільгаць і патрабавальная да пажыўных рэчываў. Напрыклад, два разы ў месяц трэба падкормліваць расліну зялёным угнаеннем або растворам каравяку.

Як вырасціць гартэнзію ў садзе

Цяжка знайсці іншую расліну, якая выглядае так дэкаратыўна і ўлетку, і ўвосень. Ужо ў чэрвені—ліпені куст гартэнзіі пакрыты беласнежнымі суквеццямі, якія з цягам часу мяняюць колер. У залежнасці ад віду і гатунку кветкі могуць быць блакітнымі, ружовымі, зялёнымі.

Слова «гартэнзія» ў перакладзе з грэчаскай мовы азначае «пасудзіна з вадой», што сведчыць пра тое, што расліна любіць вільгаць. У прыродзе сустракаецца 35 відаў гартэнзіі, якія растуць ва Усходняй Азіі, Гімалаях, Паўднёвай і Паўночнай Амерыцы. Цвітуць гартэнзіі ў другой палове лета — пачатку восені, калі большасць раслін ужо адцвіла. Суквецці не толькі доўга трымаюцца на кусце, але і добра захоўваюцца ў зрэзаным выглядзе.

Гартэнзіі размнажаюцца насеннем і вегетатыўна. Насенне высяваюць у скрынкі без папярэдняй падрыхтоўкі, не запраўляюць у глебу. Скрынку прыкрываюць шклом. Дружныя ўсходы з'яўляюцца прыкладна праз 20 дзён. Да канца першага года вышыня сеянцаў складае ўсяго толькі 3-5 см, а на другім годзе жыцця — 12-15 см.

Садовыя формы размнажаюць зялёнымі чаранкамі, адводкамі, дзяленнем куста. Укараняльнасць зялёных чаранкоў гартэнзіі дрэвападобнай і мяцёлчатай каля 80-85 працэнтаў. Укараняюцца яны за 20-25 дзён. Лепшыя ўмовы чаранкавання — штучны туман. Пры выкарыстанні стымулятараў каранеўтварэння дасягаецца 100-працэнтнае ўкараненне. Гатункі можна размнажыць прышчэпкай на зімастойкія віды.

Расліны высаджваюць на адлегласці 1-1,5 м адна ад адной на сонечным месцы або ў паўцяні. Маладыя расліны трэба засцерагаць ад паўдзённага сонца і ветру. Спачатку рыхтуюць пасадачную яму памерам 50 х 50 х 60 см. Важна, каб каранёвая шыйка была на ўзроўні глебы. Глебу рыхтуюць з перагною, лісцёвай зямлі, торфу і пяску ў суадносінах 2:2:1:1. Гартэнзіі вельмі не любяць вапны і ўгнаенняў, якія змяшчаюць хлор. Пры пасадцы ў яму дабаўляюць мінеральныя ўгнаенні і арганіку (кампост), пасля чаго два гады не падкормліваюць.

Нябесная грамата

Раяць астролагі

Вопытныя агароднікі даўно карыстаюцца месяцавым календаром. У кожнага знака Задыяка свая спецыфіка, таму, ведаючы, дзе знаходзіцца Месяц у пэўны момант, можна найбольш эфектыўна спланаваць час пасадак, праполак і збору сельскагаспадарчых культур.

КАЗЯРОГ. Знак паўурадлівы. Расліны, высаджаныя ў гэты перыяд, занадта не разрастаюцца, але затое будуць выносліваі і ўстойлівыя да хвароб і неспрыяльных умоў надвор'я, а ўраджай, які яны дадуць, будзе доўга захоўвацца.

Гэта найбольш удалы час для пасадкі кораняплодаў, збожжавых, цыбульных раслін, дрэў і кустоў. Іх стваллы і сцёблы будуць больш трывалымі, даўгавечнымі, а кветкі прыгожымі і здаровымі.

Усміхнемся

— Цікава, чаму гэта доктар трымае ў кабінеце шкілет?

— Магчыма, гэта яго першы пацыент...

☺

Вырашыў пакараць сваю жонку — схаваў дома ўсе люстэркі. Да гэтага я не ведаў, што храмераваны посуд можа так люстрана блішчаць.

☺

— Ватсан, як вам на смак сабака Баскервіляў?

— Я яго не еў, Холмс.

— А місіс Хадсан кажа, што елі.

— Чаму вы верыце ёй, а не мне, Холмс?

— Таму, што гатуе ежу яна, а не вы.

☺

Калі халасцяк купіў сабе пасудамыйную і пральную машыны, шанцы яго жаніць змяншаюцца на 2/3.

☺

— Добры дзень! Дайце мне, калі ласка, два квіткі ў Сочы.

— Навошта? Лістапад ужо, што вы там забыліся?

— Дзіця.

☺

А вы таксама кажаце мікрахвалёўцы: «Ды іду я, іду!»?

☺

— Увага! Уладальнік чырвонага «ферары», прыпаркаванага пад каўшом экскаватара, тэрмінова купіце сабе валідол!

☺

Дзеці — кветкі жыцця :-)
— Ліза, выкінь смецце!
— Мама, я толькі што памылася, пачакай, пакуль выпацкаюся.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 422. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

27 студзеня 2011 г. № 3 (241)

ВЯСКОВЫЯ ДАРОГІ

дачакаліся гаспадара

Летась закончылася працэдура перадачы дарог сельскай мясцовасці на баланс спецыялізаваных арганізацый, дэкларараваная Указам № 21 ад 2007 года. Што змянілася з таго часу, ці адчулі палёгку з падтрыманнем парадку на дарогах работнікі сельскіх Саветаў, вясковыя старасты, самі вяскоўцы? Мы вырашылі пацікавіцца гэтым у Пружанскім раёне, дзе перададзены арганізацыі «адрэзак» дарог выглядае даволі ўнушальна — больш за 700 кіламетраў.

Абслугоўвае ўчастак сельскіх дарог Пружанскае ДРБУ-140 «Брэстаблдарбуда». Яго начальнік **Аляксандр СУБОТА** ўдакладніў лічбы: арганізацыя абслугоўвае 713 кіламетраў аўтамабільных дарог мясцовай дарожнай сеткі, якія звязваюць населеныя пункты паміж сабой і з раённым цэнтрам. Акрамя таго, рашэннем Брэсцкага аблвыканкама ў снежні 2009 года на баланс ДРБУ-140 перададзена 214,5 кіламетраў вуліц сельскіх населеных пунктаў.

Для лепшага і больш аператыўнага вядзення работ створана два вытворчыя ўчасткі: адзін у Пружанах, які абслугоўвае пружанскую і шарашоўскую зоны, другі — у гарадскім пасёлку Ружаны. Раён даволі працяглы, таму такая структура выглядае найбольш рацыянальна.

Трымаць сельскія дарогі ў парадку можна толькі пры наяўнасці дастатковай колькасці тэхнікі. І тэхнічны парк арганізацыі папаўняецца. Летась за сродкі абласнога бюджэту набыты аўтагрэйдар, за ўласны кошт куплены два прычапныя аўтагрэйдары, за кошт крэдытаў і інвестыцый набыты таксама тры аўтамашыны ГАЗель, яшчэ адзін аўтагрэйдар, пагрузчык і гладкавальцавы каток. На гэты год таксама запланавана абнаўленне значнай часткі тэхнікі.

Аляксандр Субота засяродзіў увагу на фінансаванні. Летась на ўтрыманне дарог сельскіх населеных пунктаў было выдаткавана 623,5 мільёна рублёў. За гэтыя грошы падсыпаныя вуліцы дваццаці вёсак, адрамантаваны некаторыя дарогі з асфальтабетонным пакрыццём, вялася прафіліроўка вуліц, ачыстка ад снегу, зімовы догляд, іншыя работы. Сёлета грошай выдзелена на чвэрць менш. Таму дарожнікі звярнуліся да кіраўніцтва ўсіх сельсаветаў, каб тыя вызначылі пералік вуліц, дзе патрабуецца рамонт, падсыпка, добраўпарадкаванне ў самую першую чаргу.

Старшыня Вялікасельскага сельскага Савета **Валянціна БАГАН** сказала карэспандэнту «МС», што летась яны заўважылі значныя зрухі ў абслугоўванні сельскіх дарог. Летам былі адрамантаваны і падсыпаны дарогі на вуліцах Вялікага Сяла, Ліхасельцаў, адна вуліца ў Бакунах. Вуліца Перамогі ў Ліхасельцах была найбольш праблемнай: вечныя лужыны ў сезон. Дзеці ў школу, а старэйшыя на працу дабіраліся, трымаючыся за плот. Цяпер хадзіць стала добра, і вясковыя жыхары не раз выказвалі за гэта падзяку. Вядома, мясцовая ўлада сваімі сіламі не адолела б такі аб'ём работ.

— Зімой мы таксама адчулі палёгку, — працягвае Валянціна Васільеўна, — калі па першым жа званку на дапамогу прыходзіць тэхніка, як толькі дарогу да таго ці іншага населенага пункта замятае. Праўда, з гэтай нагоды трэба выказаць вялікую падзяку і мясцовай гаспадарцы — ААТ «Вялікасельскае-Агра». Сельгаспрадпрыемства мае свой грэйдар, і маленькія дарогі, нават да вёскі, дзе засталося тры жылыя хаты, ці адзінокага хутара расчышчаюцца пастаянна. У нас ніколі не бывае сітуацыі, каб на які надзвычайны выпадак не магла дабрацца «хуткая» ці пажарная машыны. Дырэктар ААТ Міхаіл Фурман і галоўныя спецыялісты гаспадаркі лічаць сваім абавязкам падтрымліваць дарогі ўзімку ў жыццядзейным стане, а не чакаць, пакуль да нас прыедзе машына ДРБУ і расчысціць. Мы ж разумеем, што пры ўсім жаданні дарожнікі не могуць справіцца з такім аб'ёмам работ, скажам, за дзень. Але ў нас ні разу не было за зіму, каб у якую-небудзь з шасці вёсак, якія ахоплены гандлем «на колах», не дайшла аўтакрама.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ФОРМА І ЗМЕСТ

ШТО ЗА ФАСАДАМ СЕЛЬСКАГА КЛУБА?

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Так ужо склалася — падставы для журналісцкіх камандзіровак рэдка маюць станоўчы «зарад». Тут амаль як у класіка: паколькі ўсе, хто шчаслівы, шчаслівыя аднолькава, то дзяліцца сваім шчасцем не лічаць мэтазгодным. Затое ўсе нешчаслівыя — нешчаслівыя па-свойму, так што без умяшання прадстаўнікоў «чацвёртай улады» часам не абысціся.

Тым больш прыемна, калі, выправіўшыся разбірацца з сітуацыяй і ўнутрана настроіўшыся на негатыў (абыякавасць, неразваротлівасць, абмежаванасць і г.д. тых, ад каго залежыць непасрэднае вырашэнне праблемы), раптам сутыкаешся з супрацьлеглым. Людзьмі зацікаўленымі, неабыякавымі, па-добраму апантанымі.

Як гэта атрымалася падчас камандзіроўкі ў Клецкі раён, куды я паехала, каб на свае вочы пабачыць клуб, які «раманавалі, але не давялі да канца», і таму ён «пахарашэў толькі звонку, з вуліцы...».

Асобнага кабінета як такога ў загадчыцы Карацкай бібліятэкі-клуба Наталлі Крыцук няма. Ды ён ёй і непатрэбны: у вёсцы, дзе ўсе адно аднаго ведаюць, у «культурны цэнтр» заходзяць запраста: узяць кнігу ці часопіс, папрацаваць за камп'ютарам, прыняць удзел у рэпетыцыі гуртка, пацікавіцца праграмай дыскатэкі... Установа «складаецца» з дзвюх залаў — непасрэдна бібліятэчнай і танцавальнай. У танцавальнай (яна ж — канцэртная) пакуль што ціха: дзень на двары, людзі на працы. У бібліятэцы малыя з дзіцячага садка пад наглядам выхавальніцы рыхтуюцца да ранішніка.

Наталля Крыцук не без гонару дэманструе сваю «гаспадарку»:

— Не параўнаць з тым, што да рамонту было! Вы ж, пэўна, уяўляеце сабе тыповыя вясковыя клубы? А наш яшчэ ў 49-м годзе пабудавалі, практычна пасля вайны. Калі вёску Карацк пачалі ператвараць у аграгарадок, тут, у клубе, таксама перарабілі многае: сцены знутры абшылі гіпсакартонам, зманціравалі падвясную столь, замест старых вокнаў паставілі шклопакеты, замянілі дзверы, перасцялілі падлогу, памянялі ўсю электраправодку...

Пячное ацяпленне, як, зразумела, і самі печкі — адна ў чытальнай зале і дзве ў танцавальнай, — гэта, напэўна, адзіная «дэталь», якая выдае прыналежнасць Карацкай бібліятэкі-клуба да сельскай мясцовасці. Выглядаюць печкі на фоне падвясной столі, гіпсакартону і шклопакетаў, трэба сказаць, вельмі каларытна — як бабулі на сучасным вяселлі.

Пячное ацяпленне — рэч вельмі выгадная, асабліва калі ўлічыць, што да ўстаноў культуры, як і да ўсіх іншых, даводзяць план па эканоміі паліўных рэсурсаў. Печку не трэба ўвесь час трымаць у гарачым рэжыме, каб не дай Бог не размерзлася. І разам з тым, тэмпературу ў памяшканні можна рэгуляваць. Нарыхтоўкай паліва — на ўвесь ацяпляльны сезон бібліятэцы-клубу патрэбна каля 3 тон брыкету — займаецца раённы аддзел культуры. А самі печкі знаходзяцца на папячэнні тэхнічнага работніка клуба.

— Два гады таму, калі ў Карацку толькі пачыналася будаўніцтва аграгарадка, мы прыехалі сюды з падрадчыкам і абследавалі літаральна ўвесь будынак клуба, — кажа **начальнік аддзела культуры Клецкага райвыканкама Святлана ЧАЛЫК.** — Самі лазілі на дах, глядзелі яго пакрыццё... Калі грошай на рамонт адпушчана не так шмат і далёка не столькі, колькі хацелася б, здымаць цалкам нармальны шыфер, нехай сабе і не новы, не паднялася рука. Ды і немэтазгодна гэта было. Мы ўклалі сюды 46 мільёнаў рублёў — тое, што маглі дазволіць сабе ў крызісным 2009 годзе. Менш, безумоўна, чым у свой час у Янавіцкі ці Кухчыцкі дамы культуры. Але, па-першае, сам будынак тут невялікі, па-другое, нам вельмі хацелася яго захаваць. А гэта часам больш складана, чым будаваць новы.

Нягледзячы на тое, што моладзі ў вёсках становіцца ўсё менш, Карацкая бібліятэка-клуб нядрэнна спраўляецца з планам па аказанні насельніцтву платных паслуг. План з пункту гледжання гараджаніна не бог ведае які — 200 тысяч рублёў на месяц. Аднак, каб у сельскай мясцовасці іх зарабіць, трэба яшчэ добра пакруціцца. Білет на дыскатэку каштуе ўсяго 1 тысячу рублёў, і калі, скажам, за дзве дыскатэкі атрымліваецца зарабіць 60 тысяч, гэта ўжо добра... Пэўнай крыніцай даходаў стаў камп'ютар — за карыстанне інтэрнэтам з наведнікаў таксама бяруць невялікую плату...

Капейка да капейкі — атрымліваюцца рублі. Прычым, рублі вельмі патрэбныя, калі ўлічыць, што культура фінансуецца ўсё ж не ў такіх аб'ёмах, як медыцына ці адукацыя. У тым жа Карацкім клубе мікрафоны, калонкі, мікшарскі пульт, спецыяльнае святло — усё набыта за ўласныя сродкі.

І ўсё ж асноўным рухавіком для работнікаў культурнай нівы з'яўляецца не столькі жаданне зарабляць, колькі... здзіўляць. Здзіўляць, перш за ўсё, сваімі, мясцовымі, самабытнымі талентамі, выводзячы іх на сцэну ледзь ці не з дзіцячага ўзросту, прадстаўляючы кожнаму ахвотнаму магчымасці для творчага раскрыцця. А творчасць, як вядома, паняцце шматграннае. У Карацкім клубе, напрыклад, апрабавалі сваю шоу-праграму, якая называлася «Супермен-2010» — ні больш ні менш. На сцэну выйшлі трактарыст, вальшчык лесу, прадстаўнік раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях, работнік фермы — здавалася б, людзі, далёкія ад агульнапрынятых уяўленняў аб гламуры. Аднак яны ўдзельнічалі (пры поўнай зале!) у конкурсах і дэфіле, выконвалі музычныя нумары... Такое, думаю, запомніцца надоўга — і гледачам, і самім удзельнікам.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

АДКРЫТАЯ ДЫСКУСІЯ

НАЧЛЕГ ДЛЯ АЎТАМАБІЛЯ

Дэпутат Магілёўскага гарадскога Савета Вячаслаў ПАНЦЮХОЎ прапануе абмеркаваць арганізацыю міні-парковак для аўтамабіляў каля жылых дамоў.

Фота Ірыны САВОСІНАЙ.

Аўтамабілі ў паветры

— У мяне ёсць свая прапанова, — гаворыць старшыня дэпутацкай камісіі па жыллёва-камунальнай гаспадарцы, з якім мы адпраўляемся ў падарожжа па магілёўскіх мікрараёнах для агляду парковак. — Але я не буду настойваць, што гэта самае лепшае выйсце са становішча, і прапаную праз вашу газету аб'явіць дыскусію.

«Хундай» самога Вячаслава Панцюхова начуе каля дома, дзе ён жыве. Дэпутат смяецца, што яму проста пашанцавала: у невялікім доме жывуць людзі паважанага ўзросту, не ўсе яны маюць уласны транспарт, а таму ахвотнікаў паркаваць аўтамабілі літаральна пад сваімі вокнамі і каля пад'езда зусім няшмат. Але такая сітуацыя — хутчэй, выключэнне з правілаў у паўсядзённым жыцці жыхароў горада Магілёва.

— У сучаснага горада шмат праблем, — гаворыць Вячаслаў. — Адна з актуальных — гэта транспартныя развязкі і паркоўкі для транспарту. Дзе сёння чалавеку пакінуць аўтамабіль на ноч? На платнай стаянцы? Каля дома? Узляцець на ім у паветра? Можа, гэта сёння і не самая галоўная праблема для людзей, але яна такой будзе, калі цяпер нічога не рабіць для вырашэння. Колькасць аўтамабіляў павялічваецца імкліва і, каб не было калапсу, трэба зараз працаваць: цяпер меншай крывёю, за не такія вялікія грошы рабіць жыццё жыхароў горада больш камфортным. Пакуль гэта праблема нас не нагнала.

Стыхійныя «кішэні»

Вуліца Каралёва ў мікрараёне «Юбілейны». Вельмі вузкі праезд, каля старога жылога дома невялікая паркоўка максімум на пяць-шэсць месцаў. Яшчэ няма і 18 гадзін, а паміж дрэвамі па-за дарогай ужо «заціснутыя» аўтамабілі. Цяпер яны стаяць на ўтрамбаваным снезе, але ўвесну будзе добра відаць, што гэта — кавалак зялёнай дворавой тэрыторыі. Хоць незалежна ад сезона за такую паркоўку можна атрымаць значны штраф.

Што ў такой сітуацыі рабіць уладальнікам аўто? Безумоўна ж, ім усім раяць карыстацца паслугамі платных аўтастаянак. У цэнтры іх не хапае, але ў мікрараёнах платныя паркоўкі запоўненыя толькі напалову. Аднак адным аўтааматарам шкада грошай, іншым не хочацца марнаваць час на пешыя паходы і ўвогуле пазбаўляць сябе вадзіцельскага задавальнення — выйсці з дому, адразу сесці за руль і паехаць.

— Сёння няма законных спосабаў прымусіць людзей карыстацца паслугамі аўтастаянак, таму я прапаную арганізоўваць міні-паркоўкі каля жылых дамоў, — раскрывае сваю ідэю Вячаслаў Панцюхоў. — Я прапаную падчас рамонту дворавых тэрыторый «адразаць» кавалак зямлі ад зялёнай зоны і рабіць так званыя «кішэні» для аўтамабіляў. Можа, старыя людзі і будуць супраць перасадкі дрэў і адсоўвання лавак, але ж трэба думаць і пра маладыя сем'і, якія будуць тут жыць і абавязкова карыстацца аўтамабілем, а верагодна, яшчэ і не адным.

Стаянкі пад прымусам

Прапанова Вячаслава Панцюхова, які ўжо другое скліканне спрабуе прыцягнуць увагу калег-дэпутатаў да праблем аўтаўладальнікаў (і не толькі іх), з аднаго боку, здаецца лагічным вырашэннем на бліжэйшую перспектыву праблемы з паркоўкамі, а з другога, даволі спрэчнай ідэяй. Спрэчнай, таму што скарачэнне зялёных тэрыторый у жылых зонах нязменна выклікае супраціўленне гараджан, змучаных дрэннай гарадской экалогіяй. І ўрэшце: хто з нас захоча жыць у доме з відам на прыпаркаваныя аўтамабілі?

— Так, гэтае пытанне выклікае гарачыя дыскусіі не толькі сярод бабуль у дварах, але і сярод членаў нашай дэпутацкай камісіі, — пагаджаецца Панцюхоў. — Думкі падзяляюцца. Ёсць абсалютна розныя прапановы, кожная з якіх заслугоўвае ўвагі і асобнага разгляду.

Адна з самых папулярных: паркоўка каля дома павінна быць выключна гасцявой — літаральна на 5-6 месцаў, а ўладальнікаў трэба на законнай аснове прымусіць ставіць свае аўтамабілі на платныя стаянкі.

Яшчэ адзін варыянт — можна ладзіць стаянкі, як у некаторых еўрапейскіх краінах, за межамі вялікіх жылых масіваў, куды аўтаўладальнікам забяспечаны кругласутачны праезд на грамадскім транспарце.

Іншыя спадзяюцца на пабудову падземных паркінгаў, але абласному цэнтру да іх пакуль, як да Месяца». Падземныя гаражы ў нешматлікіх сучасных жылых дамах таксама не вельмі адрываюць з рукамі, таму што яны каштуюць вельмі нятанна.

Грошы лічыць рана

Гэты пералік, пагадзіцеся, пакідае няшмат надзей на бязвоблачнае існаванне аўтаўладальнікаў у будучыні. Больш за тое, ведаючы імкненне сучасных дзяцей сесці за руль аўтамабіляў як мага хутчэй, становіцца неяк трывожна. Таму што ўжо сёння практычна ў кожным магілёўскім дварэ ўвечары ідзе змаганне за парковачнае месца: такая таўкатня, што познія вандроўнікі могуць сапраўды хоць узлятаць!

На гэтым фоне здаюцца найбольш верагоднымі названыя два варыянты: альбо прымусам цягнуць на платныя стаянкі (хоць законнай падставы для такога прымусу няма, прынамсі пакуль), альбо, паводле прапановы Вячаслава Панцюхова, рабіць міні-паркоўкі у дварах, што дазволіць калі не вырашыць праблему кардынальна, дык хоць адсунуць яе на дзясятак-другі гадоў.

Дэпутат пакуль даволі цьмяна гаворыць пра грашовы падмурак сваёй прапановы: маўляў, што можна падлічваць, калі няма кансенсусу і невядома, які спосаб вырашэння праблемы выбраць і пакласці ў аснову гарадской праграмы?

Вячаслаў Панцюхоў прапануе цяпер хаця б уносіць разумныя карэктывы ў праекты рамонту двароў і добраўпарадкавання тэрыторый вакол новабудоўляў. А на гэта не патрэбны грошы.

Жыццё і будаўнічыя нормы

— Гэта мікрараён «Мір-2», дзе знаходзіцца мая выбарчая акруга, — працягвае экскурсію Вячаслаў Панцюхоў. — Як бачыце, аналагічная сітуацыя: аўтамабілі прыпаркаваныя ў імправізаваныя «кішэні» паміж дрэвамі і кустамі на заледзянелай зялёнай тэрыторыі. Але ёсць тут і дварысянайбуйнымрамонтам. Звярніце ўвагу: пад паркоўку адрэзаны кавалак двара, але на ім могуць змясціцца толькі 5-6 аўтамабіляў. І гэта на 60-кватэрны дом! Кропля ў моры. А куды падзецца астатнім? Чаму б не аддаць больш зямлі пад стаянку? Каму ад гэтага будзе горш? Тады людзі не будуць паркавацца стыхійна, супраць правілаў, і кідаць аўтамабілі пасярод праезду. А так у жыльцоў проста няма іншага выйсця!

Таму Вячаславу падаецца, што такія рамонты — справа неабачлівая, а калі яшчэ больш дакладна — гэта, у пэўным сэнсе, «закопванне грошай».

— Яскравы, на мой погляд, прыклад — гэта леташні рамонт на бульвары Няскораных, — дэпутат паказвае вуліцу ў мікрараёне «Задняпроўе». — Стаянкі-«кішэні» каля дарогі зробленыя толькі «ўрыўкамі», хоць тут месяцца вялікія крамы і паліклініка. Праўда, будаўнікі спасылаюцца на нормы: блізка каля дамоў не можа быць шмат парковак, але мне часам здаецца, што будаўнічыя нормы адстаюць ад рэальнага жыцця і сучасных патрэбаў жыхароў гарадоў.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ПРАКУРОР — АПОШНЯЯ НАДЗЕЯ?

Пракуратура горада Полацка задаволіла калектыўны зварот работнікаў мясцовага прадпрыемства ЖКГ. Праверкай было ўстаноўлена, што наймальнік, каб пазбегнуць выплат звольненым у сувязі са скарачэннем работнікам, прыняў рашэнне аб спыненні працоўных адносін... пасля сканчэння тэрміну кантрактаў. Людзі паскардзіліся. Па прадпісанні пракурора іх працоўныя правы былі адноўлены. Дарэчы, аналагічны зварот (пасля рашэння таго ж наймальніка) быў задаволены і летась.

Падчас прыёму грамадзян па месцы жыхарства да памочніка пракурора Расонскага раёна звярнуліся жыхары дома № 11 па вуліцы Леніна ў гарадскім пасёлку Расоны — са скаргай на тое, што ажно з восені мінулага года на месцы ўводу цеплавога вузла жылога дома праз няспраўны вентыль бесперабойна цячэ гарачая вада. А з перапоўненага каналізацыйнага калодзежа ля сцяны дома выцякаюць нечыстоты. Па гэтым факце (зразумела, пасля праверкі) дырэктару прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі было вынесена прадстаўленне аб выпраўленні ўказаных парушэнняў. Што і было зроблена аператыўна. Таксама па патрабаванні пракурора раёна за парушэнні быў аштрафаваны — на 105 тысяч рублёў — майстар цепласетак прадпрыемства ЖКГ.

Жыхар вёскі Вусце Аршанскага раёна таксама звярнуўся ў пракуратуру па дапамогу і паведаміў, што на працягу доўгага часу не праводзілася рамонту ў двух дамах (№ 6, № 7). Грамадзянін два разы (у мінулым годзе і сёлета) звяртаўся ў камунальную арганізацыю па гэтым пытанні і двойчы атрымліваў адказы... аб правядзенні рамонту. У лістах былі ўказаны нават тэрміны, але ж на самай справе дамы, як высветлілі ў пракуратуры, не рамантавалі. Дырэктару прадпрыемства далі прадпісанне аб устараненні выяўленых парушэнняў, а начальніка жыллёвага аддзела аштрафавалі.

А ўсяго, як паведаміў **пракурор Віцебскай вобласці Генадзь ДЫСКО**, у органы абласной пракуратуры сёлета звярнуліся каля 6,5 тысячы грамадзян — на 9,4 працэнта менш, чым летась.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ТЭМА ДНЯ

ЭФЕКТ ПРАМОГА ДЗЕЯННЯ

Амаль чатыры гады таму пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу быў створаны Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання. Галоўнай задачай новай структуры стала каардынацыя дзейнасці ўсіх мясцовых Саветаў дэпутатаў. (Нагадаем, што раней іх дзейнасць не была «замкнёная» на адной структуры рэспубліканскага ўзроўню, а ўзаемадзеянне заключалася ў тым, што больш высокія па «рангу» Саветы аказвалі арганізацыйна-метадычную і прававую дапамогу ніжэйшым.) Сёння Савет па ўзаемадзеянні ў адпаведнасці са сваім Палажэннем прадстаўляе інтарэсы менавіта органаў самакіравання — каардынуе іх дзейнасць, аказвае садзейнічанне на рэспубліканскім узроўні... Што гэта азначае на практыцы? Ці даходзяць рашэнні і прапановы Савета па ўзаемадзеянні да мясцовага ўзроўню — базавага і пярвічнага? Ці атрымліваецца з яго дапамогай вырашаць праблемы «мясцовага значэння»? З такімі пытаннямі мы звярнуліся да кіраўнікоў Саветаў дэпутатаў.

Мікалай КВЯТКЕВІЧ, старшыня Ашмянскага раённага Савета дэпутатаў:

— Каардынацыя працы мясцовых Саветаў цяпер сапраўды адчуваецца. Мне, напрыклад, імпануе, што Савет па ўзаемадзеянні — не «кабінетная» структура, многія яго рабочыя пасяджэнні адбываюцца з выездам на месца, у раёны, у невялікія сельсаветы. Гэта актывізуе, надае адказнасці, бо думаеш: а можа, у наступны раз прыедуць і да цябе?..

Падчас курсаў павышэння кваліфікацыі, якія арганізуе Інстытут дзяржаўнай службы пры Акадэміі кіравання і дзе мы перыядычна бываем, абавязкова праходзяць сустрэчы і з членамі Савета па ўзаемадзеянні. Хацелася б, каб гэтыя сустрэчы не абмяжоўваліся толькі тэорыяй. Думаю, многія мае калегі — старшыні раённых Саветаў — з цікавасцю паўдзельнічалі б і ў практычных семінарах, з выездам у раёны, паглядзелі б, як на месцах, у іншых рэгіёнах, вырашаюцца тыя ці іншыя пытанні... Скажам, у Віцебскай вобласці закупам малака ў насельніцтва займаюцца прыватныя прадпрымальнікі. Хацелася б больш падрабязна і з першых вуснаў даведацца, як арганізаваная гэтая праца. Або, напрыклад, праца камунальных унітарных прадпрыемстваў — КУПаў — там, дзе яны ёсць. Гэта было б карысна ў практычным плане.

Святлана ДАВАЛЬЦОВА, старшыня Міханавіцкага сельскага Савета дэпутатаў Мінскага раёна:

— Праца Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання — гэта вельмі цікава. У першую чаргу з пункту гледжання таго, як на ўзроўні гэтай структуры ўспрымаюцца нашы «болевыя кропкі», нашы спробы нешта прыўнесці ў вырашэнне мясцовых праблем. Савет працуе з намі не з пазіцыі «раздачы ўказанняў», а менавіта імкнучыся абараняць нашы інтарэсы — інтарэсы пярвічнага ўзроўню ўлады. Калі раней нас успрымалі выключна як выканаўцаў тых ці іншых указаў і пастаноў, а нашы праблемы мала каго хвалявалі, то сёння нас слухаюць, чуюць і спрабуюць нам дапамагчы. Больш за тое — заўважна скарачаецца час паміж агучваннем нашых пытанняў і іх вырашэннем на рэспубліканскім узроўні, падвядзеннем пад іх заканадаўчай асновы. І гэтыя заканадаўчыя нормы вельмі жыццёвыя, набліжаныя да рэальнасці. Савет па ўзаемадзеянні, на маю думку, — менавіта той «каталізатар», які дапамагае сумясціць тэорыю з практыкай на заканадаўчым узроўні.

Напрыклад, падчас аднаго з пасяджэнняў Савета па ўзаемадзеянні разглядалася вельмі актуальнае для нас пытанне ўпарадкавання справаводства, скарачэння «валу» папер. Спадзяюся, што ў хуткім часе, пасля паўсюднага ўкаранення аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы АІС «Мясцовыя Саветы дэпутатаў», гэты «вал», нарэшце, будзе спынены. Асабіста я бачу ў гэтым вялікую перспектыву. Нашу інфармацыю ўжо зможа апрацоўваць і аналізаваць кожны спецыяліст — і па «гарызанталі», і па «вертыкалі», прычым без нашага ўдзелу. А далей, узважыўшы наш патэнцыял, — падказваць нам (як і іншым сельсаветам), па якіх кірунках лепш развівацца, бо збоку гэта бачна лепш. Я не адмовілася б з цягам часу атрымаць такія падказкі ад Савета па ўзаемадзеянні. Гэта быў бы, так бы мовіць, крок «інвестыцыйны» ўклад у нашу дзейнасць, таму што ідэя — таксама інвестыцыя. Для нас, кіраўнікоў сельсаветаў, вельмі важна мець аб'ектыўнае ўяўленне аб магчымасцях сваёй тэрыторыі.

Сяргей КАЗЛЕНЯ, старшыня Дманаўскага сельскага Савета дэпутатаў Івацэвіцкага раёна:

— Рашэнні і рэкамендацыі Савета па ўзаемадзеянні мы атрымліваем рэгулярна. Вельмі важны кірунак працы гэтай структуры — вывучэнне, абагульненне і распаўсюджванне цікавых напрацовак, лепшага вопыту маіх калег у межах усёй рэспублікі.

За апошні час не толькі скрануліся з месца, але і практычна вырашыліся многія пытанні — дзякуючы менавіта зацікаўленасці Савета па ўзаемадзеянні ў канчатковым выніку, яго супрацоўніцтву з адпаведнымі міністэрствамі і ведамствамі. У першую чаргу гэта датычыцца перадачы вуліц і дарог сельскіх населеных пунктаў на баланс спецыялізаваных арганізацый, а таксама размежавання сферы адказнасці за вонкавае асвятленне. Раней і вуліцы, і асвятленне цалкам «віселі» на сельскіх Саветах, ствараючы масу праблем. Цяпер імі займаюцца адпаведныя спецыялізаваныя службы.

На гэты момант мяне як старшыню сельскага Савета хвалююць пытанні, што ўзнікаюць са зносам пустуючых дамоў. Здавалася б, ёсць Указ № 70, які рэгламентуе гэтую працэдуру, але... Калі ўласнік старога дома памёр, а спадчыннікам яго «дабро» і дарам непатрэбна, мы, мясцовая ўлада, павінны падаць заяву ў суд, каб ён перадаў нам гэты будынак ва ўласнасць. А потым зарэгістраваць дом у агенцтве па нерухомасці, аформіць пакет неабходных дакументаў, выдаткаваўшы на гэта грошы, якіх і так не хапае... Калі размова ідзе пра трывалыя будынкі, якія мы потым зможам прадаць — тут пытанняў няма. Але навошта сельвыканкаму плаціць грошы і афармляць на сябе развалюху, якую ніхто ніколі не купіць? Мне здаецца, трэба падумаць пра ўнясенні змяненняў у арганізацыю працы па ўліку пустуючых дамоў, каб мясцовыя бюджэты маглі пазбегнуць непатрэбных затрат.

Валянціна НАВАГРАН, старшыня Пышненскага сельскага Савета дэпутатаў Лепельскага раёна:

— Не можа не радаваць добра адладжаная апошнім часам праца па абслугоўванні вулічнага асвятлення — рамонт робяць раённыя электрасеткі, а сочаць за гэтым старэйшыны... Няма сёлета праблем і з абслугоўваннем дарог сельскіх населеных пунктаў. Усе дарогі мы перадалі на баланс ЖКГ, а яны, у сваю чаргу, заключылі дагавор з ДЭУ. І цяпер ніякіх пытанняў з расчысткай вуліц не ўзнікае, нягледзячы на снежную зіму.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Эфект прамога дзеяння

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Калі што — тэлефаную майстру ДЭУ, нават у выхадныя, і праз паўгадзіны тэхніка ўжо ў нас...

З чым па-ранейшаму ўзнікаюць пытанні — гэта з участковымі інспектарамі. Яны працуюць па сваім графіку і, на мой погляд, іх часта «адрываюць» ад выканання непасрэдных абавязкаў. Тым больш у нас адзін участковы на два сельсаветы, і жыве ён у Лепелі.

Анатоль ПЯЦЮШЫК, старшыня Чысценскага сельскага Савета дэпутатаў Маладзечанскага раёна:

— Хацелася б, каб Савет па ўзаемадзеянні і далей дапамагаў нам у вырашэнні самых злабадзённых пытанняў, як гэта адбылося з тым жа вулічным асвятленнем. Нарэшце ўсё стала на свае месцы! Цяпер стараста населенага пункта мне паведамляе: там ці там не гарыць ліхтар. Адразу даю заяўку дыспетчару раённых электрасетак, прыязджаюць электрыкі і мяняюць лямпачкі. А мы толькі аплачваем іх паслугі. У выніку кожны займаецца сваёй справай.

Няхай бы ўсе праблемы вырашаліся так эфектыўна... Узяць, напрыклад, той жа штатны расклад сельвыканкамаў. На мой погляд, тут павінна існаваць больш дакладная градацыя ў залежнасці ад колькасці насельніцтва, якое пражывае на тэрыторыі сельсавета. Ёсць сельсаветы, дзе жыве ўсяго 800 чалавек — там у штаце сельвыканкама працуе 3 работнікі. У нашым сельсавеце налічваецца каля 6 тысяч(!) насельніцтва — а штатны расклад у нас чамусьці такі ж самы...

Ала НАВУМЕНКА, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў:

— Самае галоўнае, што Савет па ўзаемадзеянні, створаны пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу, не адарваны ад жыцця рэгіёнаў. Ён не проста вывучае становішча спраў на месцах, а аналізуе і абагульняе праблемы, дапамагае выпрацаваць шляхі іх вырашэння.

Пасля пасяджэнняў Савета па ўзаемадзеянні ўсе мясцовыя Саветы дэпутатаў базавага ўзроўню атрымліваюць адпаведныя пратаколы. Там прапісаныя асноўныя, «вузлавыя» моманты дзейнасці мясцовых Саветаў (у тым ліку і сельскіх) на блізкую перспектыву. Арыентуючыся на іх, мы карэкціруем сваю працу. Гэта дае магчымасць увесь час знаходзіцца на хвалі самых актуальных пытанняў. Скажам, у апошнім пратаколе нам было рэкамендавана стварацьспрыяльныя ўмовы для развіцця прадпрымальніцтва ў сельскай мясцовасці, звяртаць самую пільную ўвагу на неабходнасць пашырэння аб'ёму і якасці паслуг, якія аказваюцца насельніцтву. Разам з сельскімі Саветамі мы прааналізавалі, што тут намі ўжо зроблена, а што яшчэ трэба зрабіць, каб выйсці на больш высокі ўзровень.

Так што, хоць у геаграфічным плане раён знаходзіцца, так бы мовіць, на «перыферыі», у рэальным жыцці мы гэтага не адчуваем. Нас падтрымліваюць, пра нас клапоцяцца, нас трымаюць у курсе ўсіх падзей... Дарэчы, я запрошаная на чарговае пасяджэнне Савета па ўзаемадзеянні, дзе змагу агучыць усе пытанні, якія хвалююць нашу тэрыторыю.

Наталля УЛАДЗІМІРАВА.

ВЯСКОВЫЯ ДАРОГІ

дачакаліся гаспадара

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

На тэрыторыі Вялікасельскага сельсавета 31 кіламетр дарог, і ўсе яны, паводле меркавання кіраўніка мясцовай улады, падтрымліваюцца ў прыстойным стане.

Зеляневіцкі сельсавет большы па тэрыторыі, аддалены ад райцэнтра, і праблем з абслугоўваннем дарог там значна больш. У склад сельсавета ўваходзяць 24 населеныя пункты, Абодва сельгаспрадпрыемствы, што працуюць на землях сельсавета, бяднейшыя за гаспадарку ў Старым Сяле. І разам з тым старшыня сельскага Савета **Антаніна ЛАГАЧ** адзначыла, што ў мінулым годзе яны таксама адчулі значную палёгку ў справе падтрымання ў належным стане дарог. Цяпер, паводле слоў Антаніны Васільеўны, хоць ніхто не скажа, што «гэта не маё» і не адмахнецца на трывожны сігнал з мясцовай улады, калі дарогу заносіць снегам. Таму на зімовы час разам з Ружанскім участкам ДРБУ кіраўніцтва сельсавета распрацавала ўмоўны графік расчысткі дарог. У першую чаргу чысцяцца тыя ўчасткі, па якіх ідзе рэйсавы аўтобус. Зранку прыводзяцца ў парадак дарогі ў тыя дні, калі ў вёску павінна ісці аўтакрама.

Больш таго, кажа старшыня сельскага Савета, прарывам у гэтай справе можна лічыць той факт, што наша дарожная арганізацыя апублікавала ў раённай газеце нумар тэлефона сваёй дыспетчарскай службы, па якім любы грамадзянін з самай аддаленай вёскі ці хутара можа дазвоніцца і пакінуць заяўку на расчыстку дарогі!

А вось з рамонтам і падсыпкай дарог, заўважыла Антаніна Лагач, сітуацыя больш складаная. Дарожная арганізацыя, як вядома, працуе ў аб'ёме выдзеленых грошай. І іх аддаленая мясцовасць, відаць, застаецца на больш познюю «чаргу». Ёсць і свае, спецыфічныя, праблемы, абумоўленыя, на думку старшыні, усё той жа аддаленасцю. Адзін участак дарогі даўжынёй у два кіламетры ў накірунку Гродзенскай вобласці каля вёскі Галоўчыцы так ніхто і не захацеў узяць на баланс. Фактычна дарога засталася нічыйнай, а па ёй таксама ездзяць людзі. Значыць, старшыні Савета трэба шукаць таго, хто будзе адказны і за гэту дарогу.

Старшыня Пружанскага раённага Савета дэпутатаў **Віктар МАКАРЭВІЧ** адзначае, што з перадачай сельскіх дарог на абслугоўванне спецыялізаванай дарожнай арганізацыі сітуацыя ў раёне мяняецца да лепшага. На адным з апошніх сходаў старастаў вёсак, якія штогод традыцыйна праводзяцца ў райцэнтры і пасёлках — у Пружанах, Ружанах і Шарашове — вясковыя актывісты сталі дзякаваць прадстаўнікам дарожнай службы. «Гэта наогул выпадак небывалы, — гаворыць Віктар Мікалаевіч. — Раней на такіх нарадах гучалі толькі скаргі, крытыка дрэнных дарог».

Паводле слоў кіраўніка раённай прадстаўнічай улады, не заўсёды ўдаецца здзейсніць запланаванае паляпшэнне дарог нават у межах выдзеленай сумы, бо жыццё ўносіць карэктывы. Напрыклад, гэтай вясной затапіла вёску Мураву, іншыя населеныя пункты. Гэта ў раёне, для якога падтапленні ў час паводкі наогул нехарактэрны! Але ж з прыродай не паспрачаешся. Сядзібы стаялі ў вадзе, людзям давялося тэрмінова дапамагаць, пракладваць трубы, рабіць дадатковыя насыпы. На гэта пайшла значная частка грошай, якія маглі б быць выкарыстаны на летні рамонт і добраўпарадкаванне вясковых вуліц.

Але ў цэлым даводзіцца канстатаваць, што ў вясковых дарог з'явіўся гаспадар, і гэта станоўчы факт, лічыць старшыня раённага Савета дэпутатаў.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Пружанскі раён.

ПАСЛЯ ВЫСТУПЛЕННЯ «МС»

А ШКОЛЬНЫ СТАДЫЁН БУДУЦЬ РЭКАНСТРУЯВАЦЬ

Упраўленнем жыллёва-камунальнай гаспадаркі Віцебскага аблвыканкама сумесна з Віцебскім гарвыканкамам пасля публікацыі ў «Звяздзе» артыкула «На Ямской ужо светла. А побач?» (ад 9 снежня 2010 года — **А.П.**) вывучаны факты, пра якія гаварылася ў артыкуле. Мяркуючы па чарговым афіцыйным адказе, на Ямской ужо даволі светла. Значыць, нездарма чытачы неаднаразова звярталіся па дапамогу ў рэдакцыю.

Нагадаю, што аб праблемах асвятлення вуліцы Ямской і суседніх старэйшая рэспубліканская газета летась пісала ажно тры разы (у нумарах за 9 снежня, 30 верасня і 17 чэрвеня 2010 г.).

Адказныя асобы вышэйпаралічаных інстанцый у выніку праверкі фактаў, выкладзеных у артыкуле, устанавілі, што знешняе асвятленне вуліцы Ямская цяпер нармальнае. А ўсё таму, што замянілі лямпы ў некалькіх свяцільніках і ўстанавілі дадатковыя ў раёне дома № 10. Праход з вуліцы да прыпынкаў грамадскага транспарту на вуліцы Горкага, на думку чыноўнікаў, мае дастатковае знешняе — больш за дзесяць апор — асвятленне. Замянілі і лямпачкі ў свяцільнях, устаноўленых на пад'ездах жылых дамоў №№ 59-а, 59-б, 61 па вуліцы Горкага.

Наконт узгаданых у артыкулах «Звязды» праблем асвятлення тэрыторыі ля сярэдняй школы № 23. Яна асвятляецца чатырма пражэктарамі, змацаванымі на фасадзе школы, і ліхтарамі на вуліцы Горкага. Што тычыцца праходу грамадзян да прыпынку грамадскага транспарту, праклдзенага праз тэрыторыю стадыёна школы, адказныя асобы, якія вывучалі сітуацыю, адзначаюць, што ўзнік праход стыхійна, таму і няма неабходнасці яго асвятляць... У афіцыйным адказе, між іншым, гаворыцца пра тое, што агароджа тэрыторыі стадыёна школы разбураецца прахожымі і выкарыстоўваецца для скарачэння шляху.

Прыемна, што згодна з праграмай развіцця фізічнай культуры, спорту і турызму Першамайскага раёна Віцебска на 2011—2015 гады прадугледжваецца рэканструкцыя школьнага стадыёна. Праўда, пачатак яе намечаны толькі на будучы год. Нягледзячы на гэта, віцебскаму гарадскому прадпрыемству ЖКГ даручана ўзяць пад кантроль утрыманне існуючага добраўпарадкаванага праходу на прыпынак грамадскага транспарту і з вуліцы Ямская і агароджванне тэрыторыі стадыёна да пачатку яго рэканструкцыі.

Быццам бы многае зроблена. Але ж... На жаль, у афіцыйным рэагаванні ні слова пра тое, чаму ж доўгі час не было афіцыйнага адказу ад прадстаўнікоў камунальнай гаспадаркі? Вясной мінулага года аўтар атрымаў ліст з гарвыканкама з адказам пра тое, што зварот быў накіраваны на разгляд у адпаведнасці з кампетэнцыяй. Далейшы лёс таго ліста для мяне застаўся невядомым.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ШТО ЗА ФАСАДАМ СЕЛЬСКАГА КЛУБА?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Таму не здзівілася, пачуўшы ад Наталлі Крыцук:

— Іншай працы я сабе не ўяўляю.

Па вялікім рахунку, яе задача — стварацьлюдзям настрой. Выдаваць кнігі, весці гурткі па інтарэсах, ладзіць святочныя канцэрты і танцавальныя вечарыны... Ну і ўвогуле — «сеяць» культурнае, добрае, вечнае...

За апошні час, кажа Святлана Чалык, дзякуючы рэалізацыі дзяржаўнай праграмы адраджэння вёскі, сельскія ўстановы культуры ў Клецкім раёне атрымалі другое дыханне.

— Сёння, наведваючы калег, усё часцей думаю: дык і ў нашых установах не горш! Ніхто не мерзне, ніводны дах не цячэ, у сельскіх дамах культуры такія рамонты парабілі, што цяпер раённы ДК трэба да іх узроўню падцягваць! У Янавічах адна толькі замена даху каштавала 320 мільёнаў рублёў, а ўвесь рамонт установы — 870 мільёнаў, у Кухчыцах новая сістэма ацяплення ДК пацягнула на 100 мільёнаў... У Сікерычах, Морачы, Зубках ва ўстановы культуры ўкладзены сотні мільёнаў. Зразумела, год на год не выпадаў, фінансавая сітуацыя была часам няпростай, асабліва ў пазамінулым, 2009 годзе... Але мы «падцягнулі» ўсе да адной сельскія ўстановы культуры, прычым у рамонтных работах удзельнічалі самі, не зважаючы на «рангі». Укладвалі і сілы, і душу. Цяпер ужо ніхто не скажа, што «культура знаходзіцца на задворках».

Дом культуры ў Янавічах, куды мы таксама заехалі, нагадвае хутчэй палац. Двухузроўневы дах з металачарапіцы, новыя вокны. Сучасная танцавальная зала, дзе праходзяць самыя папулярныя ў раёне дыскатэкі (сюды прыязджае моладзь не толькі з Клецка, а нават са Слуцка і Нясвіжа).

— Бачыце, якія крэслы? Такія ёсць толькі ў раённым ДК і ў Кухчыцах, — дырэктар Янавіцкага Дома культуры Мікалай Пуляк водзіць нас па сваёй установе, як па залах Эрмітажа. — Падлогу ў глядацкай зале мы замянілі цалкам, а таксама сцены і столь. Толькі люстры ранейшыя пакінулі. Адна такая люстра каштавала ў свой час, як аўтамабіль «Масквіч»!

Люстры і сапраўды выбітныя — такія не кожны дзень убачыш. У кабінет дырэктара (як, дарэчы, і ў іншыя) не горшая завесці і самую патрабавальную дэлегацыю. Нават не верыцца, што большая частка ўнутраных работ — вынік працы самога калектыву, а таксама калег з іншых устаноў культуры. Самі «клалі» столь, клеілі шпалеры, шпаклявалі падлогу... Мікалай Андрэевіч ведае тут кожны вінцік — у прамым і пераносным сэнсе...

Янавіцкі Дом культуры заўсёды спакойна выконвае свой план платных паслуг. А план не маленькі — 12 мільёнаў рублёў на год. Тут жа працуе і вядомы народны калектыў «Весялуха» — ансамбль музыкі і спеваў.

— Сёння мы менш чым адзін мільён за свой канцэрт не бяром, — усміхаецца Мікалай Пуляк. — А бывае, што спачатку дагаворваемся з заказчыкамі на мільён, а пасля канцэрта нам плацяць паўтара — так падабаецца праграма! Але для гэтага трэба спачатку пастарацца.

«Сваё» ў Клецкім раёне ўвогуле ў пашане — і тая ж «Весялуха», і раённы духавы аркестр з мажарэткамі, і Морацкі народны хор... На 32 тысячы насельніцтва — аж 15 народных калектываў! Кажуць, на канцэрт «сваіх», калі такі праходзіць у раённым Доме культуры, білетаў не дастаць — разбіраюцца імгненна, няхай сабе і коштам па 10 тысяч. Задавальненне, якое атрымліваеш ад сапраўднага мастацтва, ад працы ўлюбёных у творчасць людзей, у разы даражэй...

Наталля КАРПЕНКА,

Клецкі раён.

НАЧЛЕГ ДЛЯ АЎТАМАБІЛЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Адна паркоўка на кватэру

— Але найбольш крыўдна, калі новыя забудовы ў Магілёве заведама праектуюцца з праблемамі, — наступны прыпынак мы робім у цэнтры горада, **каля групы новых прэстыжных дамоў ля гасцініцы «Магілёў».**

На невялікім участку зямлі (яна ў цэнтры, зразумела, дарагая і ў дэфіцыце) месціцца некалькі вышынных будынкаў. Невялікая пляцоўка каля аднаго з іх перакрытая шлагбаумам, каля астатніх ёсць невялікія паркоўкі для аўтамабіляў.

Цесна, асабліва калі ўлічыць, што далёка не ва ўсіх кватэрах пасяліліся гаспадары. Ды і людзі тут жывуць нябедныя, так што ў іх, верагодна, будзе і некалькі аўтамабіляў на сям'ю. Спадзяванні на суседнюю з гасцініцай стаянку марныя: кажуць, яна запоўнена да краю. І гэта праблема не толькі канкрэтнага раёна, але і іншых новабудоўляў.

— Я б настойваў на тым, каб у новых забудовах закладвалі як мінімум адно парковачнае месца для аўтамабіля на кожную кватэру, — гаворыць Вячаслаў Панцюхоў. — Але архітэктары зноў жа спасылаюцца на іншыя, больш сціплыя нормы, і сітуацыя, мне здаецца, паступова заходзіць у тупік.

Давайце абмяркуем

Час бяжыць, нічога не мяняецца. Дэпутат мяркуе, што ў арганізацыі міні-пакровак каля жылых дамоў маглі б прымаць пасільны ўдзел і самі жыхары, якія з'яўляюцца аўтааматарамі. Да гарадскога бюджэту трэба падыходзіць эканомна, грошай на ўсё не хапае, і наўрад ці ў наш пасткрызісны час за кошт дзяржавы будуць вырашацца праблемы ўладальнікаў асабістых транспартных сродкаў.

Традыцыйна мяркуецца: калі ў цябе ёсць грошы на аўтамабіль, то павінны быць сродкі на бензін, рамонт, а таксама аплату стаянкі. Сцвярджэнне спрэчнае, але тым не менш папулярнае ў грамадстве. Што ж, вельмі верагодна, што ахвотнікі пакідаць на ноч аўтамабілі каля дома пайшлі б і на новыя выдаткі — дзеля спакою і камфортнай паркоўкі.

— Але горш за ўсё тое, што **вырашаць праблему з паркоўкамі трэба было ўжо ўчора, а не сёння,** — кажа дэпутат Магілёўскага гарадскога Савета Вячаслаў Панцюхоў. — Пакуль жа ў нас нават у гарадской дэпутацкай камісіі няма на гэты конт адзінага выпрацаванага рашэння — якім чынам гэта рабіць? Я не прэтэндую на ісціну ў апошняй інстанцыі. Давайце разам з вашымі чытачамі абмяркуем гэта. Можа, у спрэчцы знойдзецца новая крэатыўная ідэя, пра якую мы і не падумалі?

Ілона ІВАНОВА.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

Многоквартирные жилые дома на месте сносимого гаража по ул. Сурганова в составе: жилой дом № 1 (по генплану), жилой дом № 2 (по генплану), подземный гараж-стоянка № 3 (по генплану) и реконструкция жилого дома № 5 по ул. Сурганова

Застройщик – Совместное общество с ограниченной ответственностью «Арэса-Сервис ТС» зарегистрировано решением Минского горисполкома от 23 июня 2003 года № 968 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 800007976. Юридический (почтовый адрес): **220113, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Логойский тракт, д. 15, к. 4, каб. 514.**

Режим работы по вопросам долевого строительства: пн.–пт. – 8.00 – 20.00.

Ранее реализованные проекты (в течение трех предшествующих лет) – «Многоуровневый гараж-стоянка с пристроенным административно-бытовым корпусом и модернизация существующего здания гаража в части замены технологического оборудования по ул. Богдановича – Некрасова».

Информация о проекте строительства.

Цель строительства объекта – осуществление инвестиционного проекта согласно договору от 19 января 2009 года с Минским горисполкомом на реализацию права проектирования и строительства многоквартирных жилых домов на месте сносимого гаража по ул. Сурганова в составе: жилой дом № 1 (по генплану), жилой дом № 2 (по генплану), подземный гараж-стоянка № 3 (по генплану) и реконструкция жилого дома № 5 по ул. Сурганова.

Объект долевого строительства – многоквартирные жилые дома на месте сносимого гаража по ул. Сурганова в составе: жилой дом № 1 (по генплану), жилой дом № 2 (по генплану), подземный гараж-стоянка № 3 (по генплану) и реконструкция жилого дома № 5 по ул. Сурганова. Строительство объекта предусматривается поэтапно:

- 1-я очередь – жилой дом № 2 (по генплану);
- 2-я очередь – жилой дом № 1 (по генплану);
- 3-я очередь – подземный гараж-стоянка № 3 (по генплану).

Нормативная продолжительность строительства жилого дома № 1 (по генплану) – 26,5 мес., ввод в эксплуатацию – IV квартал 2011 года.

Нормативная продолжительность строительства жилого дома № 2 (по генплану) – 18 мес., ввод в эксплуатацию – II квартал 2011 года.

Нормативная продолжительность строительства подземного гаража-стоянки № 3 (по генплану) – 10,5 мес., ввод в эксплуатацию – I квартал 2012 года.

Застройщиком получены:

- акт от 3 августа 2004 года о выборе земельного участка, утвержденный решением Мингорисполкома от 30 марта 2006 года № 524;
- акт от 27 ноября 2007 года выбора места размещения дополнительного земельного участка, утвержденный решением Мингорисполкома от 7 февраля 2008 года № 207;
- решение Мингорисполкома от 25 июня 2009 года № 1488 об изъятии, предоставлении земельных участков, разрешении строительства и внесении изменения в решения горисполкома;
- свидетельство (удостоверение) № 500/726-4751 от 15 сентября 2009 года о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права временного пользования на него площадью 1,3841 га;
- разрешение инспекции Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску № 2-207Ж-037/09 от 31.08.2009;
- заключение ДРУП «ГОССТРОЙ-ЭКСПЕРТИЗА по г. Минску» № 0995-8-2009 от 14 июля 2009 года;
- договор генерального подряда с СМ ЗАО «Ареса-Сервис-СТРОЙ» № 92/09 от 3 августа 2009 года.

Жилые дома не повышенной комфортности с подземным гаражом-стоянкой и встроенными помещениями расположены в Первомайском районе в квартале сложившейся застройки между улицами Сурганова и Академической, напротив Ботанического сада.

Конструктивная схема зданий – рамно-связевый монолитный железобетонный каркас с переменной сеткой колонн. Наружная и внутренняя отделка решена на основе применения современных отделочных материалов и конструкций.

Жилой дом № 1 (по генплану) – 19-этажный односекционный с техподпольем, теплым чердаком и незадымляемой лестничной клеткой, лифтами грузоподъемностью 630 кг и 1000 кг. В квартирах предусмотрена возможность установки электрических плит, остекление лоджий. Предусмотрено устройство эркеров и французских балконов.

На первом этаже предусмотрены административные помещения.

Площадь жилого дома – 11610 м², общая площадь квартир – 9255,2 м², общая площадь встроенных помещений – 459,2 м². Всего квартир – 108, в том числе однокомнатных – 31, двухкомнатных – 67, трехкомнатных – 18, четырехкомнатных – 4.

Жилой дом № 2 (по генплану) – 19-этажный односекционный с подвалом, теплым чердаком и незадымляемой лестничной клеткой, лифтами грузоподъемностью 630 кг и 1000 кг. В квартирах предусмотрена возможность установки электрических плит, остекление лоджий.

Предусмотрено устройство эркеров и французских балконов.

Площадь жилого дома – 11714,3 м², общая площадь квартир – 9514,9 м². Всего квартир – 120, в том числе однокомнатных – 41, двухкомнатных – 69, трехкомнатных – 15, четырехкомнатных – 4.

Подземный гараж-стоянка № 3 (по генплану) – одноуровневый, размещается под дворовым пространством жилых домов. Общая площадь – 4835,3 м². Количество машино-мест – 108.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются административные помещения общей площадью 158.81 м² в жилом доме № 1 (по генплану).

Цена 1 м² жилых помещений (стоимость строительства плюс рентабельность 5-30 %) составляет от 5 128 900 до 5 732 300 белорусских рублей (что эквивалентно от 1700 до 1900 долларов США на момент опубликования проектной декларации) в зависимости от условий оплаты. Цена неизменная.

Сведения о благоустройстве: устройство проездов, тротуаров, детских площадок и площадок отдыха, озеленение, установка малых архитектурных форм, устройство газонов и парковок.

Общее имущество, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию зданий.

Ознакомление дольщиков с объектами долевого строительства, предлагаемыми для заключения договоров создания объектов долевого строительства, осуществляется в офисе СООО «Арэса-Сервис ТС» по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Логойский тракт, д. 15, к. 4; тел.: 8 (017) 288 34 06; 8 (017) 269 31 00, +375 29 648 34 06. Режим работы по вопросам долевого строительства: пн.–пт. – 8.00 – 20.00. С ходом строительства объекта долевого строительства можно ознакомиться по согласованию с застройщиком.

ХОЗЯЙСТВЕННЫЙ СУД ГОРОДА МИНСКА

ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО СООО «СТОЛИЧНЫЙ ЦЕНТР»

Лот № 1. Изолированное помещение с инвентарным № 500/D-684046 (помещение неустановленного назначения) общей площадью 26,4 кв. м, 1968 года постройки, стоимость — 57 811 200 (пятьдесят семь миллионов восемьсот одиннадцать тысяч двести) белорусских рублей, расположенное по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, дом № 56, помещение № 6. Стоимость указана с учетом НДС.

Лот № 2 Изолированное помещение с инвентарным № 500/D-70772992 (назначение — административное помещение), общей площадью 18,9 кв. м, 1946 года постройки, 2008 года реконструкции, стоимость — 140 914 800 (сто сорок миллионов девятьсот четырнадцать тысяч восемьсот) белорусских рублей, расположенное по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, дом № 58, помещение № 141. Стоимость указана с учетом НДС.

Лот № 3. Изолированное помещение с инвентарным № 500/D-682478 (назначение — производственное помещение галереи второго этажа) общей площадью 155,1 кв. м, 1968 года постройки, стоимость — 299 895 600 (двести девяносто девять миллионов восемьсот девяносто пять тысяч шестьсот) белорусских рублей, расположенное по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, дом № 58, помещение № 22. Стоимость указана с учетом НДС.

Лот № 4. Изолированное помещение с инвентарным № 500/D-682477 (помещение неустановленного назначения) общей площадью 52,5 кв. м, 1946 года постройки, 2008 года реконструкции, стоимость — 112 009 200 (сто двенадцать миллионов девять тысяч двести) белорусских рублей, расположенное по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, дом № 58, помещение № 21. Стоимость указана с учетом НДС.

Лот № 5. Изолированное помещение с инвентарным № 500/D-682479 (назначение — складское помещение на первом этаже) общей площадью 23,5 кв. м, 1968 года постройки, стоимость — 50 584 800 (пятьдесят миллионов пятьсот восемьдесят четыре тысячи восемьсот) белорусских рублей, расположенное по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, дом № 58, помещение № 23. Стоимость указана с учетом НДС.

Торги состоятся 15.02.2011 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Академическая, 15/1, каб. 201.

За дополнительной информацией обращаться: http://minsk.court.by/

судебный исполнитель Кацуба Н.В., тел./факс 294 93 79, м.т. 8 029 177 32 83; ст. судебный исполнитель Вярьвильский Д.А., тел 294 93 67.

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет хозяйственного суда города Минска № 3642900000072 в ОАО «АСБ Беларусбанк», Минск, код 795, УНП 101541763 не позднее чем за 24 часа до начала проведения торгов.

Минимальная величина первого шага составляет 5 % стомости имущества.

Лот № 1 в размере 2 890 560 белорусских рублей.
Лот № 2 в размере 7 045 740 белорусских рублей.
Лот № 3 в размере 14 994 780 белорусских рублей.
Лот № 4 в размере 5 600 460 белорусских рублей.
Лот № 5 в размере 2 529 240 белорусских рублей.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»

Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.

Адказная за выпуск Наталля КАРПЕНКА.

Грамадскі савет: **НАВІЦКІ Г.В.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **БАЙКОЎ В.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **СЦЕПАНЕНКА А.М.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні арганаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **ПРЭДКА С.У.**, старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці; **МАКСІМЕНКА С.А.**, старшыня Азярыцка-Слабадскога сельскага Савета дэпутатаў.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 21 03;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 33.380. Нумар падпісаны ў 19.30.